III. 271.509

БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІЯ НАВУК
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

928.11

К. І. КЕРНАЖЫЦКІ

# ДА ГІСТОРЫІ АГРАРНАГА РУХУ НА БЕЛАРУСІ

## ПЕРЕД ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНОЙ

МЕНСК—1932

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

К. І. КЕРНАЖЫЦКІ

# ДА ГІСТОРЫІ АГРАРНАГА РУХУ НА БЕЛАРУСІ ПЕРАД ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНОЙ

МЕНСК — 1932

BIBLIOTEKA NARODOWA
III.271.509
8575/BN

# ПРАДМОВА

Праца, якая прапануецца ўвазе чытача, ёсьць крыху пашыраны даклад, які быў зачытаны мной у Інстытуце гісторыі БАН у лістападзе 1930 году. Гэтую працу трэба разглядаць як першы эскізны накід. Па данаму пытаньню матар'ял яшчэ толькі зьбіраецца, але матар'ял, паданы ў працы, зьяўляецца настолькі цікавым і актуальным, што аўтар рашаецца даную працу надрукаваць. Цэлы рад пытаньняў, якія мусілі атрымаць асьвятленьне, не разгледжаны так, як гэтага хацелася-б самому аўтару, але, бязумоўна, праца пралівае яскравае сьвятло на нарастаньне аграрнае рэволюцыі на Беларусі. Аўтар зварочваецца да ўсіх організацый і прыватных асоб, якія маюць матар'ялы або ведаюць, дзе яны захоўваюцца, з просьбай паведаміць Інстытут гісторыі БАН, падзяліцца сваімі ўспамінамі, — удзельнікаў аграрнага руху на Беларусі. Бо толькі агульнымі колектыўнымі сіламі можна выканаць гэтую вялізную задачу.

*К. К.*

*15 жніўня 1931 г.*

---

# УВОДЗІНЫ

Пастаўленая тэма зьяўляецца вельмі цікавай, актуальнай і ў той-жа час вельмі складанай.

Перш мною зьбіраўся матар'ял для аднаго з разьдзелаў рыхтаванай працы—Сталыпінская рэформа ў б. Магілеўскай губ., але з прычыны вельмі цікавага новага і паважнага матар'ялу прышлося крыху разьдзьвінуць рамкі дасьледваньня і прадпаслаць патрэбныя ўводзіны.

Зразумела, што мы ня зьбіраемся даць поўны агляд і малюнак аграрнага руху на Беларусі. Бо ўвесь вялізарны матар'ял ня толькі не сабраны, але нават і невядома дзе ён і што ў нас маецца (на вялікі сорам архіўных установ і архіўных працаўнікоў). Між тым, яшчэ В. Г. Кнорын у артыкуле „Очаркі аграрнай рэволюцыі на Беларусі" пісаў:

„Нашы навучальна-дасьледчыя організацыі павінны паставіць аднэй з сваіх важнейшых задач—збор матар'ялаў па гісторыі сялянскага паўстаньня і аграрнай рэволюцыі, без вывучэньня якіх ня можа быць зразумелай гісторыя Кастрычніка. Без вывучэньня гісторыі сялянскага паўстаньня і аграрнай рэволюцыі таксама ня можа быць напісана гісторыя бальшавізму на Беларусі, ня можа быць зразумелы політычны саюз рэволюцыйнага пролетарыяту і сялянства супроць абшарнікаў і той выключны ўплыў, якім бальшавікі карысталіся ў кастрычнікаўскія дні і карыстаюцца да гэтай пары ў шырокіх сялянскіх масах"[1].

Я думаю, што ў гэтых словах выяўлена ўсё значэньне вывучэньня аграрнай рэволюцыі на Беларусі, і трэба сказаць, што мы ня можам пахваліцца вывучэньнем гэтае проблемы, нават нічога і ня зроблена па збору матар'ялу закранутай эпохі.

Мною толькі распачаты збор матар'ялаў па аграрнаму руху пасьля рэволюцыі 1905 году і да вайны 1914 г., але і той матар'ял, які маецца на сёньнешні дзень, ускрывае ўпартую і рашучую барацьбу з аднаго боку сялянства з памешчыкамі, і з другога боку ў самім сялянстве кіпіць жорсткая клясавая барацьба з кулацтвам, якое эксплёатавала беднату і рабавала вёску. Жорсткая клясавая барацьба кіпела між шматлікім сельскагаспадарчым пролетарыятам з аднаго боку, памешчыкамі і вясковай буржуазіяй—з другога. Гэтая апошняя барацьба па сваім задачам і мэтам зьліваецца з барацьбой рабочае клясы. Процэс капіталізацыі маёнтку праходзіў у шматлікіх супярэчнасьцях, як і наогул разьвіцьцё капіталізму. Ня толькі рэформа 1861 году экспропрыявала сялянства, захапіўшы частку сялянскіх зямель (адрэзкі), але гэтая экспропрыяцыя ішла і ўзмацнялася далей, нарастаючая вясковая буржуазія зьявілася новым конкурэнтам памешчыку ў грабяжы сялянства. Упартая барацьба, якая кіпела на вёсцы, ускрывала, што нарадзіліся новыя сілы на вёсцы, якім цесна было ў шкарлупе старых паўфэўдальных адносін.

[1] Бальшавік Беларусі, № 10, 1927 г.

Трэба было, зьнішчыць усякія рэшткі фэўдалізму, гэта можна было зрабіць сялянству пад кіраўніцтвам рабочае клясы. У. І. Ленін бліскуча ўскрыў і паказаў, у чым заключаецца сутнасьць аграрнае проблемы ў былой Расіі, колёніяй якой у разгляданы час была і Беларусь.

Ленін шмат займаўся аграрным пытаньнем і пакінуў нам ясны і дакладны аналіз яго. Але ў нашы мэты не ўваходзіць агульны разгляд данага пытаньня, мы спынімся на выказваньнях Леніна перад самай імпэрыялістычнай вайной.

У. І. Ленін у 1914 годзе пісаў:

„У чым-жа экономічная сутнасьць зямельнага пытаньня ў Расіі? У буржуазна-дэмократычным прэабразаваньні Расіі. Расія зрабілася капіталістычнай, буржуазнай краінай. А земляўладаньне ў нас засталося яшчэ ў вельмі вялікай ступені прыгоньніцкім як памешчыцкае, так і надзельнае сялянскае.

Чым больш адстала ў сваім прыгоньніцтве вясковая Русь ад прамысловай, гандлёвай, капіталістычнай, тым кручэй павінна быць няўхільная ломка старога прыгоньніцкага і памешчыцкага і надзельнага земляўладаньня. Памешчыкі стараліся правесьці гэтую ломку папамешчыцку, у памешчыцкіх інтарэсах, захоўваючы ўсё сваё земляўладаньне, дапамагаючы кулаком насьпех абезьзямеліць сялян. Сяляне ў сваёй большасьці стараліся павесьці гэтую ломку па-сялянску, у сялянскіх інтарэсах“ [1].

Выказаную тут думку У. І. Ленін заўжды паўтарае і ня раз яе падкрэсьлівае і ў спрэчках і ў розных сваіх артыкулах. Асабліва цікавымі зьяўляюцца выказваньні Леніна ў лісьце да Сьцяпанава-Скварцова:

„Буржуазнае разьвіцьцё Расіі к 1905 году было ўжо ўпаўне сьпелае для таго, каб патрабаваць неабходнай ломкі ўстарэўшай надбудовы—устарэўшага сярэднявечнага земляўладаньня. (Вы, канечна, разумееце, чаму я тут з *усёй* надбудовы бяру адно земляўладаньне). Мы жывем у эпоху *гэтай* ломкі, якую розныя клясы *буржуазнае* Расіі *стараюцца* давяршыць, дарабіць па-свойму: сяляне (+рабочыя) шляхам нацыяналізацыі... Нацыяналізацыя зямлі — сялянская ломка старога земляўладаньня—ёсьць экономічная аснова амэрыканскага шляху. Закон 9 лістапада 1906 году—памешчыцкая ломка старога земляўладаньня—ёсьць экономічная аснова прускага шляху. Наша эпоха, 1905—?? гады, ёсьць эпоха рэволюцыйнай і контррэволюцыйнай барацьбы *гэтых* шляхоў“ [2]. (Курсыў Леніна—К. К.).

Такім чынам буржуазнае разьвіцьцё было ўжо цалкам сьпела. Перамагчы царызм, памешчыка магчыма было толькі пролетарыяту, як гегемону рэволюцыі, у саюзе з шырокімі масамі сялянства. Аграрнае пытаньне, як асноўнае пытаньне буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі, магло быць вырашана на карысьць сялянства толькі пад кіраўніцтвам пролетарыяту. Узяўшы ўладу ў свае рукі, пролетарыят не застанавіўся-б на паўдарозе. У. І. Ленін казаў:

„Ад рэволюцыі дэмократычнай мы зараз-жа пачнем пераходзіць і якраз у меру нашай сілы, сілы сьвядомага і організаванага пролетарыяту, пачнем пераходзіць да социялістычнай рэволюцыі. Мы ня спынімся на паўдарозе“ [3] Рэволюцыя была толькі часова пераможана, і рэволюцыйны рух зноў нарастае, зноў закіпаюць клясавыя бойкі. І тут толькі можна прывесьці словы Леніна з таго-ж ліста:

[1] У. І. Ленін, т. XVII, стар. 516.
[2] У. І. Ленін, т. XX, ч. I, Выд. 1, стар. 316.
[3] Ленін У. І., т. VIII, выд. 3, стар. 186.

„У нас яшчэ ідзе барацьба, яшчэ не перамог адзін з двух аграрных шляхоў“ [1].

У сьвятле гэтых поглядаў бязумоўча няправільнымі выступаюць погляды некаторых дасьледчыкаў, напрыклад, Дуброўскага і інш., якія бачылі крыніцу аграрнага крызісу ў крызісе экстэнсыўнае сялянскае гаспадаркі. Крызіс быў больш глыбокі, супярэчнасьці больш вострыя.

Рэволюцыя 1905 году ўскрыла ўсю сілу насьпеўшых супярэчнасьцяў між прыгоньніцтвам, якое жыло і ставіла тысячу рагатак гістарычнаму разьвіцьцю і разьвіўшыміся капіталістычнымі адносінамі. Рэволюцыя паказала, што вытворчыя сілы зайшлі ў тупік і масавы рэволюцыйны ўзрыў адчыніў вочы нават чорнасоценным зубром, тыпу Пурышкевіча і Бобрынскага,—што трэба „спасаць“ становішча. Рэволюцыя і ўскрыла ўсю глыбіню супярэчнасьцяў між рознымі клясамі. Характарнейшая адзнака першай рэволюцыі заключалася ў тым, што ў рамках прыгоньніцкай дзяржавы разьвілася значная капіталістычная індустрыя, вырас пролетарыят, магільшчык буржуазіі. Разьвіцьцё буржуазных адносін і супярэчнасьцяў, уласьцівых капіталістычнаму спосабу вытворчасьці, зайшло вельмі далёка. Пролетарыят змагаўся за ўладу, быў гегемонам у рэволюцыі 1905 г., вёў шырокія масы на штурм царызму.

Пролетарыят, які быў гегемонам у рэволюцыю 1905 году, выступленьні сялянства, — „ілюмінацыя“ палаўшых абшарніцкіх маёнткаў напалохалі ня толькі памешчыкаў, але і буржуазію, інтарэсы якой і акрамя таго былі пераплецены з інтарэсамі старых прыгоншчыкаў, і буржуазія кінулася ў абоймы контррэволюцыі і царызму. Ленін прадбачыў гэтае становішча, і далейшыя падзеі толькі пацьвердзілі прогноз Леніна аб контррэволюцыйнасьці рускай буржуазіі. Конкрэтная гістарычная сытуацыя, перастаноўка клясавых сіл пасьля 1905 г. вызначалі політыку царызму наогул і ў прыватнасьці яе аграрную частку. Гэты паварот політыкі самаўладзтва так ацэньваўся Леніным:

„Перамога аграрнай політыкі самадзяржаўя мае надзвычайна вялікае значэньне для „сялянскай“ краіны, як Расія. Гэта перамена не выпадковасьць, ня хістаньне курсу міністэрства, ня выдумка бюрократыі... Не, гэта самы глыбокі „зрух“ у бок аграрнага бонапартызму, у бок лібэральнай (у экономічным сэнсе слова, г. зн.—буржуазнай) політыкі ў галіне сялянскіх пазямельных адносін... І аграрны бонапартызм Сталыпіна, упаўне сьвядома і няўхільна цьвёрда падтрымліваемы ў гэтым пункце і чорнасоценьнікамі памешчыкамі і акцябрысцкай буржуазіяй, ня мог-бы нават нарадзіцца, а ня толькі пратрымацца вось ужо два гады, калі-б сама абшчына ў Расіі не разьвівалася па-капіталістычнаму, калі-б унутры абшчыны не складалася стала элемэнтаў, з якімі самадзяржаўе магло-б пачаць заігрываць, якому яно магло сказаць „узбагачайцеся“. „Рабуй абшчыну, але падтрымай мяне“. Таму бясспрэчнай памылкай была-б усякая ацэнка сталыпінскай аграрнай політыкі, якая-б ня ўлічвала, з аднаго боку, яе бонапартысцкіх прыёмаў, з другога боку, яе буржуазнай (лібэральнай) сутнасьці“ [2] (двукосьсі Леніна—К. К.).

Сталыпінская рэформа і была спробай рэакцыянэраў павесьці буржуазную політыку, даць перамогу „прускаму“ шляху, вырашыць аграрнае пытаньне на карысьць старых прыгоншчыкаў за кошт мільёнаў сялянства, кінуўшы дробкі кулацтву. І калі на Беларусі працэс

[1] Ленін У. І., т. XX, ч. I, выд. 1, стар. 317.
[2] Ленин У. І. т. XI, ч. I, выд. 1, стар. 156-157.

капіталізацыі панскага маёнтку зайшоў далей, калі сялянства больш рэзка дыфэрэнцыявалася, чым у другіх мясцох цэнтральнай паласы, то і супярэчнасьці тут былі больш вострымі, і накапілася многа пары, гатовай узарваць памешчыцкі лад.

Зразумела, што напалоханае рэволюцыяй 1905 году дваранства ясна бачыла свае клясавыя мэты—трэба было ратаваць маёнтак. Трэба было адшукаць на вёсцы сілу, здольную гэта зрабіць,—і яе знайшлі ў нарастаючым кулацтве. Прыступілі да пабудовы бар'еру з кулацкіх гаспадарак, пачалі прышчапляць пачуцьцё „прыватнай уласнасьці", і ясна што Сталыпін выконваў толькі волю дваранства. Гэтую думку і падкрэсьлівае У. І. Ленін:

„Савет аб'яднанага дваранства яшчэ ў 1905 г. зараз пасьля рэволюцыі заклікаў урад да насаджваньня прыватнай пазямельнай уласнасьці сялян, каб хутчэй стварыць пласт заможных сялян, якія-б сталі на бок памешчыкаў супроць сялян. Сталыпін, не марудзячы, стаў на шлях, паказаны саветам аб'яднанага дваранства"[1].

Рэакцыйны ўрад ухапіўся за насаджэньне хутароў, пачаў „чыстку", але, зразумела, па-абшарніцку,—надзельнага земляўладаньня. Распачалося рабаваньне вёскі. Да рэчы трэба заўважыць, што процэс узьнікненьня хутароў пачаўся на Беларусі задоўга да закону 9 лістапада. Ясна, што рабаваньне вёскі не магло ня выклікаць і абвастрыць аграрнага руху шырокіх сялянскіх мас, тых мас, за чый кошт была распачата „чыстка".

Так з прычыны спрэчак у III Думе Ленін пісаў:

„Сталыпін хоча сьцерці ўсе ранейшыя грані ўсіх ранейшых відаў земляўладаньня. Гэта імкненьне экономічна правільнае. Капіталізм зьдзейсьніць яго няўхільна. Пытаньне толькі ў тым, ці зробіцца гэта за кошт мільёнаў сялянскіх двароў (грабеж па закону 9 лістапада), ці за кошт 30.000 буйнейшых памешчыкаў? Апошні шлях немажлівы без нацыяналізацыі зямлі ў буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі"[2].

Сталыпінскае законадаўства і было спробай рэакцыйнага ўраду прыгоншчыкаў павесьці буржуазную політыку, скіраваць разьвіцьцё сельскай гаспадаркі на „прускі шлях", які абяцаў ціхае доўгае выміраньне мільёнаў сялянскіх сем'яў. Але гэта была няўдалая спроба, масы вельмі хутка зразумелі „махінацыі" прыгоншчыкаў, аграрны рух, які распачаўся сьледам, пасьведчыў гэта. І яшчэ задоўга да сваёй сьмерці Сталыпін разам з усёй сваёй політыкай быў ужо мёртвы. Ленін гэтую думку выказаў у артыкуле „Последний клапан" яшчэ ў 1912 годзе:

„Сталыпінская рэформа *ня можа* зьнішчыць ні кабалы і адпрацовак масы сялян, ні іх галадовак. Патрэбны дзесяцігодзьдзі і дзесяцігодзьдзі такіх-жа пэрыодычных галадовак, каб пакутна вымерла маса цяперашніх гаспадарак для „посьпеху" сталыпінскай рэформы, г. зн. для стварэньня ўсталяванага буржуазнага ладу агульна-эўропейскага тыпу ў нашай вёсцы. А ў цяперашні час, пасьля шасьцігадовага выпрабаваньня сталыпінскай „рэформы" і шасьцігадовых „бліскучых" прогрэсаў ліку „замацаваўшых зямлю" і г. д. *ня можа быць і малейшага сумненьня ў тым, што гэтая рэформа крызісу ня зьнішчыла і зьнішчыць ня можа*"[3] (двукосьсі Леніна, апошняе падкрэсьлена мною—К. К.).

[1] Ленін У. І., т. XVII, выд. 2, стар. 395.
[2] Ленін У. І., т. XII, выд. 2, стар. 413.
[3] Ленін У. І., т. XVI, выд. 2, стар. 99.

Гэтае палажэньне мы асабліва падкрэсьліваем, бо некаторыя дасьледчыкі (ужо ня кажучы аб кадэцтвуючых) лічаць, што рэформа ўдалася (у сэнсе вырашэньня аграрнага пытаньня). Увесь ход рэвалюцыйных падзей, сьведкамі якіх мы былі самі, гаворыць за гэта і не патрабуе іншых і лішніх аргумэнтаў. Сталыпінская ломка мусіла навучыць сялянскія масы, мусіла адчыніць вочы і праясьніць сазнаньне шырокіх мас і абвастрыць клясавую барацьбу, менавіта гэта Ленін і падкрэсьліў у адным з сваіх артыкулаў:

„Мы адзначым пакуль, што адзіны ўпаўне рэальны вынік сталыпінскай ломкі ёсьць галадоўка 30 мільёнаў. І яшчэ невядома, ці не навучыць рускі народ сталыпінская ломка, *як трэба* рабіць больш рашучую ломку. Вучыць яна гэтаму бязумоўна. Ці навучыць,—пажывем, убачым“ [1] (курсыў Леніна—К. К.).

Мы толькі можам падкрэсьліць, што „ўрокі“ сталыпіншчыны сялянства ўсвоіла вельмі добра, і У. І. Ленін у сваёй ацэнцы быў глыбокаправым і далёка прадбачыў усе магчымасьці. Распачаўшыйся аграрны рух толькі пасьведчыў, што „ўрокі“ пачалі ўспрыймацца шырокімі масамі, што „вучні“ аказаліся вельмі здольнымі.

Уся сталыпінская рэформа аказалася вельмі эфэмэрнай з сваімі прогрэсамі, і гэтае палажэньне мы яшчэ раз падкрэсьлім словамі Леніна. У артыкуле „Последний клапан“ Ленін даў такую ацэнку рэформе:

„Гэта рэформа дала, зразумеле, адтэрміноўку гібнучаму прыгоньніцтву,—дакладна так-жа, як „праславутая“ расхваленая лібэраламі і народнікамі так званая „сялянская“ (а на справа памешчыцкая) рэформа 1861 г. дала адтэрміноўку паншчыне, увекавечыўшы яе пад іншай абалонкай аж да 1905 г.

„Адтэрміноўка“ старому парадку і старому прыгоньніцкаму земляробству, якая дана была Сталыпіным, заключаецца ў тым, што адчынены яшчэ адзін і прытым *апошні* клапан, які можна было адчыніць, не эксплёатуючы ўсяго памешчыцкага земляўладаньня. Адчынены клапан і некалькі выпушчана пара—тым, што частка зусім ажабрачаных сялян „умацавалі“ свае надзелы ў асабовую ўласнасьць і прадалі іх, ператварыўшыся з пролетараў з надзелам у чыстых пролетараў,—далей тым, што частка заможнага сялянства, замацаваўшы свае надзелы і іншы раз усталяваўшыся на адрубах паставілі яшчэ больш моцную капіталістычную гаспадарку, чым раней“ [2] (двукосьсі і падкрэсьлена Леніным—К. К.).

Я думаю, што да гэтай ацэнкі няма чаго дадаць, адсюль вывад адзін, што сталыпіншчына ня зьняла асноўных супярэчнасьцяў разглядаемага часу, а наадварот, пасьля рэволюцыі 1905 году *старыя* супярэчнасьці яшчэ больш завастрыліся, сталі яшчэ больш моцным, і сымптомы, аб якіх мы будзем гаварыць далей, ясна сьведчылі, што выбух набліжаўся вялікімі крокамі. Імпэрыялістычная вайна гэтыя крокі зрабіла сямімільнымі, і стары лад з усімі перажыткамі быў узарваны і зьмецены 1917 годам—вялікай Кастрычнікаўскай рэволюцыяй. У гэтым месцы ня можна не падкрэсьліць, што менавіта Уладзімір Ільліч пісаў аб новым нарастаньні крызісу яшчэ ў 1912 г.:

„Стары крызіс нарастае пановаму, у новых абставінах, пры куды больш акрэсьленых адносінах між клясамі, але ён нарастае і яго соцы-

[1] Ленін У. І., т. XVI, выд. 2, стар. 14.
[2] Там-жа, стар. 89.

яльна-экономічная сутнасьць (і ня толькі экономічная) прырода застаецца, па істоце справы, ранейшай"[1].

Процэс хутарызацыі—рабаваньне вёскі кулакамі, пролетарызацыя асноўных мас сялянства, пагоршаньне яго становішча,—усё гэта штурхела на рэволюцыйныя выступленьні, і Ільліч у 1914 г. прадракаў новую аграрную рэволюцыю:

„Большасьць сялян, ня гледзячы на ўсе праславутыя прогрэсы, застаецца ў прыгонным зьняволеньні. Ад гэтага так *вузкі і хісткі* ўсе „прогрэсы", ад гэтага няўхільны галадоўкі, ад гэтага слабы і ўбогі ўвесь унутраны рынак, ад гэтага бяспраўе і свавольства трымаюцца так моцна, ад гэтага *яшчэ* мацней *няўхільнасьць новай аграрнай рэволюцыі.* Бо мацней супярэчнасьці веку аэроплянаў, электрычнасьці, аўтомобіляў і „зімовай наёмкі" ці „спольшчыны"[2] (курсыў, двукосьсі Леніна, апошнія словы падкрэсьлены мной—К. К.).

Выходзячы з ацэнкі аб нарастаньні новай рэволюцыі, наша задача і задача будучых дасьледчыкаў—прасачыць, як нарастала аграрная рэволюцыя, як зьбіраліся і консолідаваліся рэволюцыйныя сілы пролетарыяту і сялянства, карыстаючыся каштоўнейшымі заўвагамі і аналізам, якія даны Леніным. Тут-жа мы мусім адкінуць фальсыфікатарскія спробы тлумачэньняў Леніна аб сталыпінскай рэформе, якія рабіліся Доўнар-Запольскім. Ён, між іншым, піша:

„Апошні (г. зн. Ленін У. І.—К. К.) глядзеў на гэтую рэформу, як на вельмі важны акт барацьбы з рэшткамі сярэднявечных формаў. Неабходнасьць ломкі сярэднявечных формаў добра разумеў і прапаведваў сам Ленін"[3].

Прыведзеная крыху ніжэй цытата нішчыць падобны вывад Доўнар-Запольскага аб поглядах Леніна на сталыпіншчыну. Здаецца, што прыведзеныя цытаты вельмі добра даводзяць усю фальсыфікацыю падобных сьцьвярджэньняў Доўнар-Запольскага. Тут выяўляецца ўсё той-жа буржуазны твар Д.-З., апраўданьне сталыпіншыны, а значыць і політыкі царызму.

Прасачыць разьбег аграрнай рэволюцыі к 1917 году і Кастрычніку—справа складаная. На даную працу мы глядзімо як на першую спробу на параўнаўча невялікім матар'яле ахарактарызаваць аграрны рух перад імпэрыялістычнай вайной на Беларусі. Але і падобная праца дыктуецца яшчэ і тым, што трэба, урэшце, зьнішчыць цалкам і з карэньнямі легенду нацыянал-дэмократаў аб адзінстве беларускага народу, які па іх поглядам зьяўляецца нібы выключэньнем і на яго ня ўплываюць агульныя законы аб клясавай барацьбе. Барацьба на беларускай вёсцы пасьля рэволюцыі 1905 г. пацьвярджае і пераканана сьведчыць за тое, што экономічнае і соцыяльнае разьвіцьцё Беларусі падпарадкуецца законам, адчыненым Марксам-Энгельсам-Леніным.

Усю паважнасьць вывучэньня аграрнага пытаньня і аграрнага руху ня трэба даводзіць. У пачатку ўступу мы прыводзілі словы Кнорына, і, як паказалі вышэй, Ленін шмат працаваў над аграрным пытаньнем і над яго вырашэньнем. Менавіта *яно* (аграрнае пытаньне), *а не нацыянальнае* стаяла на парадку дня ў разгляданы час і вісела як дамокляў меч над кіруючай клясай былой Расіі. У. І. Ленін у лісьце да Скварцова-Сьцяпанава пісаў:

[1] Ленін У. І. т. XVI, выд. 2, стар. 91.
[2] Ленін У. І. т. XVII, выд. 2, стар. 397.
[3] Довнар-Запольский М. В., проф. „Народное хозяйство Белоруссии 1861—1914 гг. Изд. Госплана БССР, Минск, 1926, стар. 72.

„Вось *гэтае* аграрнае пытаньне і ёсьць *цяпер* у Расіі *нацыянальнае* пытаньне буржуазнага разьвіцьця"—і, прывёўшы прыклад Германіі, дзе такім пытаньнем было аб'яднаньне Германіі, Ленін гаварыў далей—„а *нацыянальным* пытаньнем канчатковага ўсталяваньня буржуазнага разьвіцьця зьяўляецца менавіта аграрнае (нават ужо сялянскае пытаньне") [1] (падкрэсьлена Леніным—К. К.). У рэволюцыі 1905 г. пролетарыят быў асноўнай рухаючай сілай, ён змагаўся за ўладу і вёў за сабой шырокія масы сялянства. Але апошняе ў 1905 г. не пайшло ўсёй масай за рабочай клясай. Пасьля рэволюцыі старыя супярэчнасьці яшчэ больш абвастрыліся. Эпоха рэакцыі была эпохай, калі шырокія масы сялянства канчаткова распазналі, што яго саюзьнік—пролетарыят. Бо толькі пад кіраўніцтвам пролетарыяту мажліва было перамагчы абсолютызм. Так Ленін У. І. яшчэ задоўга нават да першай рэволюцыі ў 1894 г. пісаў: „Рускі *рабочы,* падняўшыся на чале ўсіх дэмократычных элемэнтаў, зваліць абсолютызм і павядзе *рускі пролетарыят* (побач з пролетарыятам *усіх краёў*) прамым шляхам адкрытай політычнай барацьбы да *пераможнай комуністычнай рэволюцыі* (падкр. Леніным) [2]. Партыя бальшавікоў пасьля 1905 г. адваявала ад лібэральнай буржуазіі шырокія масы сялянства, якія хутка сьпелі, каб зрабіцца саюзьнікамі пролетарыяту.

Перад намі і стаіць задача адхіліць заслону і паглядзець як на экономіку Беларусі, гэтак і на клясавую барацьбу, якая кіпела ў беларускай вёсцы вакол вырашэньня аграрнага пытаньня. Глыбокае вывучэньне гэтага пытаньня на Беларусі магчыма толькі на падставе ленінскае спадчыны і ленінскага вывучэньня, і зразумела, што на аснове адшуканых матар'ялаў мы можам даць толькі самы эскізны нарыс аграрнага руху ў разгляданы час.

---

[1] Ленін У. І., т. XX, ч. 1, стар. 316.
[2] Ленін У. І. выд. 3, стар. 200.

# НЕКАТОРЫЯ ШТРЫХІ ЭКОНОМІКІ БЕЛАРУСІ

Для таго, каб для нас былі ясны клясавыя суадносіны пасьля рэволюцыі 1905 г. на Беларусі, мы мусім коратка спыніцца на некаторых штрыхох соцыяльна-экономічнай і гаспадарчай абстаноўкі гэтых гадоў.

Галоўная супярэчнасьць, якая вырасла ў выніку разьвіцьця капіталізму на Беларусі, заключалася ўсё-ж такі ў панаваньні старога фэўдальнага земляўладаньня, якое было ўзаконена рэформай 1861 г. Капіталізм патрабаваў зьнішчэньня старога земляўладаньня. А вясковая буржуазія, якая вырасла і разьвілася пасьля таго часу, патрабавала таксама месца пад сонцам. Для поўнай пераапрацоўкі вёскі ў капіталістычным катле перажыткі прыгоньніцтва зьяўляліся вялікаю перашкодаю. Думаецца, гэта можна характарызаваць данымі статыстыкі 1905 году, ня гледзячы на ўсе яе адмоўныя якасьці. Дваранству і духавенству належала:

| Губэрні | Лік уладаньняў | Дзесяцін зямлі | Дзесяцін на 1 уладан. |
|---|---|---|---|
| Віцебская | 2.138 | 1.295.855 | 809,3 |
| Магілеўская | 3.417 | 1.405.411 | 418,8 |
| Менская | 6.991 | 4.044.117 | 580,4 |
| Усяго | 12.436 | 6.745.373 | 542,4 |

Сялянскіх двароў і ў іх надзельнае зямлі было:

| Губэрні | Двароў | Дзесяцін зямлі | Усяго на 1 двор |
|---|---|---|---|
| Віцебская | 138.566 | 1.593.147 | 11,2 |
| Магілеўская | 198.283 | 1.619.346 | 8,1 |
| Менская | 213.924 | 1.945.998 | 9 |
| Усяго | 550.773 | 5.158.491 | 9,1 |

[1] Статистика землевладения 1905 г. Ц.С.К. Петербург, 1907 г.

Такім чынам, калі ў руках дваранства і духавенства знаходзілася ў трох памянёных губэрнях 6.745.373 дзесяціны зямлі, якая прыпадала на 12.436 уладаньняў, то на другім полюсе мы маем 550.773 сялянскія двары, якія маюць усяго 5.158.491 дзес., іначай кажучы, больш як паўмільёна сялянскіх двароў маюць на паўтара мільёна дзесяцін менш, чым 12 тыс. памешчыкаў-дваран. Ясна, што такое становішча было нясьцерпным пры разьвіцьці капіталізму, і гэта лепш за ўсё давяла рэволюцыя 1905 г.

Гэтыя даныя вельмі агульны, каб дасканала прадставіць гэты процэс, але яны ўскрываюць галоўную супярэчнасьць. З другога боку, нарадзілася вясковая буржуазія, ужо маецца даволі моцная група капіталістычных гаспадарак, якія складаюцца з усякага віду старых відаў уладаньня: і з надзельнай і з памешчыцкай, прыкупной і арэнднай і г. д. Так, сяляне ў трох губэрнях мелі ў асабовай уласнасьці наступную колькасьць зямлі[1].

| Губэрні | Лік двароў | Дзесяцін зямлі | На адзін двор |
|---|---|---|---|
| Віцебская | 4.691 | 178.369 | 38 |
| Магілеўская | 6.340 | 219.992 | 34,7 |
| Менская | 3.414 | 141.781 | 41,5 |
| Усяго | 14.445 | 540.142 | 37,4 |

Гэтыя даныя гавораць аб тым, што вырасла капіталістычная верхавіна вёскі; гэтыя гаспадаркі—вынік прасяканьня капіталізму ў сельскую гаспадарку. Трэба адзначыць, што вясковая буржуазія ўваходзіць у склад і прыведзеных вышэй 550 тыс. сялянскіх двароў. Гэтыя двары маюць яшчэ прыкупленую сялянскімі таварыствамі і вобчаствамі зямлю. Бязумоўна, зямля ў таварыствах і вобчаствах належала ў сваёй значнай і пераважнай частцы вясковаму кулацтву і заможным пластом сялянства. Вось даныя аб уласнасьці гэтага віду:

| Губэрні | Лік уладаньняў | Дзесяцін зямлі |
|---|---|---|
| Віцебская | 2.277 | 181.088 |
| Магілеўская | 2.384 | 432.891 |
| Менская | 1.637 | 342.438 |
| Усяго | 6.248 | 956.417 |

Побач з надзельнай зямлёй сялянская буржуазія мела і прыкупную зямлю ў даволі значнай колькасьці. Калі мы складзем асабовую ўласнасьць сялянскай буржуазіі і прыкупную зямлю вобчастваў і таварыстваў, дык атрымаем па трох губэрнях 20.693 уладаньні

[1] Статистика землевладения 1905 г.



BIBLIOTEKA NARODOWA

з 1.496.559 дзес. зямлі. Гэта здабытак вясковай буржуазіі—вынік працы капіталізму, які вырваў глебу з-пад ног старых фэўдалаў-прыгоншчыкаў. Па-першае, яны прымушаны былі экономічным процэсам збываць свае землі буржуазіі, па-другое-ж, рэволюцыя 1905 г. іх вельмі напалохала.

Як расла вясковая буржуазія, можна лепш за ўсё характарызаваць данымі аб набытку зямлі. Так, па беларускім раёне па даным, якія прыведзены ў статыстычным зборніку па сельскай гаспадарцы ў XX в., рост прыватнай уласнасьці сялян па губэрнях Менскай, Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай быў наступны:

| Гады. | Зямлі т. дз. | Процант |
|---|---|---|
| 1862 . . . . . . . . . . . | 94 | 100 |
| 1872 . . . . . . . . . . . | 130 | 138 |
| 1882 . . . . . . . . . . . | 240 | 255 |
| 1892 . . . . . . . . . . . | 804 | 855 |
| 1902 . . . . . . . . . . . | 1.520 | 1691 |
| 1907 . . . . . . . . . . . | 1.772 | 1885 |
| 1909 . . . . . . . . . . . | 1.870 | 1989 |

Такім чынам, годы крызісу 80—90 гадоў былі гадамі, калі вясковая буржуазія асабліва шпарка расьце і прыбірае зямлю да сваіх рук. Годы крызісу спрыялі росту вясковай буржуазіі.

Як ва ўсёй былой Расіі, гэтак сама і на Беларусі галоўная маса зямель належала дваранству, але капіталістычнае разьвіцьцё выяўлялася менавіта ў тым, што дваранства бязупынна прадавала свае землі, зразумела, за вельмі высокую цану, і зямля ішла ў рукі капіталістаў і буржуазнай верхавіны вёскі. Вось даныя, якія характарызуюць гэты процэс да 1905 году.

| Губэрні | Гады | % дзесяц. зямлі, належ. дваранам | % зямлі, належ. гандляром | % зямлі, належ. сялянам | % зямлі, належ. мяшчанам |
|---|---|---|---|---|---|
| Віцебская . . . . | 1877 | 83,5 | 5,7 | 2,6 | 4,5 |
| » . . . . | 1887 | 82,4 | 6,6 | 4,5 | 5,0 |
| » . . . . | 1905 | 60,7 | 12,0 | 12,1 | 6,6 |
| Менская . . . . | 1887 | 93,1 | 4,3 | 1,2 | 1,3 |
| » . . . . | 1877 | 93,4 | 2,7 | 1,4 | 2,1 |
| » . . . . | 1905 | 76,6 | 6,4 | 4,6 | 1,1 |
| Магілеўская . . . | 1877 | 89,4 | 3,4 | 3,3 | 3,2 |
| » . . . | 1887 | 82,3 | 3,6 | 8,1 | 4,8 |
| » . . . | 1905 | 60,0 | 3,6 | 28,0 | 6,1 |

Ясна відаць, што дваранства траціць землі; у гэтым і ёсьць кірунак разьвіцьця сельскай гаспадаркі, стаўшай на капіталістычныя рэйкі. Як бачым, тэмп страты зямлі, нязначны да 80 г. XIX ст., набывае большую хуткасьць к рэволюцыі 1905 г. і к 1914 г. робіцца бясспрэчна яшчэ больш хуткім[1]. Зразумела, хто мог купляць землі — гэта былі

[1] Статистический справочник по аграрному вопросу в. I, вып. II. Унив библ. Москва. 1916 г.

капіталістычныя групы. Але як мы бачым, пакупка гандлярамі і іншымі не асабліва значная, рост набыцьця імі зямлі застаецца далёка ззаду пры параўнаньні з набыцьцём зямлі сялянствам. Ясна, хто з сялянства мог плаціць за зямлю па ўздутым цэнам, — гэта былі аформленыя капіталістычныя вяршкі вёскі.

Як расла вясковая буржуазія, лепш за ўсё можна характарызаваць данымі набыцьця зямлі. Так, па беларускім раёне ў статыстычным зборніку па сельскай гаспадарцы падаюцца наступныя даныя па трох беларускіх губэрнях і па Смаленскай.

Вясковай буржуазіі з так званага прыватнага земляўладаньня належала:

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1862 год . . . . | 94 т. | дзес. | 100 |
| 1872 „ . . . . | 130 т. | „ | 138 |
| 1882 „ . . . . | 240 т. | „ | 255 |
| 1892 „ . . . . | 804 т. | „ | 855 |
| 1902 „ . . . . | 1520 т. | „ | 1691 |
| 1902 „ . . . . | 1772 т. | „ | 1885 |
| 1909 „ . . . . | 1870 т. | „ | 1989 |

Гэтая табліčка вельмі добра паказвае, як вясковая буржуазія гарнула да сваіх рук зямлю. Цікава адзначыць, што годы крызісу зьяўляюцца і гадамі ўзмоцненага скупляньня вясковай буржуазіяй зямлі. Гэта цалкам зразумела, бо старое прыгоньніцкае земляўладаньне пад ціскам капіталізму зьнікае, і вырасшая вясковая буржуазія і кулацтва прыбірае зямлю да сваіх рук, каб паставіць на ёй гаспадарку па-капіталістычнаму.

Мы сказалі, што к 1914 г. працэс мобілізацыі земляўладаньня пайшоў больш хуткім тэмпам. У нас няма даных для ўсіх губэрань Беларусі. Падамо прыклад па Магілеўскай губ.[1].

| Магілеўская губ. | 1905 г. | | | 1917 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Кольк. уладан. | Дзесяцін зямлі | % да ўсёй зямлі | Кольк. уладан. | Дзесяцін зямлі | %% да ўсёй зямлі |
| Магілеўская . . . . | 3.347 | 1.401.828 | 60,8 | 3.611 | 1.006.700 | 39 |
| Ганар. грам. і гандляр. . | 146 | 73.328 | 3,2 | 499 | 90.900 | 3,6 |
| Мяшчанам . . . . . | 5.360 | 158.264 | 6,9 | 8.460 | 165.200 | 6,2 |
| Сялянам . . . . . | 6.340 | 219.992 | 9,6 | 39.902 | 631.800 | 24,5 |
| Сял. воб. і т-вам . . . | 2.384 | 432.891 | 18,8 | 2.468 | 609.700 | 23,6 |
| Інш. станам . . . . | 94 | 5.284 | 0,2 | 646 | 78.000 | 3,1 |
| Інш. воб. і т-вам . . . | 23 | 12.153 | 0,6 | — | — | — |
| Усяго. . . . | 17.964 | 2.303.740 | 100 | 56.586 | 2.582.300 | 100 |

Мы ўзялі так званую прыватную ўласнасьць па Магілеўскай губ. Лічбы для 1917 г. Магілеўскім земствам былі прапрацаваны відавочна з перапісу 1917 г. і крыху, відаць, закруглены. Нам ня зусім зразумелы прынцыпы вылічэньняў земскіх статыстыкаў, але кулацкая ўстаноўка гэтых прынцыпаў абсолютна ясная. Мы бачым найяскравейшы працэс страты зямлі дваранствам, набыўшы вельмі хуткі тэмп пасьля рэво-

[1] Календарь-справочник Могилевской губ.

люцыі 1905 г. Сапраўды, калі дваранству Магілеўскай губ. у 1887 г. належала 82,3 проц. усёй прыватнай уласнасьці, то ў 1905 г.—ужо толькі 60,8 проц., а ў 1917 г. 39 проц.

Зямля, галоўным чынам, пераходзіць у рукі капіталістычных вяршкоў вёскі. Зразумела, што ад гэтага люты зямельны голад асноўнай масы сялянства не зьмяншаўся, а яшчэ больш абвастраўся. Сапраўды, калі сялянам „асобным" у 1905 г. належала 9,6% усёй прыватнай уласнасьці, то ў 1917 г. — ужо 24,5%. Апрача гэтага таварыствам у 1905 г. належала 18,8%, у 1917 г. — ужо 23,6%. З параўнаньня гэтых лічбаў ясна відаць, што на вёсцы хутка рос кулак. Бо і купляць зямлю мог толькі той, у каго былі грошы, а былі яны, зразумела, не ў бядняцкай частцы вёскі, на долю якой заставалася толькі эксплёатацыя як з боку юнкера, які капіталізаваўся, старога прыгоньніка, так і з боку вырасшага кулака. Вясковая буржуазія набывала зямлю як праз Сялянскі пазямельны банк, так і непасрэдна ад пана, а таксама скупляла надзелы беднаты і тых, хто ішоў шукаць шчасьця ў далёкі Сібір. Плаціць за зямлю высокую цану мог, зразумела, толькі вясковы кулак, бо вытрымаць, напрыклад, плацяжы банку другія групоўкі амаль не маглі. Вось маленькая ілюстрацыя росту цэн на зямлю ў той-жа Магілеўскай губ. Возьмем гэтыя даныя па пяцігодзьдзям.

| | | |
|---|---|---|
| 1883—1887 . . . . | 17,6 руб. | — 100 |
| 1888—1892 . . . . | 23,8 „ | — 135 |
| 1893—1897 . . . . | 30,8 „ | — 175 |
| 1898—1902 . . . . | 64,4 „ | — 366 |
| 1903—1907 . . . . | 93 „ | — 529 |
| 1908—1912 . . . . | 101 „ | — 574 |
| 1913 . . . . . . . | 102 „ | — 580 |
| 1914 . . . . . . . | 128 „ | — 727 |
| 1915 . . . . . . . | 148 „ | — 841 |

Як бачым, цэны на зямлю з часу адчыненьня Сялянскага пазямельнага банку да 1915 г. падскочылі амаль у $8^1/_2$ раз; гэта яшчэ сьведчыць аб тым, што адзначаны банк сапраўды не сялянам дапамагаў выгодна набываць свае землі, а пану-памешчыку збываць землі, і толькі па назьве быў сялянскім.

Цікава яшчэ адзначыць адну характэрную рысу. Пасьля 1905 году пакупкі зямлі вобчаствамі вельмі зьмяншаюцца, зьмяншаюцца і пакупкі таварыствамі, а пры агульным значным росьце гэта сьведчыць, што зямлю концэнтраваў кулак. Агульны-ж рост праданай зямлі быў вельмі значны, і пакупкі даюць вельмі рэзкую крывую ўверх. Падамо яшчэ адну ілюстрацыю аб соцыяльным стане пакупнікоў. Наступная табліčка складзена на падставе справаздач Сялянскага пазямельнага банку за адпаведныя гады [1].

| Год | Безьзямельн. | З адным канём | З двума коньмі | З трыма і больш | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 1909 . . . . | 268 | 1.598 | 1.845 | 1.433 | 5.144 |
| 1910 . . . . | 166 | 969 | 1.238 | 982 | 3.354 |
| 1911 . . . . | 143 | 1.415 | 1.502 | 1.043 | 4.103 |
| 1912 . . . . | 147 | 1.785 | 1.843 | 1.617 | 5.092 |
| 1913 . . . . | 314 | 1.721 | 2.092 | 1 663 | 5.770 |
| 1914 . . . . | 164 | 1.428 | 1.681 | 1.341 | 4.614 |
| 1915 . . . . | 44 | 554 | 552 | 562 | 1.712 |

[1] Отчеты Крест. позем. банка 1909—1915 гг.

Як бачым, зямлю купляла, галоўным чынам, заможнае сялянства і вясковая буржуазія. Нельга ні ў якім разе думаць, што безьзямельныя першай групы—гэта сапраўды бедняки. Зараз мы падамо даныя, якія абвяргаюць гэта. І зусім дарэмна ўкладальнікі справаздач Пазямельнага сялянскага банку насіліся з гэтымі лічбамі. Бо ў гэту групу заносіліся проста тыя асобы, якія раней земляробствам не займаліся. Пасьля пакупкі зямлі гэтыя „безьзямельныя“ адразу траплялі ў групу кулакоў. Гэта даводзіцца вельмі проста. Калі мы возьмем і паглядзім па гадох, колькі ў сярэднім прыпадае на адну пакупку гэтых безьзямельных, то акажацца:

У 1909 г. прыпадала 25,1 дзес.<br>
У 1910 г. „ 28,2 „<br>
У 1911 г. „ 45 „<br>
У 1912 г. „ 45,1 „<br>
У 1913 г. „ 20,9 „<br>
У 1914 г. „ 28,5 „<br>
У 1915 г. „ 38,7 „

Гэта быў шлях, якім фармавалася сельская буржуазія. У гэтай групе быў валасны пісар, дробны гандляр, мешчанін гораду і г. д. Яны асядалі на зямлю і ў пераважнай большасьці эксплёатавалі батракоў, г. зн. ставілі гаспадарку на капіталістычныя рэйкі.

Па Магілеўскай губ. 39.902 сялянскіх двары апрача надзельнай мелі прыкупную зямлю. Гэтыя двары, бязумоўна, у сваёй пераважнай большасьці кулацкія гаспадаркі. Яны складалі 14,3% усіх сялянскіх двароў губэрні. Было 20.080 двароў безьзямельных, а колькі было пролетараў з надзелам—пра гэта справачнік земства маўчыць[1].

Такім чынам, пасьля рэволюцыі 1905 году хуткім тэмпам ідзе мобілізацыйны процэс, старыя прыгоньнікі збываюць свае лятыфундыі па надта высокай цане.

Мы ўжо паказалі вышэй, што цэны з канца XIX веку ў Магілеўскай губ. падскочылі ў 7-8 разоў і па гэтай павышанай цане раскупляла зямлю вясковая буржуазія. Але трэба адзначыць, што, ня гледзячы на хуткі тэмп продажу зямлі, дваранскае земляўладаньне было ўсё-ж такі вельмі значным. Толькі Кастрычнікавая рэволюцыя зьмяла буржуазны лад, а з ім і ўсе перажыткі прыгоньніцтва.

Што вясковая буржуазія расла вельмі хутка пасьля 1905 г. можна яшчэ паказаць на росьце ўкладаў у дзяржаўныя ашчадныя касы.

*Табліца 1.*

**Пазычкова-ашчадныя касы па Менскай, Віцебскай і Магілеўскай губ.**

| К 1 студзеня | Земляўласьнікі | | Земляробы | | Усяго наогул | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Кольк. кніж. | Сума ўкладзен. т. р. | Кольк. кніж. | Сума ўкладзен. т. р. | Кольк. кніж. | Сума ўкладзен. т. р. |
| 1906. . | 2.084 | 625 | 52.617 | 9.313 | 156.608 | 32.345 |
| 1907. . | 2.414 | 794 | 62.293 | 12.945 | 179.550 | 37.725 |
| 1908. . | 2.609 | 902 | 73.292 | 15 004 | 196.722 | 40.653 |
| 1909. . | 3.237 | 1.074 | 79.968 | 16.428 | 207.599 | 42.588 |
| 1910. . | 2.628 | 887 | 90.015 | 18.114 | 222.724 | 45.986 |
| 1911. . | 3.272 | 1.143 | 102.212 | 20.625 | 258.615 | 50.073 |
| 1912. . | 2.792 | 926 | 114.969 | 23.347 | 257.820 | 54.076 |
| 1913. . | 2.856 | 1.052 | 128.586 | 27.094 | 278.860 | 59.301 |
| 1914. . | 4.747 | 1.252 | 134.494 | 28.401 | 289.372 | 61.387 |
| 1915. . | 2.979 | 1.250,4 | 129.266 | 27.389 | 283.792 | 67.541,9 |

[1] Календарь-справочник Могилевского земства на 1918 г.
[1] Стат. сбор. России и некотор. иностр. госуд. за 1909—1915 гг.

*Працяг табл. 1.*

| К 1 студзеня | Земляўласьнікі | | Землярobы | | Усяго наогул | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Кольк. кніж. | Сума ўкладзен. т. р. | Кольк. кніж. | Сума ўкладзен. т. р. | Кольк. кніж. | Сума ўкладзен. т. р. |
| | У процантах | | | | | |
| 1906. . | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| 1907. . | 116 | 127 | 118 | 189 | 114 | 116 |
| 1908. . | 125 | 143 | 139 | 161 | 125 | 125 |
| 1909. . | 155 | 172 | 152 | 177 | 132 | 131 |
| 1910. . | 126 | 142 | 171 | 194 | 142 | 142 |
| 1911. . | 157 | 183 | 194 | 221 | 165 | 155 |
| 1912. . | 134 | 148 | 278 | 250 | 164 | 167 |
| 1913. . | 137 | 168 | 244 | 292 | 178 | 183 |
| 1914. . | 228 | 200 | 255 | 305 | 185 | 189 |
| 1915. . | 143 | 200 | 245 | 294 | 191 | 209 |

У адносінах да ўсіх кніжак і ўкладаў было (таб. 2):

*Табліца 2.*

| К 1 студзеня | У земляўласьнікаў | | У землярobаў | |
|---|---|---|---|---|
| | % кніж. | % уклад. | % кніж. | % уклад. |
| 1906 . . . . | 1,3 | 1,9 | 33,6 | 28,8 |
| 1907 . . . . | 1,3 | 2,1 | 34,7 | 34,3 |
| 1908 . . . . | 1,3 | 2,2 | 37,2 | 36,9 |
| 1909 . . . . | 1,5 | 2,5 | 38,5 | 38,6 |
| 1910 . . . . | 1,2 | 1,9 | 46,4 | 39,4 |
| 1911 . . . . | 1,2 | 2,3 | 39,5 | 41,1 |
| 1912 . . . . | 1,1 | 1,7 | 44,6 | 43,1 |
| 1913 . . . . | 1,0 | 1,7 | 46,4 | 46,2 |
| 1914 . . . . | 1,6 | 2,1 | 46,1 | 45,7 |
| 1915 . . . . | 1,0 | 1,8 | 45,5 | 40,5 |

У паданых табліцах зьведзены даныя па трох губэрнях—Менскай, Магілеўскай і Віцебскай. У ёй паказаны рост кніжок і ўкладаў у абсолютных і адносных лічбах пасьля рэволюцыі 1905 г. Нас цікавіць так

званая група „землиробаў",—гэта, бязумоўна, кулацтва і заможныя групы сялянства рабілі ўклады і накапленьні. Дзяржаўнымі касамі карысталіся ў першую чаргу капіталістычныя вяршкі вёскі. Земляўласьнікі карысталіся больш паважнымі ўстановамі і трымалі свае грошы ў банках, а кулацтва і ўсялякая дробная буржуазія гарадоў і мястэчак рабілі ўклады ў касы. Так, група „землиробаў" у 1906 г. мела 33,6% усіх кніжак у дзяржаўных ашчадных касах і 28,8% агульнай колькасьці ўсіх укладаў, а ў 1914 годзе на гэту групу прыпадала 46,1% кніжак і 45,7% усіх укладаў. Досыць кінуць вокам на процантныя суадносіны, каб убачыць, якім тэмпам ішло накапленьне ў вясковай буржуазіі. Процант вясковай буржуазіі пакідаў ззаду і агульны рост усіх кніжок і ўкладаў па гэтых трох губэрнях. Сапраўды, калі ў 1906 годзе кніжак вясковай буржуазіі было—52.617, то ў 1915 г. ужо 129.266, у адносных лічбах гэта—100—245%. Іншымі словамі, колькасьць кніжок узрасла амаль у $2^1/_2$ разы. Калі на гэту групу ў 1906 г. маем укладаў 9.313.000 руб., то ў 1915 г. ужо 27.389.000 руб. у адносных лічбах—100.294. Іншымі словамі, уклады за гэтыя 9 год вырасьлі амаль утрая. Гэта ў той час, калі наогул усе кніжкі па трох губэрнях вырасьлі толькі ў 1,8 раз, а ўклады—толькі ў 2 разы. Але ня толькі вырасьлі кніжкі і ўклады; трэба адзначыць, што апошнія зрабіліся больш значнымі. Так, калі ў 1905 годзе на 1 кніжку групы „землиробаў" прыпадала 177 руб., то ў 1915 г. ужо 212 руб. Такім чынам, вывад ясны—пасьля рэволюцыі 1905 г. хутка ідзе рост вясковай буржуазіі і адбываецца ня толькі колькаснае яе павялічэньне, але і пэўная концэнтрацыя багацьця: багаты робіцца яшчэ больш моцным і заможнейшым за кошт зьбядненьня асноўных мас. Тут яшчэ трэба адзначыць, што і на імпэрыялістычнай вайне вясковая буржузія добра „падработала", але гэта патрабуе асобнага дасьледваньня і на гэтым мы ня спынімся.

Але калі багацела буржуазія, калі на адным полюсе вёскі награмаджалася багацьце, то на другім яшчэ хутчэй расла галеча і пролетарызацыя сялянства. Экономічны процэс рыў глыбокую прорву ў самым вясковым грамадзтве. І калі постаць пана кідала цень на клясавыя супярэчнасьці ў вёсцы, калі ўсё сялянства прымала ўдзел у аграрным руху, то сталыпінская рэформа не магла не праясьняць клясавых адносін у самой вёсцы, не магла „не навучыць" многаму шырокіх сялянскіх мас. Змаганьне з прыгоньнікам панам усяго сялянства пераплятаецца разам са змаганьнем супроць новага пана-кулака—іншы раз у вельмі складаны ўзор.

Пасьля рэволюцыі 1905 году хуткім тэмпам адбываўся процэс дыфэрэнцыяцыі сялянства, прычым сялянства ўсё больш выходзіла ў рады пролетарызаванага. Так у Магілеўскай губ. к 1917 г. было 20.080 безьзямельных двароў, а колькі было батракоў з надзелам? Пра гэта, бязумоўна, статыстыка маўчыць.

Згодна з конскімі перапісамі ад 1901 да 1912 гг., бясконных сялянскіх гаспадарак было:

| Губэрні | 1901 г.[1] | 1912 г.[2] |
|---|---|---|
| Магілеўская | 11,7 | 12,8 |
| Віцебская | 14,1 | 20,3 |
| Менская | 21,3 | 21,3 |
| Горадзенская | 25,9 | 22,2 |
| Віленская | 12,4 | 25,3 |

[1] Статистика Рос. империи, LV. Петербург, 1902 г.
[2] Там-жа, т. LXXXIII, Петроград, 1914 г.

Малюнак досыць рэзкі—20% бясконных двароў, г. зн. амаль чыстых вясковых пролетараў. Што-ж становіць сабой беларуская вёска і якава была яе дыфэрэнцыяцыя, на падставе адных конскіх перапісаў бяз даных аб гаспадарцы і наёмнай працы меркаваць досыць цяжка. Але ўсё-ж ткі возьмем даныя вайскова-конскіх перапісаў, паданыя Доўнар-Запольскім, апрацаваўшы іх іншым спосабам. Возьмем групу бясконных двароў і складзем з групаю меўшых па аднаму каню, а за групу заможных двароў будзем лічыць меўшых трох коняй і больш. Пры такой групоўцы атрымліваецца вельмі характэрны малюнак, які паказвае распластаваньне беларускае вёскі. Вось даныя на 6 губ. разам са Смаленскай.

| Групы | 1893-1894 г. | 1900 г. | 1912 г. |
|---|---|---|---|
| 1. Бясконных і з адным канём . . | 54,3 | 58,6 | 67,6 |
| 2. З двума коньмі . . . . . . | 25,9 | 24,4 | 21,7 |
| 3. З трыма і больш . . . . . | 19,8 | 17 | 10,7 |

Як бачым, беларуская вёска рэзка раскалолася на два полюсы. На адным 67,6% батракоў, беднаты і маламоцнага сялянства, на другім—10,7% вясковай буржуазіі і кулакоў, прыбраўшых ня толькі купленую зямлю сваіх аднавяскоўцаў, але і надзельную. Процант вясковай буржуазіі ў 1912 годзе быў куды большы. Зьмяншэньне шматконных гаспадарак якраз падкрэсьлівае рэзкую дыфэрэнцыяцыю беларускай вёскі, і гэтае зьмяншэньне выклікалася цэлым радам прычын, як, напрыклад, увядзеньнем сельска-гаспадарчых машын у гаспадарках вясковых кулакоў, а таксама заменай малых слабасільных коняй мясцовай пароды лепшымі па якасьці.

Доўнар-Запольскі робіць зусім процілеглы вывад, што нібы зьмяншалася кулацтва, што выкрывае цалкам буржуазны твар данага вучонага. Для зьмяншэньня коняй былі свае прычыны, пра якія гаварыў яшчэ Ленін у „Разьвіцьці капіталізму“, аналізуючы матар‘ял вайскова-конных перапісаў 1891—1900 гг.:

„Усё сялянства ўцалку стала бядней на коні. І колькасьць і процант шматконных зьменшыўся. З аднаго боку, гэта знамянуе, відавочна, заняпад усяе сялянскае гаспадаркі ў Эўропейскай Расіі. З другога боку, нельга забывацца, што ў Расіі лік коняй у сельскай гаспадарцы ненормальна вялікі ў стасутку да культурнай плошчы. У дробна-сялянскай краіне гэта і не магло быць іначай. Зьмяншэньне ліку коняй зьяўляецца, такім чынам, да пэўнай ступені аднаўленьнем нормальных адносін рабочай жывёлы да колькасьці пахаці *ў сялянскай буржуазіі* (падкрэсьлена Леніным) [1].

Гэтае зьмяншэньне, як бачым, паказвае на рэзкую дыфэрэнцыяцыю беларускай вёскі, на пэўную концэнтрацыю і нарастаньне багацьця ў заможных кулакоў, якія жылі за кошт зьбядненьня шырокіх сялянскіх мас. Такім чынам, вясковая буржуазія і кулацтва концэнтруюць у сваіх руках і зямлю прыкупную і сялянскія надзелы і рэзка адасабняюцца ў асобную клясавую групу.

Возьмем яшчэ адну крыніцу — статыстыку земляўладаньня 1905 г.—і паглядзімо на разьмеркаваньне надзельнай зямлі ўнутры сялянства.

[1] Ленін У. І. т. II, выд. 2, стар. 104.

Вось даныя ў процантных суадносінах[1]:

| Групы | Магілеўская | | Віцебская | | Менская | | Віленская | | Горадзенск. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | % двар. | % зям. | % двар. | % зям. | % двар. | % зям. | % двар. | % зям. | % двар. | % зям. |
| Да 5 дзес. . . | 9,7 | ·4 | 2,5 | 0,6 | 12,3 | 5,4 | 3,1 | 0,7 | 4,6 | 0,4 |
| „ 5—10 дзес. . | 69,4 | 64,8 | 47,5 | 34,3 | 61,8 | 49,5 | 31,5 | 16,7 | 10,4 | 5,2 |
| „ 10—15 „ . . | 18,5 | 25,9 | 35,8 | 36,3 | 14,7 | 19,6 | 28,8 | 27,5 | 31,3 | 24 |
| „ 15 і б. „ . . | 2,4 | 15,3 | 14,2 | 28,8 | 11,2 | 25,5 | 36,6 | 55,1 | 53,7 | 70,4 |
| Усяго . . | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

Ясна, што калі-б мы ведалі прыкупную зямлю побач з надзельнай па дварох, а такой у сялянскай буржуазіі была досыць значная колькасьць, то гэтыя суадносіны былі-б іншымі. Але і гэтыя даныя, узятыя разам з данымі конскіх перапісаў, сьведчаць аб рэзкай дыфэрэнцыяцыі вёскі. Нават надзельныя землі яшчэ да сталыпінскіх законаў, ня гледзячы на ўсякія забароны аб продажы, пераходзяць у рукі заможнікаў і кулакоў. Вазьмеце Віленскую і Горадзенскую губэрні. Там гэты процэс выяўляецца надта рэзка. Нават па гэтых даных мы бачым, што вёска раскалолася і сярэднія групы ўжо не зьяўляюцца самымі вялікімі. Дзе тут непарушная нацдэмаўская цэльнасьць беларускае вёскі? Толькі ідэолёгі вясковага кулацтва пры савецкай уладзе ў сваіх палітычных контррэволюцыйных мэтах сьвядома заплюшчвалі вочы на гэты процэс распластаваньня сялянства і словамі „працоўны земляроб" імкнуліся прыкрыць свой сапраўдны буржуазна-рэстаўратарскі твар.

Разьвіцьцё капіталізму і хуткая пролетарызацыя сялянства выкідалі з вёскі шмат непатрэбных ёй рабочых рук. І на беларускай вёсцы зьяўляецца вялікая яўная і скрытая перанаселенасьць. Пасьля рэволюцыі 1905 году адбываецца асабліва моцны адліў на фабрыкі і заводы, галоўным-жа чынам у далёкім перасяленьні шукае паратунку сялянства сярэдняе ў Сібір і іншыя часткі імпэрыі, а таксама ідзе адліў і ў далёкую Амэрыку. На Беларусі батракоў і вясковага паўпролетарыяту была вельмі значная колькасьць. Так Бондар і Паніматка вызначаюць колькасьць батракоў на Беларусі перад вайной у 200 тыс.[2], В. Шчарбакоў-жа — у 300 тыс. чалавек[3]. Калі мы возьмем ня толькі сельска-гаспадарчых рабочых, а і сялянства, меўшае кавалак зямлі, але працаваўшае ў экономіі ці адыходзіўшае на старану, напрыклад, на поўдзень, то мусім прызнаць, што больш сапраўднай будзе лічба т. Шчарбакова. Так, калі мы возьмем надзельнае земляўладаньне па статыстыцы 1905 г., то па 5 губ. гаспадарак да 5 дзес. было 56.247. Калі-ж мы возьмем лік бясконных двароў за 1901 і 1912 год, то ўбачым колёсальны рост бясконных гаспадарак і двароў. Усё гэта сьведчыць, што ў XX ст. на Беларусі вельмі хуткім тэмпам пайшла дыфэрэнцыяцыя

[1] Статистика землевладения 1905 г.

[2] Бондар и Паниматка. Сельхоз. Белоруссии на путях социалист. реконст. Сельхоз ГИЗ, Москва, Лен. 1931 г., стар. 7.

[3] Шчарбакоў В. К. Кастрычніцкая рэволюцыя на Беларусі, БДВ, Менск, стар. 9.

сялянства, асабліва-ж пасьля рэволюцыі 1905 году; сталыпіншчына, бязумоўна, гэтаму спрыяла. Вось даныя аб бясконных дварох у абсолютных лічбах:

| Губэрні | 1901 г. | 1912 г. |
|---|---|---|
| Віленская . . . . . . | 17.479 | 44.192 |
| Віцебская . . . . . . | 21.926 | 33.846 |
| Горадзенская . . . . . | 40.986 | 40.840 |
| Менская. . . . . . . | 43.365 | 52.457 |
| Магілеўская . . . . . | 21.556 | 26.098 |
| Усяго . . | 145.312 | 197.433 |

Такім чынам, у 1912 годзе мы маем ужо больш двухсот тысяч батракоў і вясковай беднаты. Ясна, што ў годы вайны працэс дыфэрэнцыяцыі і згаленьня сялянства пайшоў яшчэ хутчэй. Маса сялянскіх гаспадарак бяднела і выходзіла ў рады вясковай беднаты, і нам думаецца, што лічба, паданая т. Шчарбаковым у 300 тыс., зьяўляецца зусім рэальнай, а мо' нават крыху зьменшанай.

У гэтыя часы з беларускай вёскі ідзе масавы адліў у гарады ў шахты, на фабрыкі.

Так, па Магілеўскай губ. было выдана пашпартоў:

| | |
|---|---|
| 1896 г. . . . . | 88.936 |
| 1913 г. . . . . | 106.103 |

Па Віцебскай губ. адыходнікаў было:

| | | |
|---|---|---|
| 1901 г. . . . . | 30.177 | чалавек |
| 1905 г. . . . . | 35.761 | " |
| 1907 г. . . . . | 41.501 | чалавек [1] |

Калі ў першым з паказаных гадоў большасьць была выдана трохмесячных пашпартоў і гадовыя складалі толькі $^1/_5$ частку агульнае колькасьці, то ў 1913 г. гадавых было выдана 91 проц. Па некаторых валасьцёх колькасьць выданых пашпартоў перавышае колькасьць двароў, як, напрыклад, Забялышынскай Клімавіцкага павету, Стара-юркавіцкай, Папоўскай Гомельскага павету. Корэспондэнт Магілеўскага губ. земства піша аб вялікім адыходзе сялянства на шахты і плянтацыі: „От отхода пустеют хозяйства. Молодые уходят, а старикам хоть в рог труби" [2]. Маса сялянства разьвіцьцём капіталізму на вёсцы скідалася ў рады вясковага пролетарыяту, які прагне ў горад на фабрыку, адкуль прыносіць назад у вёску рэволюцыйныя настроі ды ідэі. Губарнатарскія справаздачы ня раз зазначаюць на рост „хуліганства", непаважаньне духавенства і г. д. з боку прыйшоўшай з заработкаў сялянскай моладзі. Настроены па-народніцку корэспондэнт Магілеўскага земства пускаецца ў народніцкія разважаньні аб некарыснасьці адыходу на заработкі і г. д., але мы мусім адзначыць прогрэсыўную ролю адыходаў, рваўшых патрыярхальную захалуснасьць і забітасьць селяніна. Ленін яшчэ ў „Разьвіцьці капіталізму ў Расіі" аб гэтым пісаў:

„Адыход у гарады павышае грамадзянскую асобу селяніна, вызваляе яго ад тэй прорвы патрыярхальных і асабістых адносін залежнасьці і станавасьці, якія такія моцныя па вёсках" [3].

Каб ясьней уявіць сабе тое змаганьне, што разгарнулася між рознымі праплastаваньнямі сялянства на вёсцы і агульным змаганьнем

[1] Дудкоў Д. А. Сталыпінская рэформа ў Віцебскай губ. БАН, 1931 г., стар. 33.
[2] Могилевская губ. в 1913 г., изд. Мог. губ. земства.
[3] Ленін У. І., т. III, стар. выд. 2, 450.

усяго сялянства супроць памешчыцкай экономіі, нам трэба крыху спыніцца на гаспадарцы—як панскай, так і заможна-кулацкай.

Надзвычай важнае пытаньне—гэта пытаньне аб разьвіцьці і капіталізацыі маёнтку на Беларусі. У якіх конкрэтных формах прасякаў капіталізм і які процэс выклікаў ён у памешчыцкім маёнтку? Ці далёка ў сэнсе якасным і колькасным прасунулася капіталізацыя апошняга—гэта вельмі важныя проблемы, якія яшчэ абсолютна ня высьветлены ў беларускай экономіцы, ня гледзячы на цэлы рад прац (Смоліча, Доўнар-Запольскага). У гэтых працах няма нават пастаноўкі пытаньня аб двух кірунках разьвіцьця сельскай гаспадаркі і аб змаганьні гэтых шляхоў, але затое маем цэлы рад глыбака няправільных і шкодных палажэньняў. Так, Доўнар-Запольскі зусім сур'ёзна тлумачыць „об исконных привычках белорусса" да ўласнай зямлі, аб працоўных гаспадарках да 100 дзесяцін г. д.[1]. Між іншым і ЦСУ у сваім зборніку, выданым у 1925 годзе, гаспадаркі ў 50 і 100 дзес. таксама лічыць працоўнымі. Гэта нічым няпрыкрытая кулацкая ўстаноўка, якая знайшла сабе месца ў органе ЦСУ і якая маскуецца словам працоўны. Вось, што пісаў Ленін аб гэтым слове:

„Слова працоўны ня мае ніякага політыка-экономічнага сэнсу і ўкосна ўводзіць у памылку. Яно пазбаўлена сэнсу, бо пры ўсякіх грамадзкіх укладах гаспадаркі дробны земляроб „працуе" і пры рабстве, і пры прыгоньніцтве, і пры капіталізьме. Слова „працоўны" ёсьць пусты выраз, дэклямацыя бяз зьместу, якая захоўвае выгоднае для аднэй толькі буржуазіі *зьмяшэньне* самых розных грамадзкіх укладаў гаспадаркі. Слова „працоўны" ўводзіць у памылку, ашуквае публіку, бо яно *намякае* на адсутнасьць наёмнай працы"[2] (падкрэсьлена Леніным). Капіталізацыя маёнтку, бязумоўна, была, і яе толькі ня хоча бачыць Доўнар-Запольскі. Сапраўды ня можна-ж па аднэй Несьвіскай экономіі князя Радзівіла, ды ўласна і не экономіі, а па звычках і традыцыях панскага дому, рабіць вывад аб гаспадарцы ўсіх паноў. З памешчыцкай гаспадаркай адбываўся досыць складаны процэс. Рэволюцыя 1905 году вельмі напалохала паноў і яны выкінулі на рынак досыць многа зямлі. Але ні ў якім разе нельга думаць, што дваранства гэта нешта бяззубае, якое не вядзе і не ўсьведамляе сваіх клясавых інтарэсаў, якраз наадварот,—капіталізаваны маёнтак памешчыка моцна наступае на сялянскія масы, сталыпінская рэформа імкнецца правесьці ломку старога землеўладаньня па-памешчыцку. Політыка Сталыпіна, як гэта было паказана ў ацэнцы яе Леніным, была наскрозь дваранскай. Ня трэба забывацца, што рэакцыйным урадам былі даны ўсе магчымасьці, каб закаваць пры соцыяльна-экономічных умовах, якія зьмяніліся, дваранскае землеўладаньне—шырокі крэдыт, надзвычайна выгодны продаж зямлі,—аб чым вельмі клапаціўся Сялянскі банк, непамерна ўздуваючы цэны і г. д. Але экономічны процэс разьвіваўся не на карысьць прыгоньнікам. Капіталізм вельмі вымагаў ломкі пасьледкаў прыгоньніцтва, і дваранства траціць свае землі. 90-ыя годы былі вельмі няспрыяючымі для разьвіцьця сельскай гаспадаркі і для капіталізацыі прыгоньніцкага маёнтку, з прычыны аграрнага крызісу, захапіўшага ў свае абцугі Эўропу і былую Расію. У гэты час мы маем узмоцнены продаж маёнткаў памешчыкамі. Разьвёртваецца спэкуляцыя зямлёй, а дзеля таго, што ў так званым „Северо-западном крае" ня ўсе катэгорыі

[1] Довнар-Запольский—„Народное хозяйство" (за дакладнасьць статыс. у Д.-З. не адказваем).
[2] Ленін У. І., т. XVII, вып. 2, стар. 586.

асоб маглі прадаваць і купляць зямлю, пры заключэньні зьдзелак на зямлю шырока ўжываецца сыстэма падстаўных асоб (яўрэйскія капіталісты афіцыяльна не маглі купляць зямлю, а польскія памешчыкі набываць зямлю ў так званым „Заходнім краі"). Сельска-гаспадарчы крызіс моцна выцяў па памешчыцкай гаспадарцы. Так, магілеўскі губарнатар у справаздачы за 1894 год піша:

„К причине спекуляции имениями необходимо отнести и сельско-хозяйственный кризис посьледнего времени, вынуждающий нередко помещиков продавать имения... количество пахотной земли у землевладельцев до сих пор крайне незначительно и составляет едва пятую часть общей площади частного землевладения" [1].

Гэта характарыстыка, бязумоўна, правільная адносна маёнткаў з фэўдальна-прыгоньніцкімі перажыткамі, з адсталай тэхнікай, — тых маёнткаў, якія амаль цалкам жылі з адработкаў. Крызіс 80—90-х гг. асабліва моцна якраз па іх і выцяў. Ён меней закрануў капіталізаваныя маёнткі і гаспадарку вясковай буржуазіі, бо апошнія не вялі збожжавай гаспадаркі, а ў большасьці малочную з вельмі значнымі засевамі бульбы для бравароў.

Але крызіс прайшоў з 1897 году, цэны на сусьветным рынку на збожжа зноў пайшлі ўгору. Рэволюцыя 1905 году страшэнна напалохала памешчыкаў, і зараз-жа пасьля рэволюцыі наглядаюцца ўзмоцненыя прапановы зямлі панамі. Але ня толькі ўсё гэта, — сам экономічны процэс разьвіцьця капіталізму, які выкідаў ня здолеўшага прыстасавацца да рынку і да новых умоў памешчыка з сельскай гаспадаркі. Мы маем досыць частыя продажы маёнткаў з таргоў. Той ці іншы памешчык, нахапаўшы крэдытаў, заклаўшы і паразаклаўшы маёнтак, урэшце, даходзіў да поўнага банкруцтва і тады яго маёнтак ішоў з малатка. Возьмем пару прыкладаў. У 1894 годзе быў апісаны маёнтак Брызьленнае Менскай губ. пана Іосіфа Валовіча; гэты маёнтак налічваў 1.511,21 дзес. зямлі. На гэтым маёнтку аказваліся наступныя даўгі:

| | | |
|---|---|---|
| Маскоўскаму зямельнаму банку | 29.400 руб. | |
| Паручніку Ал. Гасу | 20.000+5.800 руб. | процантаў |
| Нядоімак | 170 руб. 32½ кап. | |
| Нарушэвічу | 6.000 руб. | |
| Г. Валовічу | 5.250 руб. | |
| фон Ромер | 2.400 руб. | |
| Іосіфу Валадкевічу | 8.400 руб. | |
| Арэму | 280 руб. | |
| М. Валовічу | 2.200 руб. | |
| Усяго | 79.932½ руб. | |

Маёнтак-жа быў прадаены з таргоў за 63.065 руб. і замацаваны за дваранінам Кузьміным. Пры опісу маемасьці выявілася, што ўласная гаспадарка маёнтку надзвычай мізэрная. На 1.511 дзес. зямлі жывы інвэнтар маёнтку складаўся: з 24 кароў, 2 бугаёў, 13 быкоў, 1 жарабца і некалькіх коняй [2].

У маёнтку Крошын, які належыў Сьвятаполку Завадоўскаму ў 1895 годзе, лічылася 1.897 дзес. зямлі. У ім няма ніякіх фабрыч-

[1] Л. О. Ц. И. А. Депар. общ. дел М. В. Д., д. № 151—1895 г.
[2] М. Г. А. Акр. суд. Гражд. св. 398, № 27.992

ных і іншых прадпрыемстваў, няма таксама рабочай жывёлы і сельскагаспадарчых прылад, ёсьць толькі сад адзін у 3 маргі і другі пры фальварку Стары Двор у 24 маргі. Маёнтак быў закладзены ў Віленскім дваранскім банку, там-жа былі ўзяты і кароткатэрміновыя пазыкі. З адносьніку банку ад 1 студзеня 1896 году відаць, што доўг банку быў наступны: Дваранскаму банку 119.377 руб. 20 к., нядоімак, пені і выдаткаў 13.353 руб. 24 кап. усяго банку 133.730 руб. 44 кап.

| | | |
|---|---|---|
| Нядоімак па падатках | 737 руб. | 87¼ кап. |
| Залману Бусэлю | 1.589 „ | 28 „ |
| Ісаку Самсонавічу | 530 „ | |
| Науму Шулякоўскаму | 3.598 „ | 14 „ |
| Усяго | 140.323 р. | 73¼ кап. |

Маёнтак Крошын быў вызначаны на продаж з таргоў, але справа з ім вельмі зацягнулася, памешчык ужываў усе захады, каб выратаваць свой маёнтак, але, бязумоўна, выплаціць такую вялікую суму грошай ня мог.

Такім чынам, ня толькі ў годы крызісу і ў годы рэволюцыі мы маем банкруцтва маёнткаў, і ў годы высокай коньюнктуры банкруцтва маёнткаў і даўгі на іх усё-ткі былі вялізныя. Панскія лятыфундыі ляжалі мёртвым грузам на ўсім грамадзкім разьвіцьці, і сам-жа эканомічны процэс паступова вырываў глебу з-пад ног памешчыкаў. Так, у 1912 годзе судовы прыстаў Байкоў апісаў маёнтак Людзіневічы ў Мазырскім павеце, Менскай губ., належаўшы памешчыцы М. Крывашэінай за доўг яе ў 75.700 руб. з 9 проц. вучонаму аграному Станіславу Млынарскаму. Зразумела, што гэтыя дзесяткі тысяч рублёў былі ўзяты пад заклад часткі маёнткаў, у якой было 6.000 дзес. Але ўвесь маёнтак Людзіневічы налічаў 20.532 дзес. зямлі. Пры опісу выявілася, што даны маёнтак „обременен“ вялікімі даўгамі. Памешчыца Крывашэіна Віленскаму аддзяленьню дваранскага банку была вінна 36.400 руб., прычым на 1 мая 1912 году заставалася капітальнага доўгу 34.809 руб. 60 кап. Нядоімак 779 руб. 50 кап., страхавой прэміі 107 руб. 31 кап., а ўсяго па банку 35.696 руб. 41 кап. Мала гэтага, пад гэту-ж частку маёнтку Крывашэіна ў Волска-Камскім банку пазычыла 25.000 руб. Але і гэтага мала, урэшце з гэтай-жа самай зямлі памешчыца прадала сялянам 4.000 дзес. вучасткамі ад 5 да 46 дзес. Ня гледзячы на такія вялікія крэдыты, Крывашэіна заблыталася і частка маёнтку ў 6.000 дзес. была прадана. Выявілася, што маёнтак гэты быў „инструкционный“ і яго купіў чыноўнік „Главного управления земледелия и землеустройства“, Коцэбу за 110.000 руб. бяз усякіх таргоў з асабістага дазволу зам. міністра Рыттіха [1].

Вось прыклады да агульнай табліцы панскай запазычанасьці па маёнтках розным зямельным банкам. Гэтая запазычанасьць і адбівала рэальны процэс, з аднаго боку, капіталізацыі панскага маёнтку, з другога-ж боку, гэта паказвала, што лятыфундыі, ня здолеўшыя прыстасавацца, на гледзячы на ўсё падтрыманьне іх урадам прыгоньнікаў, усё-ткі гінулі. Запазычанасьць дваранскага земляўладаньня вельмі расла. Аб гэтым сьведчаць наступныя даныя:

[1] М. Г. А. Фонд гражданского суда, справа № 27 за 1913 г.

| Губэрні | % закладзенай зямлі ўсёй прыватнай уласнасьці | | Доўг на 1 дзесяціну | |
|---|---|---|---|---|
| | 1894 г. | 1912 г. | 1894 г. | 1912 г. |
| Смаленская . . . . . . . | 31 | 53 | 18,04 | 39 |
| Віцебская . . . . . . . . | 47,3 | 59 | 10,35 | 32 |
| Віленская . . . . . . . . | 44,7 | 66 | 20,76 | 33 |
| Менская . . . . . . . . | 58 | 64 | 9,24 | 22 |
| Магілеўская . . . . . . . | 47,8 | 60 | 14,95 | 36 |
| Горадзенская . . . . . . . | 53 | 68 | 24,40 | 42 |

Такім чынам запазычанасьць значна вырасла ў XX сталецьці: ад паловы да $^{2}/_{3}$ усёй прыватна-ўласьніцкай зямлі было ў закладзе і гэта ў годы спрыяючай рыначнай коньюнктуры.

Гэта лепшы паказьнік, з аднаго боку, адсталасьці лятыфундый, якія часамі жылі толькі за кошт эксплёатацыі ўсялякіх прыгоньніцкіх перажыткаў, з другога-ж боку, гэта паказьнік і капіталізацыі маёнтку,— браліся крэдыты і, каб паставіць гаспадарку па-капіталістычнаму, рабіліся значныя ўкладаньні капіталу ў сельскую гаспадарку. Няправільна думка Доўнар-Запольскага, што на Беларусі ня было высока-капіталізаваных маёнткаў. Гэта патрэбна Д.-З., каб давесьці, што толькі кулацтва і буржуазія можа як сьлед паставіць і організаваць па-капіталістычнаму гаспадарку. З другога боку, няправільна і палажэньне Пічэты Ў. І., што беларускі аграры паставіў гаспадарку па-капіталістычнаму [1].

Бязумоўна, ня ўсе маглі прыстасавацца і наладзіць высока-капіталістычную гаспадарку, ня трэба забывацца на шматлікія перажыткі прыгоньніцтва. Нельга разглядаць панскую гаспадарку як нешта адзінае, монолітнае, што знаходзіцца ў адным і тым-же стане. Тут патрэбны дыфэрэнцыяваны падыход. Зразумела, што былі панскія гаспадаркі высока-капіталістычныя, а яшчэ больш было такіх, дзе скрыжоўваліся элемэнты капіталістычныя з абломкамі фэўдалізму.

Да самай рэволюцыі Кастрычніка праіснавалі гэтыя перажыткі і толькі яна (Кастрычнікавая рэволюцыя) жалезнай мятлой зьмяла насьледкі прыгоньніцкіх перажыткаў, разам пахавала і ўладу буржуазіі. Капіталістычныя адносіны яшчэ задоўга да рэволюцыі 1905 г. панавалі ў сельскай гаспадарцы на Беларусі, і толькі перажыткі прыгоньніцтва затрымалі разьвіцьцё капіталізму, надзвычайна ўскладняючы процэс разьвіцьця.

Была вельмі на Беларусі разьвіта і пашырана арэнда.

Што-ж станавіла сабою гэта арэнда? Мы ўжо падавалі тут „скаргі“ губарнатара Пільца, што большасьць маёнткаў знаходзіцца ў закладзе і арэндзе, што самі памешчыкі не вядуць гаспадаркі. Мы мусім адзначыць, што арэнда маёнткаў была ўсякага роду—ад тыпова-капіталістычнай да простага перажытку фэўдалізму. Падамо некалькі прыкла-

[1] Пічэта Ў. І. Клясавыя супярэчнасьці напярэдадні рэволюцыі. Зборнік „Белар усь“ 1924 г., стар. 37.

даў. У 1894 годзе памешчык Мечыслаў Рассудоўскі аддаў маёнтак Ванькоўшчыну, які знаходзіўся ў Слуцкім павеце, у арэнду двараніну Булату[1]. Увесь гэты маёнтак налічаў 1.000 дзес. зямлі, арэнда на адзін год. Нам цікава адзначыць, што арэндным контрактам адбіваюцца сабой тыя перажыткі фэўдалізму, якія былі ў даным маёнтку. Паводле контракту Булат павінен быў унесьці арэнды 1.800 руб., прычым адразу Рассудоўскі атрымліваў 1.200 руб. Ясна, што пан аддаваў зямлю ў арэнду таму, што фінансавыя справы яго былі далёка не ў парадку, што ён заблытаўся ў даўгох, выплаціць якія быў ня ў сілах. Адным з пунктаў контракту арандатару дазваляецца па частках і на адработкі здаваць сенажаці. Арандатар мае права сеяць лёну ня больш як 6 маргоў. Арандатар абавязваецца, што ня будзе прадаваць сена, саломы і іншых кармовых продуктаў, а таксама мусіць даваць мякіну і палову для сьвіней уласьніка. Але і гэта ня вератавала маёнтак ад продажу, ён быў прызначаны на таргі за няўплату нейкай Ларысе Сташэўскай 10.000 руб.,—сумы, пад якую маёнтак быў закладзены адзначанай асобе. Выявілася, што гэты маёнтак быў закладзены і ў Віленскім пазямельным банку, доўг на якім быў роўны 14.950 руб. 82 кап. і апрача гэтага розным крэдыторам памешчык быў вінен 51.919 руб. і 77 кап.

Бясспрэчна, сельска-гаспадарчы крызіс спрыяў ажыўленьню і рэстаўрацыі ўсякага роду перажыткаў фэўдальнага часу, але і ў годы спрыяючай рыначнай коньюнктуры мы наглядаем па сутнасьці тое самае. Гэта значыць, што сам памешчык і яго земляўладаньне само зрабілася перажыткам і прыгодна было толькі на злом. Так, у 1902 г. памешчык Навагрудзкага павету Леў Сакалоўскі аддаў „почетному гражданину“ Хруцкаму маёнтак Вержэйшчыну з фольваркам на 12 год[2], прычым арэндная сума 1.300 руб. мусіла ўносіцца не памешчыку, а два разы на год у Віленскі зямельны банк, дзе быў закладзены даны маёнтак. Такім чынам, арэндатар мусіў выплачваць тэрміновыя плацяжы і страхавыя прэміі. Цікава падаць некалькі пунктаў данага контракту. Пунктам другім арандатар абавязваецца весьці гаспадарку па трохпольнай сыстэме. Як і ў гэтым годзе засеў будзе рабіцца часткова сялянамі і ў суполку. Забараняецца продаж з маёнтку сена, саломы. Уласьнік маёнтку пакідае за сабой жылы дом, фруктовы сад і некалькі халодных будынкаў. Такім чынам, мы бачым, што фігура земляўласьніка абсолютна лішняя і, да таго, шкодная, бо ён затрымлівае процэс разьвіцьця больш прогрэсыўных форм гаспадараньня і сам абсолютна ніякай гаспадаркі не вядзе, а наадварот, увекавечвае ўсякія перажыткі прыгону. Пасьля рэволюцыі 1905 году даны маёнтак аддаецца ўжо „селяніну“ Сёмуху вярыцелем памешчыка Сакалоўскага Левітам. І цікава адзначыць, што тут ужо даецца поўная свабода гаспадараньня кулаку Сёмуху: ён можа весьці гаспадарку такой сыстэмай, якой захоча, можа прадаваць сена, салому, пасьвіць жывёлу па ўсяму маёнтку і г. д. Але ўсё-ж-такі арандатар Сёмуха абавязваецца выканаць дагаворы, заключаныя Левітам з сялянамі бліжэйшых вёсак на аддаванія ім на долю засевы.

Мы сьмела можам сказаць, што частка памешчыкаў гаспадарыла якраз вось такім спосабам; заблытаўшыся ў вялізных даўгох, яны прымушаны былі аддаваць зямлю ў арэнду, каб адцягнуць мінуту краху. Яны выкарыстоўваюць усякія перажыткі паншчыны, яны здавалі землі

[1] М. Г. А. Фонд Мен. Акр. Суда. Справа № 3314—1859 г.
[2] М. Г. А. Там-жа, № 33. 1908 г.

вакольным сялянам з трэцяга, чацьвертага снопу, а таксама і сенажац і, такім чынам, як павукі смакталі сокі з сялянскай масы. У. І. Ленін у „Разьвіцьці капіталізму ў Расіі“ Менскую і Віленскую губэрні залічаў да гаспадарак з капіталістычнай сыстэмай, а Магілеўскую і Віцебскую— да мяшаных. Ясна, што ў XX сталецьці капіталізм яшчэ больш глыбока захапіў сельскую гаспадарку. Вельмі пашыраецца капіталістычная арэнда, на кожным кроку сустракаецца „немец“, які, узяўшы зямлю ў арэнду, організуе гаспадарку за ўласны кошт. Але, бязумоўна, поплеч існуюць усякага роду і перажыткі фэўдалізму. Ніякая статыстыка ня ўлічала панскае гаспадаркі, канторы з кнігамі і документамі амаль цалкам зьнішчаны ў часы рэволюцыі. Што гэта так, што капіталістычная арэнда была пашырана, можна праілюстраваць такімі-сякімі данымі. Так, паводле выбарчых сьпісаў у земскую ўправу, у 1911 годзе маёнткаў у Менскай губ., меўшых прадпрыемствы, было 91. Разьмяркоўваюцца яны так:

Па Менскаму пав.—60
„ Навагрудзкаму пав.—30
„ Барысаўскаму пав.—1

Можа здацца дзіўным, чаму так мала, калі адных сьпірытусавых бравароў у 1911 годзе ў Менскай губ. было 229 ды піўных 151. Справа ў тым, што ў гэтыя сьпісы трапілі толькі прадпрыемствы тых уласьнікаў маёнткаў, якія самі вялі гаспадарку і мелі прадпрыемствы. Падамо даныя[1], з якіх можна зрабіць досыць цікавыя вывады.

| Кошт прадпрыемства | Колькі маёнткаў | Сума | Дзес. зямлі | Кошт аднаго прадпрыемства ў сярэднім | Дзес. зямлі на 1 маёнт. |
|---|---|---|---|---|---|
| Да 5 тыс. руб. . . | 40 | 83.005 | 21.958 | 2.075 | 548 |
| Ад 5 да 25 тыс. руб. | 33 | 465.539 | 99.067 | 14.103 | 3.002 |
| Ад 25 да 50 тыс. р. | 8 | 303.177 | 10.980 | 37.897 | 1.362 |
| 50 і больш. . . . | 10 | 833.971 | 48.820 | 83.397 | 4.882 |
| Усяго . . | 91 | 1.685.892 | 180.825 | 18.526 | 1.987 |

Па-першае, найбольш капіталізаваны маёнткі ад 200 да 500 дзесяцін. Гэтае палажэньне даўно ўстаноўлена і знаходзіць сабе падмацаваньне яшчэ і тут. У значных лятыфундыях хоць і знаходзім буйныя прадпрыемствы, але затое радзей. Найбольш прадпрыемстваў у Менскім павеце—60, паводле сьпісаў выбаршчыкаў усяго маёнткаў у ім налічваецца.

| Групы | Кольк. маёнткаў | Дзесяцін зямлі |
|---|---|---|
| Ад 15 — 50 дзес. . . . . | 1.358 | 34.771½ |
| „ 50 да 200 „ . . . . | 344 | 33.071¾ |
| „ 200 „ 500 „ . . . . | 94 | 28.897 |
| „ 500 „ 1.000 „ . . . . | 45 | 31.373¼ |
| „ 1.000 і больш . . . . . | 34 | 134.919 |
| Усяго . . . . | 1.875 | 263.032½ |

[1] Выбарч. сьпісы Зем. Управ. на 1911 г.

У Менскім павеце маёнткаў, маючых звыш 50 дзесяцін, 517, а прадпрыемстваў яны маюць усяго 60. Значыць, пераважная большасьць бравароў была ў руках ня ўласьнікаў маёнткаў, але арандатараў і капіталістаў. Зразумела, цэлы рад лятыфундый зусім ня меў уласнай гаспадаркі, гэта пераважна закладзеныя, запушчаныя маёнткі.

Каб яшчэ раз праілюстраваць выстаўленае палажэньне і паказаць на суадносіны між капіталізаванымі маёнткамі і лятыфундыямі, возьмем Менскую губ. у 1917 годзе і ў межах гэтага году паглядзімо, як разьмяркоўваліся маёнткі і ўжыткоўнасьць у іх. Па 6 паветах Менскай губ. было:

| Групы | Кольк. улад. | % % | У іх дзес. зямлі | % %[1] |
|---|---|---|---|---|
| Да 20 дзес. . . . . | 6.844 | 54,3 | 82.523.2 | 2,8 |
| Ад 20 да 100 . . . . | 4.102 | 32,5 | 172.525 | 5,8 |
| „ 100 „ 500 . . . . | 991 | 7,8 | 259.796 | 6,5 |
| „ 500 і больш . . . | 672 | 5,4 | 2.484.470 | 82,9 |
| Усяго . . . | — | 100 | — | 100 |

Зірнем цяпер на разьмеркаваньне ўжыткоўнасьцяў па маёнтках рознай велічыні ў адносных лічбах.

| Групы | Сядзібы | Ральлі | Лугу | Лесу | Кусьця | Выгану | Неразьмерк. | Няўжыткі | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ад 20 да 100 . . . . | 2 | 37,6 | 14,9 | 20,6 | 0,4 | 3,3 | 14,2 | 6,9 | 100 |
| „ 100 „ 400 . . . . | 1,5 | 35,3 | 16,1 | 28,9 | 1,3 | 5,8 | 4,2 | 7,2 | 100 |
| „ 500 і больш . . . | 0,4 | 13,1 | 13,3 | 53,3 | 2,4 | 3,3 | 2,8 | 11,4 | 100 |

Досыць зірнуць на паданае ў табліцах, каб прыйсьці да зусім пэўных вывадаў. Па-першае, у Менскай губ., дый у іншых, ня глядзячы на ўвесь мобілізацыйны процэс, *пануючай застаецца лятыфундыя*—гэта, галоўным чынам, лясныя маёнткі (53,3 проц). Гэтыя маёнткі менш за ўсё маюць сядзіб і найбольшы процант няўжыткоўнасьці кусьця. Такім чынам, маёнткі да 500 дзесяцін маюць ледзь не ўтрая больш пахаці, 35,3 проц. усіх ужыткоўнасьцяў. Але затое на палову маюць менш лесу і куды менш усякіх няўжыткоўнасьцяў. Памешчыцкае земляўладаньне ў Менскай губэрні панавала да самай рэволюцыі, і яно вось і душыла сялянскія масы і затрымлівала капіталістычнае разьвіцьцё,—ня так як гэта думае Смоліч, што расійскі памешчык душыў беларускага і польскага памешчыка[2],—вывад, які выкрывае буржуазную аполёгетыку гэтага аўтара. Пасьля рэволюцыі 1905 г. памешчык польскі, расійскі і беларускі знайшлі супольную мову, пад пагрозай нарастаўшай новай рэволюцыі. Усе яны з буржуазіяй склалі адзін фронт контррэволюцыі. Дый гэта няправільна, і фактычна пасьля 1905 году адпалі ўсе абмежаваньні царскай уладай польскага земляўладаньня, і рэволюцыю душылі аднолькава і беларускі і польскі і расійскі пан,—так аднагодна, як люта яны эксплёатавалі батракоў і галоднага селяніна.

[1] Стат. штогоднік ЦСУ 1924—1925 гг. Выд. ЦСУБ, Менск 1925, стар. 91.
[2] Зборнік „Беларусь", 1924 г. Смоліч—„Экономічнае становішча Беларусі" і г. д.

Пасьля рэволюцыі 1905 году адбываўся хуткі процэс капіталізацыі панскага маёнтку. Каб яшчэ больш адцяніць той пераплёт капіталістычных элемэнтаў з перажыткамі прыгоньніцтва, спынімся на адным маёнтку „Яніна", Бабруйскага павету—Марыі Сыгізмундаўны Кэльчэўскай, апісаньне якога маем за 1915 г. [1]. Увесь маёнтак, прынамсі ў 1889 г., налічваў 2.002 дзесяціны, цяпер-жа двор выкарыстоўвае 580 дзесяцін, якія разьмяркоўваюцца наступным чынам:

| | | |
|---|---|---|
| Парк | 7 | дзес. |
| Сады | 18 | „ |
| Гароды | 7 | „ |
| Пад жытам | 102 | „ |
| „ аўсом | 105 | „ |
| „ гарохам і вікай | 40 | „ |
| „ бульбай | 45 | „ |
| „ ячменем | 8 | „ |
| „ канюшынай | 45 | „ |
| „ сенажацямі | 187 | „ |
| „ сенажатнымі балотамі | 16 | „ |
| | 580 | дзес. |

Ужо з гэтага можна зрабіць вывад, што гаспадарка вядзецца інтэнсыўная, жыта не зьяўляецца абсолютна пануючай культурай, пад кармовымі травамі плошча надта вялікая, вядзецца прамысловае садоўніцтва і гародніцтва. Ясна, што заведзены шматпольны севазварот, і сельскагаспадарчым інвэнтаром, мёртвым і жывым маёнтак забясьпечаны добра. Жывы інвэнтар:

| | |
|---|---|
| Коняй | 52 |
| Кароў галяндэр. пароды | 218 |
| Авечак | 14 |
| Сьвіней | 15 |

Адсюль відаць, што ў маёнтку Яніна добра пастаўлена малочная гаспадарка. Аб гэтым сьведчыць яшчэ і патрэбны для гэтага інвэнтар, быўшы ў маёнтку: сэпаратар, маслабойка і ўвесь патрэбны пасудак для малочнай гаспадаркі.

Але самае важнае тое, што і тэхнічную базу маёнтак мае досыць значную. Мёртвым інвэнтаром і ўсякімі сельска-гаспадарчымі машынамі ён таксама добра забясьпечаны. Вось пералічэньне мёртвага інвэнтару і сельска-гаспадарчых машын:

| | |
|---|---|
| Звычайных плугоў | 16 |
| Двухлямешных плугоў | 7 |
| Барон жалезных | 21 |
| Акучнікаў | 10 |
| Жатак | 4 |
| Касарак | 3 |
| Бульбакапалак | 1 |
| Конных грабляў | 2 |
| Лёкомобіляў (паравая малатарня) | 2 |
| Веялак | 4 |
| Сартовак | 4 |
| Саламарэзак | 1 |
| Жмыхадрабілак | 1 |
| Мыйка для бульбы | 1 |
| Брычак | 9 |
| Фур | 17 |
| Выязных санак | 5 |
| Звычайных санак | 20 |

Зразумела, у маёнтку маюцца ўсе патрэбныя як сельска-гаспадарчыя, так і жыльлёвыя будынкі, аранжарэі і г. д. Адным словам, перад намі высока-капіталізаваны маёнтак; шкада, што мы ня ведаем нічога аб рабочай сіле—колькі батракоў працавала і які было іх становішча, хаця ніжэй мы прывядзем даныя па другім маёнткам. А таксама мы ня ведаем, у якія формы адлівалася тут эксплёатацыя навакольнага сялянства. У нас ёсьць матар'ял і па другіх маёнтках Менскай і іншых губэрань; асабліва высока-капіталізаваныя маёнткі былі ў Віленскай губэрні, а таксама і ў Менскай і Магілеўскай. Зразумела, што гэты матар'ял не дае вестак аб тых перажытках прыгоньніцтва, якія існавалі ў тэй ці іншай форме амаль у кожным маёнтку.

[1] Мен. Гіст. Арх. Ацэначна-юрыдычная камісія. Справа за 1915 г.

Уся маемасьць прыведзенага маёнтку была ацэнена ў 1915 годзе ў 233.568 рублёў. Але ёсьць маёнткі і з большай сумай ацэнкі. Мы мусім адзначыць, што гэтыя ацэнкі, зразумела, зроблены па ўздутым цэнам, а мажліва, што і ў апісаньні тое-сёе дадана для павялічэньня сумы ацэнкі.

Побач з найноўшымі сельска-гаспадарчымі машынамі існуе самая дзікая эксплёатацыя па маёнткам. Вельмі часта наймаюць на працу абяцаючы „залатыя горы", а потым ставяць у немагчымыя ўмовы працы. Напрыклад, у маёнтку Сеньніца пад Менскам гаспадарку вядзе сам пан, але, відаць, умовы працы батракоў былі немагчымымі, і да гэтага пана не жадаліісьці на работу. Прыказчык памешчыка Турчынскага ў Рагачэўскім павеце Магілеўскай губ. наняў дзесяць дзяўчат на працу,—іх, відаць, проста ашукалі, наабяцалі вельмі многа і яны падпісалі кабальную ўмову. Іх эксплёатавалі самым бязьлітасным спосабам. Якімсьці чынам ім удалося падаць скаргу на пана Турчынскага менскаму губарнатару. Першы раз за такую спробу яны былі зьбіты пад горадам нагайкамі, і пан Турчынскі іх вярнуў назад. Але ўсё-такі заява іх трапіла ў губарнатарскую канцылярыю. З гэтай скаргі відаць, што наймаючы дзяўчат, ім абяцалі заплаціць за 7 месяцаў па 50 рублёў, даваць харчы, памяшканьне для адпачынку, мыла для бялізны і г. д. На справе аказалася, што іх прымушалі працаваць ад 4 гадзін раніцы да позьняга вечара, не давалі перапынку на абед, памяшканьне было настолькі цеснае, што нельга было павярнуцца, ня было часу памыць бялізну і г. д. Чым, скажэце, гэты дагавор—а ў ім так і сказана: працаваць з усходу да заходу сонца—розьніцца ад такога-ж пункту беларускіх панскіх інвэнтароў XVII стагодзьдзя [1]?

Як тыповую ілюстрацыю цікава прадставіць адну фігуру юнкера, надзвычайна колёрытную—Вайніловіча Густава; маёнтак яго Гулевічы знаходзіўся ў Слуцкім павеце. У 1913 годзе пан скардзіўся губарнатару, што прыстаў не абараняе яго ад сялян, што ў яго маёнтку адбываецца аграрны рух і што ён не адказвае за тое, што яго застрэляць альбо ён застрэліць каго. Земскі начальнік дае гэтаму пану такую характарыстыку:

„Бывший почетный мировой судья Густав Львович Вайнилович, человек весьма невоздержанный, *с крестьянами не признает никакой другой расправы кроме нагайки и угрозы револьвером,* даже в том случае, если кто является к нему за получением следуемой с него платы за работу или по векселю, никому долгов платить не желает... *Наём людей производит по письменным условиям, причем они так составлены исключительно в интересах его, чтобы никому не платить*" (курсіў мой—К. К.).

Маёнтак Гулевічы ўпіраецца ў самую вёску Заняведамку з боку сяліб і абкружае яе цесным колцам з усіх бакоў так, што сялянскі выган знаходзіцца ў сярэдзіне маёнтку. Ясна, што бываюць патравы, і на падставе гэтага прыстаў Маторын (якога, зразумела, ні ў якім выпадку ня можам западозрыць у спачуваньні сялянству) піша:

„Если бывают случаи потрав, то горе тому пастуху, который пасет скот, он должен или спасаться бегством, или его ждет жестокая расправа".

Прыстаў прыводзіць прыклад—у жніўні месяцы панам быў зьбіты да няпрытомнасьці 8-гадовы хлопчык Якаў Паляшук, і Маторын заўважае:

[1] Мен. Гіст. Арх. Канц. губ-ра № 613, 1913 г.

„Вайнилович еще жалуется на массовое нападение со стороны крестьян деревни Заневедомки, этих, по истине, несчастных жертв *подлого пана* (падкрэсьлена сінім алоўкам у канцылярыі губарнатара). Когда он проезжает по деревне в свой фольварок, то все прячутся, зная сумазбродный характер этого самодура, почему-то именующего себя „русским офицером“ и ездившего вооруженным шашкою, револьвером и нагайкой“ [1].

Фігура даволі характарная, і характарыстыка дана вельмі яскравая, каб што-небудзь да яе дадаваць. Капіталізм у сельскай гаспадарцы нішчыць дабрабыт памешчыка, і вось пан-прыгонщчык усімі мерамі імкнецца ўтрымацца на глебе, якая ўцякае ў яго з-пад ног. Адсюль самыя рознастайныя формы эксплёатацыі батракоў і навакольнага сялянства. Такім чынам, мы маем надзвычайны пераплёт капіталістычных элемэнтаў з перажыткамі прыгоньніцтва. Усё гэта клалася вялікім цяжарам на бядняцка-серадняцкую частку сялянства, становішча якой было нясьцерпным. Ленін у артыкуле „Да пытаньня аб каштарысе Мін. Земляроб.“ у 1914 годзе аб перажытках пісаў наступнае:

„Гэты журнал („Русская Мысль“—К. К.) у выглядзе выключэньня сказаў праўду і прывёў даныя, дасканалыя даныя аб распаўсюджанасьці ў Расіі такіх зьяў, як *спольшчына і зімовая наёмка.* І колькі-ж сялян знаходзіцца ў гэтым прыгонным, кабальным, рабскім становішчы?“ (Цытата з журналу). „Па мясцовым весткам у паўдзённа-заходнім раёне па некаторым даным „абавязаных“ двароў налічвалася к *вясьне* 1913 году... да 48 проц., па Магілеўскай губэрні—да 52 проц., па Чарнігаўскай—да 56 проц.!“

„Заўважце: гэта гаворыцца аб вясьне 1913 году! Гэта пасьля ўраджаю 1912 году! Гэта ў часе тых надзвычайных быццам-бы посьпехаў!“ [2] (Курсіў і клічнікі Леніна—К.К.). Памешчык эксплёатаваў сялянства, трымаў яго ў кабале, дзякуючы перажыткам фэўдалізму, якія былі ўзаконены рэформай 1861 году. Кабальная арэнда зямлі, спольшчына—былі вельмі пашыранай зьявай на Беларусі, прычым апошняе носіць характар перажытку прыгону. Так Ленін, крытыкуючы Валынскага за яго артыкул, падкрэсьлівае спольныя засевы сялян пры параўнаньні з пасевамі на ўласнай зямлі, „яны складаюць 21% у цэнтральных губэрнях, 42% у прыазёрных, 68% у *паўночна-заходніх!* А спольныя пакосы—50% у цэнтральных і 110—185 проц. прыазёрных, заволскіх і паўночна-заходніх!“ (Чытай—беларускіх. Падкрэсьлена мною—К. К.) [3].

Гэткім чынам на Беларусі асабліва была пашырана спольшчына з трэцяга снопу, з чацьвертага і г. д.; аб сенажацях і гаварыць ня прыходзіцца: пры лютым зямельным голадзе літаральна кожная вёска арэндавала сенажаці, выганы і прытым на самых кабальных умовах. Гэтыя формы арэнды ёсьць нішто іншае, як простыя перажыткі паншчыны. Ленін у тым-жа артыкуле цытуе названы журнал:

„У некаторых выпадках (у Менскай і Чарнігаўскай губэрнях у асаблівасьці), апрача аплаты зямлі паловай ураджаю, а сенажаці дзьвума трацінамі, спольшчык *абавязваецца 1-2 тыднямі бясплатнай працы ў экономіі, часьцей за ўсё з канём ці з падлеткам*“. Ленін далей заўважае: „Ці-ж гэта ня чысьцейшая паншчына, ці-ж гэта

[1] Мен. Гіст. Арх. Канц. губ-ра № 613, 1913 г.
[2] Ленін У. І., т. XVII, выд. 2, стар. 396.
[3] Ленін У. І., т. XVII, выд. 2, стар. 397.

не старажытнае прыгоннае гаспадараньне?"[1]. (Падкрэсьлена Ленiным—К. К.)

Аднэй з прычын аграрных хваляваньняў на Беларусi ў некаторых мясцох была кабальная арэнда. Так, 2 сьнежня 1905 году ў экономiю братоў Сьвiда—Флёрыяна i Станiслава—зьявiўся натоўп сялян-арандатараў у 30—40 чалавек у iх маёнтак Главiна Барысаўскага павету. Уварваўшыся ў дом, арандатары патрабавалi выдачы iм назад контрактаў. У лiстападзе 1905 году ў маёнтку Ваньковiча таксама зьявiўся натоўп арандатараў i патрабаваў назад контракты i некаторыя з арандатараў-сялян зараз-жа iх спалiлi. Акруговы суд, якi судзiў сялян-арандатараў памешчыка Сьвiды, мусiў пераглядзець контракты i прызнаў, што „Контракты были крайне стеснительны для крестьян"[2]. Адзiн з падсудных — Сацукевiч—у сваiх паказаньнях на судзе заяўляў, што ўмовы арэнды былi надзвычайна „стеснительны и тяжелы". Арандатары нават павiнны былi, апрача таго, што працавалi ў экономii бясплатна, плацiць пошлiну ў 5 кап. з пуда сена, праданага на старану. Нам удалося знайсьцi даныя контракты i мы прывядзем iх некаторыя пункты.

Гэтыя контракты былi заключаны ў 1898 годзе, 1902 г. i ў далейшыя гады. Так, контракт 1898 году ад 11 красавiка быў заключаны з Адамовiчам на 7 год на ўчастак у $12^1/_2$ дзес. зямлi. Увесь контракт скадаецца з 18 параграфаў. Так, арандатар Адамовiч мусiў у першы год арэнды ўносiць па 30 руб., а ў iншыя гады па 40 руб. I гэтая плата мусiла ўносiцца 2 разы ў год за кожную палову году наперад (пар. 4). Незалежна ад платы грашыма арандатар быў абавязаны вотчыньнiку (гэтак i напiсана ў контракце—К. К.): а) штогодна зжынаць самага лепшага жыта па 1 маргу, пачынаючы з 1899 году, i ставiць па 8 касцоў да 20 лiпня, б) у апошнi год арэнды ўспахаць 2 дзес. да 20 верасьня пад будучы яравы засеў, г) малоць свой хлеб выключна на Гаранскiм млыне (панскiм, зразумела,—К. К.), д) вывозiць свой гной толькi пад засеў жыта, пакiдаючы частку яго пад свой гарод; рамантаваць будынкi, прычым строга агаворана, якiя будынкi i чым iх крыць i г. д. з) выконваць абавязкi палявога вартаўнiка — забiраць жывёлу на сенакосах i землях вотчыньнiка i яму данасiць аб усiх вiноўных у патравах. Калi-ж арандатар ня будзе выконваць гэтага пункту, то з таго часу дзейнасьць контракту спыняецца i пан мае права выкiнуць арандатара з сядзiбы, ж) трымаць на арандаваным участку ня менш 5 штук буйной рагатай жывёлы цi дробнай, лiчачы па тры штукi на кожную буйнаю адзiнку, i ўсю гэтую жывёлу ня выводзiць да канца контракту i да канчатковага разьлiку з вотчыньнiкам; за невыкананьне гэтага пункту арандатар абавязваецца выплачваць за кожную адсутную адзiнку па 5 руб., з) пры расчыстцы лесу арандатар ня мае права распараджацца зрубленым лесам, ён зьяўляецца ўласнасьцю пана, лес-жа, годны на тавар, арандатар абавязваецца падвесьцi да ракi Бярэзiны, прычым пан абавязваецца заплацiць па $5^1/_2$ руб. за лясны сажань годных для чыгункi дроў, прычым у такiм сажнi мусiць быць 16 шурак (гэта мiзэрная плата пры такiм аб'ёме сажню?). Арандатар абавязваецца глядзець за ўсякага роду ўдоб'ямi i баранiць iх ад розных „злоумышленников". Для гашэньня пажару ў лесе арандатар абавязваецца зьяўляцца з усёй сям'ёй, к) злоўленых на патравах, на кражы лесу i iншых злачын-

[1] Ленiн У. I., т. XVII, выд. 2, стар. 398.
[2] МГА Акруговы суд, зьвязка 819, справа № 28925.

ствах арандатар абавязваецца затрымліваць і дастаўляць у экономію, за ўтайку-ж іх адказвае як удзельнік учынку, л) усе будынкі павінен утрымліваць у самым лепшым стане, за ўласны кошт рабіць рамонт, а таксама будаваць новыя будынкі, якія пажадала паставіць экономія, м) страхаваць на імя вотчыньніка ўсе будынкі, калі-ж сам арандатар гэтага ня зробіць, дык пан мае права застрахаваць іх сам за рахунак арандатара, н) штогодна падчышчаць ад зарасьнікаў лугі, палі і канавы, о) даваць бясплатна работнікаў у выпадку межавых работ на ўчастку (пар. 5).

Апрача гэтага арандатар бярэ на сябе абавязкі: а) не перадаваць другой асобе сваіх арэндных праў ні на цэлы ўчастак, ні на яго частку, не аддаваць лугоў ні ў наём за грошы, ні за адпрацоўку, ні на долю, ні дарма, б) не прадаваць, ня вывозіць, не выдаваць на старану сена, саломы, гною і адпушчаны экономіяй лясны матар'ял, в) не карыстацца ўдоб'ямі па-за межамі ўчастку, г) ня прымаць на пашу чужой жывёлы, д) ня сеяць лёну больш за адну чвэрць моргу ў год е) не займацца паляваньнем і рыбацтвам нават у межах арандаванага ўчастку, ж) не ўваходзіць у лес вотчыньніка без асобнага дазволу, з) не адчыняць якіх-небудзь гандлёвых ці прамысловых прадпрыемстваў, і) не дазваляць ня толькі чужым асобам езьдзіць па забароненым лясным дарогам, але і сам арандатар не павінен рабіць гэтага таксама, к) не прад'яўляць ніякіх прэтэнзій да вотчыньніка, калі-б у заарандаваным участку аказалася-б менш зямлі, чым напісана ў контракце, а таксама калі-б з прычыны разьмежаваньня з сялянамі адыйшлі земляўчасткі да іншага месца і быў перарваны тэрмін дзеяньня контракту (пар. 6).

Калі-б арандатар прынятыя абавязацельствы, пералічаныя ў пар. 5 і 6, ня выконваў, г. зн. ня выканаў натуральных павіннасьцяў, як-то: ня зжаў жыта, ня даў касцоў, не рэмонтаваў будынкаў, не папраўляў канаў, дарог і мастоў і г. д., вотчыньнік мае права наняць рабочых за рахунак арандатара. За невыкананьне іншых абавязацельстваў, за якія не паказаны няўстойкі, за кожную павіннасьць пан мае права ўтрымліваць гэтыя штрафы з унесеных грошай за арэнду (пар 7). Арандатар дае абяцаньне ў выпадку невыкананьня абавязацельстваў, калі-б ён прымусіў экономію мець з ім справу праз суд, ці сам-бы распачаў іскі, калі судовым прыгаворам яму ў іску будзе адмоўлена,— заплаціць вотчыньніку 50 руб. няўстойкі (пар. 8). Пры сканчэньні тэрміну арэнды арандатар абавязваецца заплаціць за ўсе страты экономіі, а за расчысткі і новыя будынкі платы не вымагаць (пар. 10).

Адным словам, усе 18 параграфаў контрактаў памешчыка Сьвіды з сялянамі, а сярод іх было шмат і літоўцаў-перасяленцаў, складзены так, што пан у кожную хвіліну меў права выкінуць любога арандатара вон. Так пар. 12 кажа, што калі-б тэрмін арэнды зышоў і арандатар ня выехаў з занятай сядзібы, дык за кожны пратэрмінаваны дзень ён мусіць заплаціць пану па 2 руб. Нічога дзіўнага няма ў тым, што арандатары, а сярод іх былі і кулакі, у 1905 годзе захваляваліся, за што і былі асуджаны акруговым судом.

Памешчыкі Сьвіды такім шляхам забясьпечвалі сябе рабочай сілай, яны пры дапамозе арандатараў распрацоўвалі новыя землі, арандатары ўгнойвалі іх, а потым паны выкідалі арандатараў вон. Мы бачым, што па сутнасьці даная арэнда ёсьць просты перажытак прыгону і што яна адрадзілася тут у крыху новай форме, сутнасьць-жа засталася старой. Ясна, што гэтая супярэчнасьць між сялянскай гаспадаркай, якая становіцца ці стала ўжо капіталістычнай, і гэтым відам

кабальнай арэнды зьяўляецца нясьцерпнай. Гэта самая дзікая эксплёатацыя сялянства панамі. На нашу думку ніякіх комэнтараў да прыведзеных вышэй пунктаў контракту не патрабуецца. Яны гавораць самі за сябе.

Што абшарнікі губляюць свае землі ў даных социяльна-экономічных абставінах, гэта было ўжо даведзена, сам пан не вядзе гаспадаркі, а ў большасьці гэта або капіталістычная арэнда, або галодная сялянская. Тое-ж самае падкрэсьлівае і магілеўскі губарнатар, які піша, што толькі ў 1913 г. дваранскім банкам было выдана 23 ссуды пад залог 18.509 дзес. у разьмеры 1.409.500 руб. Усяго-ж за дваранамі Магілеўскай губ. лічыцца к 1 студзеня 1914 г. непагашаных ссуд 8.994.800 руб., і, гаворачы далей аб тым, што плошча сялянскага ўладаньня перавышае плошчу памешчыцкага, губарнатар піша:

„В настоящее время, когда так много энэргии и затрат посвещается строительству крестьянской жизни (чытай кулацкай—К. К.), из среды землевладельцев, крупных и средних, слышится до известной степени справедливое сетование на отсутствие, повидимому, внимания к судьбе дворянского сословия, игравшего долгие века столь ответственную историческую роль и оказавшего России не мало важных услуг... Грустно свидетельствовать, што почти все дворянские имения находятся в аренде, причем арендаторами в огромном большинстве состоят евреи, но преследовать их как неимеющих право арендовать в Западном крае в высшей степени трудно... Между тем, среди полутемного, невежественного крестьянства исчезающие на наших глазах поместья, дворянские гнезда являются теми драгоценными оазисами, которые, по моему мнению, необходимо всячески поддерживать“[1].

Вось апалёгэтыка губарнатара Пільца пану-прыгоншчыку. Было-б, зразумела, наіўным думаць, што дваранскі і рэакцыйны ўрад не падтрымлівае дваранства і дапамагае яго зьнікненьню. Гэтае разьвіцьцё капіталізму ў сельскай гаспадарцы выкідае пана, які ня ўмее прыстасавацца да новых экономічных умоў. На вёсцы вырас капіталіст, вырас кулак „чумазы лёрд“, які б‘е пана на рынку, які ставіць сваю гаспадарку на новы грунт, які сам эксплёатуе і батракоў і вясковую беднату і які прэтэндуе заняць першае месца ў экономіцы і займае яго.

Як-жа выглядала і ў якіх конкрэтных формах праходзіла капіталізацыя сельскай гаспадаркі на Беларусі і ў прыватнасьці панскага маёнтку? Што штурхала непасрэдна да перабудовы гаспадаркі? Гэта ўплыў рынку, пад якім адбывалася пэўная спэцыялізацыя раёнаў па вырабу таго ці іншага продукту. Рынак прымушаў пана парываць з старадаўнім спосабам вядзеньня гаспадаркі, каб прыстасавацца да капіталістычных адносін. Абшарнікі, якія ўладалі вялізнымі прасторамі зямлі і лесу, далёка ня ўсе маглі прыстасавацца хутка да капіталістычных адносін. Капіталізм вымагаў зломy дваранскага старога земляўладаньня, ён выбіваў глебу з-пад ног памешчыкаў, але апошнія чапляліся ўсімі сіламі, каб утрымацца на паверхні, скарыстоўваючы *сваю* ўладу, старыну і традыцыю для дзікай эксплёатацыі сялянства.

Вырасшая вясковая буржуазія пачынае прыбіраць кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём да сваіх рук, менавіта яна паказвае гаспадарчую будучыню таму ці іншаму раёну. Капіталізацыя сельскай гаспадаркі праходзіць у іншых формах, чым капіталізацыя ў прамысловасьці. Гэта было ў свой час бліскуча паказана і даведзена Леніным

[1] ЛОЦИА МВД Департ. общ. дел., № 47, 1914 г.

у „Разьвіцьці капіталізму ў Расіі“. Менавіта Ленін паказаў на процэс спэцыялізацыі земляробства, як на паказчык прасяканьня капіталізму ў сельскую гаспадарку, як на процэс капіталізацыі сельскай гаспадаркі.

„Рост гандлёвага земляробства выяўляецца ў спэцыялізацыі земляробства... Менавіта ў адасабненьні розных раёнаў земляробства і заключаецца адна з найбольш характэрных рысаў пасьлярэформеннае гаспадаркі ў Расіі“[1].

Такім чынам, рост гандлёвага земляробства, менавіта, і праяўляецца ў спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Зразумела, гэты процэс прасяканьня капіталізму ў сельскую гаспадарку, пераход апошняй на капіталістычныя рэйкі ва ўсёй конкрэтнасьці складае надзвычайна важную задачу, якая ў нас не разьвязана.

Капіталізм, які прасякаў у сельскую гаспадарку, рабіў у ёй конкрэтна іншыя процэсы, чым у прамысловасьці. Ленін характарызуе тэта так:

„Земляробчая прамысловасьць не раскладваецца на абсолютна паасобныя галіны, а толькі спэцыялізуецца на вытворчасьці ў адным выпадку—аднаго, у другім выпадку — другога рыначнага продукту, прычым іншыя бакі сельскай гаспадаркі дапасоўваюцца да гэтага галоўнага (г. зн. рыначнага) продукту“[2].

Вось менавіта гэткім продуктам, на якім пачала спэцыялізавацца капіталістычная гаспадарка на Беларусі, і зьяўляецца бульба і лён. Гэта ёсьць той рыначны продукт, які рабіў спэцыялізацыю, які вымагаў не старога, напалову прыгоньніцкага гаспадараньня, а капіталістычнае, заснаванае на працы батракоў, гаспадаркі. Тым, што Беларусь зрабілася пасьля рэформы 1861 году менавіта бульбяным раёнам, даводзіць ня прыходзіцца. Мы спашлемся на Ў. І. Леніна, які характарызуе капісталістычны характар сельска-гаспадарчае вытворчасьці, менавіта, на прыкладзе пашырэньня засеву бульбы:

„Капіталістычны характар процэсу ілюструецца павялічэньнем ролі бульбы ў агульных разьмерах земляробчай вытворчасьці. Павялічэньне засеваў бульбы азначае, з аднаго боку, падвышэньне тэхнікі сельскай гаспадаркі (увядзеньне ў засеў караньплодаў) і рост тэхнічнай апрацоўкі с.-г. продуктаў (браварніцтва і бульбяна-крухмальная вытворчасьць)—з другога боку, яно зьяўляецца, з пункту погляду клясы вясковых прадпрыемцаў, вытворчасьцю адноснай, дадатковай вартасьці (патаненьне) утрыманьне рабочай сілы, пагоршаньне народнага харчаваньня“[3].

Вось гэтая характарыстыка Леніна процэсу капіталізацыі сельскай гаспадаркі цалкам можа быць прыстасавана да Беларусі, бо апошняя і зьявілася раёнам бульбяным, бульба тут склала галоўную сыравіну для броварнай і крухмальнай вытворчасьці.

„Заходні край“ — гэта раён, які меў найбольш за ўсе іншыя раёны сьпірытусавых бровараў. Вось некалькі лічбаў. Калі мы возьмем усе беларускія губэрні плюс Смаленскую, дык атрымаем для так званага былога „Заходняга краю“ наступныя лічбы:

| Гады | Бровараў | Вядзёр сьпірытусу |
|---|---|---|
| 1903-4 . . . . | 586 | 10.428.246 |
| 1913-14 . . . . | 710 | 14.269.348 |

[1] Ленін У. І., т. III, стар. 191.
[2] Ленін У. І., т. III, стар. 237-238.
[3] Ленін У. І., т. III, стар. 191.

Да ўсіх заводаў Эўропейскай часткі былой Расіі і ўсяе продукцыі сьпірытусу гэта складала:

| Гады | Бровараў | Вядзёр сьпірытусу[1] |
|---|---|---|
| 1903-4 . . . . | 29,6% | 15% |
| 1913-14 . . . . | 27,7% | 12% |

Такім чынам, амаль 30 проц. усіх бровараў было сконцэнтравана на Беларусі, на гэтым, так сказаць, спэцыялізаваўся даны раён у даваенныя часы. Аб гэтым-жа сьведчыць і засеў бульбы для перагонкі на сьпірытус. Так, пры гэтых заводах было ў 1903 г.

1903 г. 38.029 дзес.
1913 г. 50.009 „

Гэтая сума дзесяцін да ўсяе плошчы пры заводах Эўропейскай Расіі ў 1903 г. складае 23,6, 1913 г. — 29,8 проц. Збор бульбы з паказанай плошчы вырас з 17.449.000 пудоў у 1903 г. да 31.239.000—1913 г., што складае ў першым годзе 21,8 проц., а ў другім 32,5 проц. да ўсяе Эўропейскае Расіі.

Тое самае патрэбна сказаць і аб піўных броварах. У гэтым самым раёне было:

| Гады | Бровараў | Вядзёр піва |
|---|---|---|
| 1904 . . . . . | 92 | 4.831.027 |
| 1913 . . . . . | 83 | 8.591.410 |

Бровары і продукцыя піва складалі ў адносінах да ўсяе продукцыі Эўропейскай Расіі:

| Гады | Бровары | Вядзёр піва |
|---|---|---|
| 1904 . . . . . | 16% | 11,6% |
| 1913 . . . . . | 13,4% | 11,6% |

Кожны больш-менш „приличный“ маёнтак меў свой бровар а гэта пашырыла плошчу засеваў бульбы, адыходы скарыстоўваліся на корм жывёле і прымушалі заводзіць інтэнсыўную гаспадарку. Такім чынам, Беларусь зрабілася бульбяным раёнам. Гэта констатуе і Шастакоў, які піша аб процэсе капіталізацыі сельскай гаспадаркі:

„Разам з тым вызначаліся асобныя географічныя раёны інтэнсыўных бульбяных гаспадарак, прычым на першым месцы стаялі беларускія губэрні, затым цэнтральныя губэрні, дзе бульба ішла галоўным чынам на броварніцтва“[2].

Бровары ня толькі мелі ўплыў на панскую, але і на заможна-сялянскую гаспадарку, бо, зразумела, на сваёй бульбе цалкам ніводзін бровар не працаваў. Гэта выклікала патрэбу і ў сялянскіх кулацкіх гаспадарках пашыраць культуру бульбы дзеля продажу броварам.

1903-4 г. . . . . . 17.934.457 пуд., 21,3% да ўсяе Эўропейскае Расіі
1913-14 г. . . . . . 32.229.822 „ 20,1

Хлебных продуктаў:

1903 г. . . . . . . 4.204.384 пуд., 13,4%
1913-14 г. . . . . . 4.066.303 „ 9,4%

Мы бачым, што колькасьць перагнанай бульбы вырасла амаль удвая за 10 год, у той час як хлебныя продукты для перагонкі сьпі-

[1] Сборник стат. эконом. свед. России и иностр. госуд. за адпав. гады.
[2] Шестоков—„Капитализация сельского хозяйства в России, стар. 11.

рытусу і абсолютна і адносна зьменшыліся. Гэта сьведчыць аб тым, што бульба зрабілася вельмі пашыранай культурай ня толькі на панскіх палетках, але і на палёх вясковай буржуазіі. Галоўную ролю адыгрывала бульба пры пераходзе гаспадаркі на капіталістычныя рэйкі. Той-жа Шастакоў аб гэтым піша наступнае:

„Адсюль і пачынаецца барацьба бульбы за яравы клін і ў выпадку перамогі гаспадарка становіцца на новыя капіталістычныя рэйкі: яна падхопліваецца рынкавымі адносінамі—пастаўка бульбы на броварны завод ці на крухмальна-патачны“ [1].

Гэтае палажэньне Шастакоў бярэ з работы Брука аб гэтым процэсе ў чорназемнай паласе, але гэта-ж самае можна сказаць і аб Беларусі. Вясковая буржуазія займалася пастаўкай бульбы на броварныя і крухмальныя заводы. У 1903 годзе броварнымі заводамі было прыкуплена для перагонкі 700.000 пуд. бульбы, у 1913-1914 гг. ужо больш як 1.000.000 пуд. Пад уціскам агульных запатрабаваньняў рынку вясковая буржуазія ставіла гаспадарку на новыя рэйкі, інтэнсыфікавала яе. У нас няма даных, каб паказаць развой гаспадаркі капіталістаў і вясковай буржуазіі. Але бязумоўна, што ў гады рэакцыі гаспадарка кулакоў зрабіла вялікія крокі наперад. Аб гэтым у першую чаргу сьведчыць зьяўленьне машын і ўдасканаленых прылад. Так, паводле статыстыкі сельска-гаспадарчых машын і прылад у Эўропейскай і Азіяцкай Расіі за 1910 г. было па тром беларускім губэрням усіх складаных сельска-гаспадарчых машын:

| | | |
|---|---|---|
| Па | Менскай . . . . . . . . . | 21.210 |
| „ | Віцебскай . . . . . . . . . | 9.950 |
| „ | Магілеўскай . . . . . . . . | 5.911 |

Ясна, што гэтая лічба машын была і ў панскіх і ў гаспадарках вясковай буржуазіі, бо калі глянем на прылады для воркі, то адразу ўбачым, чым араў серадняк і бядняк,—уласьціва, сахой і ў рэдкім выпадку плугам.

Вось таблічка ў процантах аб сельска-гаспадарчым інвэнтары па тром беларускім губэрням па статыстыцы за 1910 г.

| Назва губэрні | Прылад для воркі | | | | | | | Прылад для распухленьня | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Сох | Касуль смыкоў | Плугоў | | | Іншых удасканаленых прыл. | Усяго | Барон | | | Іншых удасканаленых |
| | | | | Драўляных | Жалезн. | Паравых | | | Драўлян. | Драўлян. з жалезн. зубамі | Жалезн. | |
| | | | | | | кольк. | | | | | | |
| Менская . | 100 | 19,6 | 1,1 | 14,5 | 64,5 | — | 0,3 | 100 | 58,4 | 38,9 | 2,1 | 0,6 |
| Магілеўская | 100 | 29,2 | 0,9 | 44,4 | 25,2 | 34 | 0,3 | 100 | 68,1 | 30,2 | 1,4 | 0,2 |
| Віцебская . | 100 | 48,2 | 0,4 | 40,3 | 10,8 | 8 | 0,1 | 100 | 70,1 | 25,6 | 3,8 | 0,5 |

Увага. Паводле статыстыкі выходзіць, што 70,1 проц. барон было драўляных з жалезнымі зубамі па Віцебскай губэрні. Нам думаецца, што тут у статыстыцы памылка: 70,1 проц. было драўляных барон і 25,6 проц. драўляных з жалезнымі зубамі, а не наадварот.

[1] Шестоков—Капитал. сельского хозяйства России, стар. 11.

Як бачым, процант сох, смыкоў і драўляных плугоў па беларускім губэрням быў вельмі значны — 35,2 проц., 89,1 проц. на адну толькі Менскую губэрню прыпадала больш за палову жалезных плугоў, у іншых-жа пануе саха і драўляная барана; гэта сродкі вытворчасьці селяніна-бедняка і ў масе серадняка. Амаль увесь удасканалены інвэнтар прыпадае на гаспадаркі абшарнікаў і вясковай буржуазіі. Паказчыкам капіталізацыі сельскай гаспадаркі было тое, што зьявіліся паравыя плугі ў буйных панскіх гаспадарках. Такіх плугоў статыстыкі налічылі ў Менскай губэрні 8, у Магілеўскай 34. Аднак, апошнія лічбы выклікаюць сумненьне, таму што ў статыстыцы Магілеўскага земства за 1913 год яны ня фігуруюць і земства піша, што нават былі пасланы людзі ў адпаведныя павятовыя гарады для праверкі статыстыкі сельска-гаспадарчага інвэнтару 1910 году і яны паравых плугоў не знайшлі. Зразумела, тут можна ўсяк меркаваць. Можа быць, што паравыя плугі аказаліся нерэнтабельнымі і прышлося не карыстацца імі.

Вясковая буржуазія, кулацтва, якое вельмі вырасла ў годы рэакцыі, ставіць моцную капіталістычную гаспадарку з ужываньнем складаных сельска-гаспадарчых машын, з эксплёатацыяй батрацтва і сваіх-жа аднавяскоўцаў-беднякоў.

Каб ахарактарызаваць заможную гаспадарку на сяле, прывядзем даныя аб 340 гаспадарках, прыслаўшых весткі ў Магілеўскую ўправу.

Прыводзім іх у тым-жа выглядзе.

| Групы | Лік апрошан. гаспадарак | Інвэнтар мёртвы: У іх зямлі | На аднаго гаспадара | Плугоў | Касарак і жатак | Конных грабель | Малатарні: Ручных | Малатарні: Конных | Малатарні: Паравых | Веялак | Сеялак | Жывы інвэнтар: Коняй: Выязных | Коняй: Рабочых | Коняй: Жарабят | Іншых | Жывёла: Валоў | Кароў | Цялят | Сьвіней: Дарослых | Сьвіней: Парасят | Авечак: Дарослых | Авечак: Ягнят |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Да 9 дз. | 7 | 49 | 7 | 7 | — | — | — | — | — | — | — | — | 9 | — | — | — | 12 | 3 | 8 | 8 | 11 | 6 |
| 10—49 | 283 | 7,171 | 25,3 | 477 | 4 | — | 3 | 44 | — | 85 | — | 9 | 599 | 103 | 16 | 10 | 1.037 | 552 | 673 | 634 | 1.063 | 1.179 |
| 50—199 | 45 | 3,309 | 73,5 | 129 | 2 | 1 | 2 | 18 | — | 24 | — | 5 | 179 | 40 | — | 2 | 411 | 156 | 142 | 133 | 334 | 370 |
| 200 і больш | 5 | 3,750 | 750 | 26 | — | — | — | 1 | 1 | 2 | — | 2 | 41 | 9 | — | — | 86 | 65 | 48 | 30 | 69 | 56 |
| Усяго | 340 | 14,280 | — | 639 | 6 | 1 | 5 | 63 | 1 | 111 | — | 16 | 828 | 152 | 16 | 12 | 1.566 | 776 | 871 | 805 | 1.477 | 1.611 |

З прывезеных даных ясна відаць, што сельска-гаспадарчая машына заваявала сабе месца ў гаспадарцы капіталістычнай верхавіны вёскі. Як-бы скептычна ні глядзелі на прыведзеныя даныя, усё-ж з іх ясна відаць, што гаспадарка кулака разьвіваецца па-капіталістычнаму, ужывае машыны, эксплёатуе, зразумела, батракоў, вядзе інтэнсыўную гаспадарку і г. д. Попыт на машыны вельмі моцна ўзрастаў, у 1909 г. у Магілеўскую губ. было завезена 30.000 п. машын, у 1912 г.—122.000 пудоў,—за тры гады рост павялічыўся ў чатыры разы; гэта, бязумоўна, сьведчыць аб капіталізацыі гаспадаркі. Прывядзем яшчэ некалькі прыкладаў па Магілеўскай губэрні:

| Жатак было | | Конных малатарань | | Кармовых траў | |
|---|---|---|---|---|---|
| Да 1912 г. | 19 | Да 1910 г. | 565 | у 1902 | 2.000 |
| Куплена ў 1912 г. | 9 | у 1910-1911 | 435 | „ 1909 | 6.000 |
| у 1913 г. | 39 | „ 1912 | 442 | „ 1911 | 14.000 |
| | | „ 1913 | 786 | | |
| Усяго | 66 | Усяго | 2.228 | | |

Гэтыя даныя характарызуюць агульнае прасяканьне машыны ў сельскую гаспадарку ў Магілеўскай губ., а вось весткі Магілеўскага земства за 1913 г. аб сельска-гаспадарчых машынах у „сялян".

| | |
|---|---|
| Лік гаспадарак, якія далі весткі | 69.997 [1] |
| Гаспадарак з сельска-гаспадарчымі машынамі | 2.326 |
| Гаспадарак, якія мелі больш як адну машыну | 58 |
| Сеялак | 4 |
| Жатак | 65 |
| Конных малатарань | 2.275 |

Бязумоўна, гэтыя весткі далёка няпоўныя і зьяўляюцца толькі ілюстрацыяй. Хаця Магілеўскае земства, як і ўсякае іншае, вельмі цікавілася кулацкай гаспадаркай, але поўных даных покуль што намі ня знойдзена. Можна толькі адно сказаць, што вясковая буржуазія даўно ўжо аформілася як пэўная клясавая група і ў гады рэакцыі адбываўся яе рост.

Ці возьмем даныя, якія прыводзіць Дудкоў па Віцебскай губэрні:

| | Усяго с.-г. машын | Сеялак | Жнеяк | Малатарак: Ручн. | Малатарак: Кон. | Малатарак: Пар. | Малатарак: Усяго | Веялак | Сенакасілак | Конн. граб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У сялян | 12.608 | 31 | 49 | 2.168 | 2.091 | 6 | 4.265 | 8.236 | 18 | 9 |
| У пр. улас. | 10.123 | 381 | 400 | 1.048 | 2.250 | 87 | 3.385 | 5.046 | 419 | 492 |
| Усяго | 22.731 | 412 | 449 | 3.216 | 4.341 | 93 | 7.650 | 13.282 | 437 | 501 |

Даныя сьведчаць усё аб тым-жа росьце кулацкіх гаспадарак, бо набыць машыну мог толькі кулак, іншае сялянства ня мела ні столькі зямлі, каб апрацаваць яе машынай, ні столькі грошай, каб набыць яе.

У Віцебскай губэрні да 1909 г. ня было ніводнага складу сельска-гаспадарчых машын, у 1909 г. іх было ўжо 6, у 1912 г.—15. Зварот складаў гэтак сама расьце. У 1911 г. ён быў 139.302 руб., у 1912 г.—197.770 руб., у 1913 г.—392.878 руб. Як бачым, звароты складаў с.-гаспадарчых машын сьведчаць, што машыны хутка пачалі прасякаць у гаспадарку

[1] Магілеўскае губ. стат. апісаньне, выдан. Маг. губ. зем.

сельскай буржуазіі і капіталізаваных маёнткаў. Аб гэтым-жа самым сьведчыць і ўвоз с.-гаспадарчых машын і рост ужываньня штучных угнаеньняў,—напрыклад, калі са складаў у Віцебскай губэрні было прададзена:

у 1912 г. супэрфосфату . . . 78.013 п., то 1913 г. . . 132.085 п.
„ 1912 г. тамашляку . . . 11.941 п., то 1913 г. . . 25.965 п. і г. д.

Засеў кармовых траў вельмі пашыраецца; было прададзена:

| Год | Віка | Клевер | Цімафееўка |
|---|---|---|---|
| | Пудоў | | |
| 1912 | 1.867 | 1.327 | 240 |
| 1913 | 2.965 | 3.191 | 525 |

Віцебскае земства адзначае, што па ўвозу штучных угнаеньняў губэрня стаіць на першым месцы ў б. Расіі, за выключэньнем Польшчы [1].

Віцебская губэрня была раёнам, дзе хугарская гаспадарка вельмі пашыралася, дзе і кулацтва надзвычайна вырасла.

Прывядзем яшчэ адзін бытавы факт, які паказвае, як рос кулак на вёсцы.

„У „Земской Неделе“ №1—3 за 1911 г. прыведзены цікавы прыклад. Справа адбылася ў вёсцы Стрэлкі Рагачэўскага павету, апавядае аграном. Калі ён праяжджаў праз вёску, дык сяляне зьдзіралі салому з дахаў на корм жывёле. Гэта, відаць, і дало повад аграному расказаць аб тым, як зьявіўся і рос адзін кулак. Аграном апавядае: „Год 8—10 назад выхадзец з латышоў купіў за бясцэнак па 3—5 руб. за дзесяціну ў земляўласьніка 200 дзесяцін нікуды нягоднага балота. 8 год зьмянілі зусім малюнак. Цяпер-жа стралкоўцы таму-ж „кулаку“ (двукосьсе агранома—К. К.) плоцяць па 30—40 руб. за дзесяціну травы і называюць яго ня іначай, як „пан Карла“. „Кулік абярнуўся ў памешчыка, якому належыць будучыня“, кажа аграном і піша: „Дасада мяне ўзяла, калі я даведаўся, што Карла няпісьменны“. Але далей аграном падае іншы малюнак,—дзесятак сялян стаялі бяз шапак перад ганкам „пана“ і, кланяючыся, прасілі прадаць дровы. Вось перад намі два полюсы беларускай вёскі. Ясна, што гэты Кулік, зрабіўшыся заможным кулаком, пачаў забіраць у свае рукі вёску і эксплёатаваць яе ня горш за старога пана. Тут паказана, у якім нявыносна цяжкім становішчы знаходзілася бядняцка-серадняцкая маса. Ні дроў, ні корму для жывёлы—холад, голад—гэтыя два падарожнікі добра вядомы беларускаму селяніну-бедняку. Шматлікія пераж ыткі прыгоньніцтва зьвязвалі кожны крок селяніна, эксплёатацыя „новых паноў—Кулікаў“ рабіла становішча страшна цяжкім. У заключэньне прывядзем яшчэ адзін прыклад, падаcontaining ў газэце „Слово“ ад 1 (14) лістапада 1908 году, дзе гаворыцца аб Магілеўскай губ., якая толькі што перажыла недарод, голад 1907 году. Корэспондэнт піша:

„Неурожаи прошлых лет тяжелым отпечатком легли на благосостояние крестьян нашей губернии. Питаться хлебом, смешенным с овсом, гречихой, а часто всевозможного рода мучными отбросами, вошло во многих местах в обычай, в особенности в Оршанском, Быховском, Чериковском уездах; отдача крестьянами в аренду Днепровских заливных лугов—товар сильно ценный в нашей местности, за последние года распространяется все больше и больше. При этом надо заметить, что цены на последние, *благодаря получению арендной платы до*

[1] Больш падрабязна гл. працу Дудкова Д.—Сталыпінская рэформа ў Віцебскай губ., стар. 96—99.

*сенокоса за 6-7 месяцев, преимущественно деньги берутся зимой по выходе собственного хлеба.* С весны на весну уменьшается десятина луга в цене. Сначала 40—35 руб., теперь идет 20—25. Но что особенно бросается в глаза при такого рода покупках, это часто применяемая вставка в условии аренды, обязывающая владельца луга скосить траву и доставить сено арендатору в счет общей платы". (Подчеркнуто мной—К. К.).

Такім чынам, перад намі найяскравейшы факт перажыткаў прыгоньніцтва, калі голад прымушае селяніна сваю ўласную сенажаць скасіць і зьвезьці на двор кулаку за грошы, якія ён атрымаў зімой, каб накарміць галодную сям'ю. Як бачым, бядняк прымушаны плаціць залатымі рублямі за кулацкія капейкі. Вось якім было нявыносна-цяжкое становішча беднаты і маламоцнага сялянства,—душыла лятыфундыя, эксплёатаваў кулак. Разьвіцьцё капіталізму выклікала страшэнную аграрную перанаселенасьць і таму маем масавы адыход сялянства ў гарады, на фабрыкі, эміграцыю ў Амэрыку і перасяленьні ў Сібір.

---

Усё вышэйпрыведзенае коратка характарызуе соцыяльна-эканомічныя абставіны пэрыоду між дзьвюма рэволюцыямі. Капіталізм разьвіўшыся патрабаваў перабудовы аграрнага ладу. Рэволюцыя 1905 году паказала, што вырасьлі сілы, якія здольны скінуць стары лад, а разам з гэтым паўставалі і далейшыя новыя задачы. Гэта лепш за ўсё падкрэсьліў Ленін у лісьце да Скварцова-Сьцяпанава:

„Што даводзіў і давёў Ільін? Што разьвіцьцё аграрных адносін у Расіі ідзе па-капіталістычнаму *і* ў памешчыцкай гаспадарцы *і* ў сялянскай, *і* па-за *і* ўнтры „абшчыны". Гэта раз. Што гэтае разьвіцьцё ўжо *беззваротна* вызначыла *ня* іншы шлях разьвіцьця, як капіталістычны, *ня* іншую групоўку кляс, як капіталістычную. Гэта два. Гэта трэба было давесьці, гэта было даведзена... Гісторыя XX сталецьця ў Расіі паставіла нам *далейшае* пытаньне... Нельга заставацца пры агульным вырашэньні пытаньня аб капіталізьме, калі новыя падзеі (і падзеі сусьветна-гістарычнае важнасьці), якімі былі 1905—1907 гг., паставілі пытаньне больш конкрэтнае, больш дэталёвае, пытаньне аб барацьбе *двух* шляхоў ці мэтодаў капіталістычнага аграрнага разьвіцьця... На чаргу пастаўлена другое вышэйшае пытаньне: капіталізм тыпу $\alpha$ *ці* капіталізм тыпу $\beta$? Гістарычная барацьба *гэтых* відаў яшчэ ня скончана" [1]. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.).

Такім чынам, у гады між дзьвюма рэволюцыямі асноўнай проблемай у аграрных адносінах зьяўляецца барацьба двух шляхоў капіталістычнага разьвіцьця ў сельскай гаспадарцы. Моцная клясавая барацьба між абшарнікамі, памешчыкамі і сялянствам кіпела вакол вырашэньня гэтага пытаньня. Старыя аграрныя адносіны зжылі сябе, але злом іх павінен быў адбывацца на чыюсьці карысьць і павінен быў быць праведзены якойсьці клясай. Памешчыцкая ломка, ці ломка сялянская за кошт памешчыкаў на карысьць сялян. Аграрнае пытаньне зрабілася „нацыянальным" пытаньнем буржуазнага разьвіцьця былой Расіі, а значыць і Беларусі, як колёніі першай.

Для гэтай барацьбы сялянскіх мас патрэбна было яснае і цьвёрдае кіраўніцтва якойсьці партыі, і трэба сказаць, што толькі партыя бальшавікоў магла ўзяць на сябе гэткую задачу, ніякая іншая партыя нядольна была-б гэтага зрабіць, як гэта ўжо даўно даведзена. І сапраўды, партыя бальшавікоў даўно зьвярнула на аграрнае пытаньне належную ўвагу і дала ясныя і дасканалыя лёзунгі для гэтай барацьбы.

[1] Ленін У. І., т. XX, ч. 1, стар. 315.

Партыя бальшавікоў вяла вялікую работу сярод сялянскіх мас, работу па ўзьняцьці сялянскай масы супроць памешчыцкага ладу, супроць царызму.

І работа соцыял-дэмократычнай партыі, менавіта бальшавікоў, давала свае вынікі. Нам неабходна крыху пазнаёміцца з гэтай работай і програмай РСДРП, каб паказаць, што толькі бальшавізм правільна ставіў і вырашыў аграрнае пытаньне і быў адзінай пасьлядоўнай рэволюцыйнай партыяй, якая сьмела вяла барацьбу і давала ясныя і поўныя лёзунгі ў барацьбе. І толькі пад гегемоніяй пролетарыяту магло быць вырашана аграрнае пытаньне, толькі пролетарыят і пад яго кіраўніцтвам сялянства, злучыўшыся разам, скінулі і царызм, скінулі дыктатуру прыгонніцкаў і буржуазіі.

Як вядома, аграрная програма РСДРП была прынята другім зьездам. Надзвычайна шырокае разьвіцьцё сялянскага руху ў 1905 годзе паставіла на чаргу дня перагляд аграрнай програмы, прынятай у 1903 годзе. Асноўныя прынцыпы, на якіх была пабудавана аграрная програма II зьезду, засталіся вернымі і ў 1905 годзе. Ленін пісаў:

„Тры асноўныя палажэньні заўжды абараняліся рускімі соцыялдэмократамі ад самага пачатку ўзьнікненьня іх партыі аж да цяперашняга часу (1906 год—К. К.). *Першае*—аграрны пераварот няўхільна складзе частку дэмократычнага перавароту ў Расіі. Пазбаўленьне вёскі ад прыгоньніцка-кабальных адносін будзе зьместам гэтага перавароту. *Другое*—прадстаячы пераварот па свайму грамадзка-эканомічнаму значэньню будзе буржуазна-дэмократычным пераваротам; ён не паслабіць, а ўзмоцніць разьвіцьцё капіталізму і капіталістычных клясавых супярэчнасьцяў. *Трэцяе*—соцыял-дэмократыя мае ўсе падставы самым рашучым спосабам падтрымліваць гэты пераварот, намячаючы пры гэтым тыя ці іншыя бліжэйшыя задачы, але ня зьвязваючы сабе рукі і не адмаўляючыся ніколі ад падтрымкі нават „Чорнага перадзелу“ [1]. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.).

Выходзячы з гэтых палажэньняў, трэба было перагледзець конкрэтныя патрабаваньні, прыняўшы пад увагу характар і велічыню сялянскіх рухаў. І Ленін ужо ў лісьце да III зьезду „О нашей аграрной программе“ прапанаваў унесьці ў програму пункт, які паказваў-бы, што соцыял-дэмократыя будзе падтрымліваць сялянства ва ўсіх яго рэволюцыйна-дэмократычных „пачынаньнях“ аж да адабраньня зямель у памешчыкаў, але пры гэтым адстойваючы самастойныя інтарэсы і самастойную організацыю сельскага пролетарыяту. З гэтай прычыны Ленін рэкомэндаваў пытаньне аб адрэзках вынесьці з програмы ў комэнтарыі, а задачы сялянскіх камітэтаў пашырыць.

„Заклікаць сялянства і вясковы пролетарыят да ўсякіх палітычных дэмонстрацый і колектыўнага адмаўленьня ад выплаты падацей і падаткаў, ад выкананьня вайсковай павіннасьці і пастаноў і загадаў ураду і яго агентаў“ [2].

Ленін сялянскаму руху надаваў вялікае значэньне. Дзякуючы гэтаму, сялянства мела конкрэтнае кіраўніцтва з боку пролетарыяту і прытым не забывалася, што сялянства ўжо неаднародная маса, што інтарэсы сельска-гаспадарчага пролетарыяту кордынальна адрозьніваюцца ад інтарэсаў сялянства наогул. У лютым 1906 году Ленін выступіў з проектам аграрнай програмы. У гэтай програме Ленін настойваў на конфіскацыі ўсіх царкоўных, манастырскіх, удзельных, дзяр-

[1] Ленін У. І., т. IX, вып. 2, стар. 56.
[2] Мороховец Е. А.—Крестьян. движение и соц. демокр. ГИЗ, 1926 г.

жаўных, габінэтных і панскіх зямель. Гэтае пытаньне нацыяналізацыі Ленін цесна зьвязваў з пытаньнем аб заваёве ўлады і з пытаньнем аб дыктатуры пролетарыяту і сялянства Ленін пісаў:

„Мы павінны проста і дакладна сказаць селяніну, калі ты хочаш давесьці аграрную рэволюцыю да канца, дык ты павінен таксама давесьці політычную рэволюцыю да канца; без давядзеньня да канца політычнай рэволюцыі ня будзе зусім ці ня будзе колькі-небудзь трывалай аграрнай рэволюцыі. Бяз поўнага дэмократычнага перавароту, бяз выбару чыноўнікаў народам у нас будуць ці аграрныя бунты, ці кадэцкія аграрныя рэформы“ [1].

Як вядома, „на об‘единительном с‘езде“ Маслаў выступіў з меншавіцкай програмай муніцыпалізацыі, супроць якой рэзка паўстаў Ленін.

„Яно (правае крыло—меншавікі) не формулюе ў програме яснага рэволюцыйнага шляху для пропаганды і агітацыі ў народзе *(захоп* зямель рэволюцыйнымі сялянскімі камітэтамі *аж да* Ўсенароднага ўстаноўчага сходу), яно баіцца выразіць у програме сялянскай рэволюцыі ідэю захопу ўлады рэволюцыйным сялянствам. Яно, насуперак свайму абяцаньню, не даводзіць якраз да „лёгічнага“ канца буржуазна-дэмократычнага перавароту ў земляробстве, бо гэткім лёгічным (і экономічным) канцом пры капіталізьме зьяўляецца толькі нацыяналізацыя зямлі, як зьнішчэньне абсолютнай рэнты“ (падкрэслена Леніным—К. К.) [2].

Як вядома, на гэтым зьезьдзе была прынята компромісная програма. Мы гэта адзначаем для таго, каб падкрэсьліць, што толькі бальшавікі, на чале з Леніным, разумелі ўсю важнасьць аграрнага пытаньня і правільна яго вырашылі, прапанавалі ставіць і шырока разьвіваць работу і агітацыю сярод сялянства.

Калі пачалася рэволюцыя, дык яшчэ да III зьезду ЦК (прымірэнчаскі) з прычыны 9 студзеня быў выпушчаны лісток „Крестьяне к вам наше слово“, які разышоўся ў вялікай колькасьці экзэмпляраў. Сама рэволюцыя прымушала меншавікоў быць больш левымі. Лісток заклікае падтрымаць рабочых гораду і падае цэлы рад конкрэтных спосабаў, як гэта зрабіць. Бальшавіцкі ЦК, абраны на III зьезьдзе, ідзе далей. У № 16 ЦО быў зьмешчаны кіраўнічы артыкул Леніна „Отношение социал-дэмократии к крестьянскому движению“, дзе падкрэсьліваецца, што зараз цэнтар цяжкасьці пытаньня ляжыць у стварэньні зьвязаных з социял-дэмократычнымі організацыямі рэволюцыйных сялянскіх камітэтаў, як органаў сялянскага паўстаньня, пры дапамозе якіх сялянства праводзіла рэволюцыйную ломку старога парадку. Мы за тое, каб у мэтах паўстаньня социял-дэмократыя падштурхвала ўсю рэволюцыйную дэмократыю, дапамагала ёй організавацца.

„Мы—за паўстаньне сялянства. Мы, бязумоўна, супроць зьмяшэньня і зьліцьця рознародных клясавых элемэнтаў і рознародных партый. Мы за тое, каб у мэтах паўстаньня социял-дэмократыя падштурхвала *ўсю* рэволюцыйную дэмократыю, дапамагала *ўсёй* ёй організавацца, *ішла поплеч* з ёю, але ня зьліваючыся з ёю на барыкады ў гарадох, супроць памешчыкаў і поліцыі—у вёсках...“ [3]. (Падкрэслена Леніным—К. К.).

Так пісаў Ленін, і далей ідзе сыстэматычнае разгортваньне таго-ж лёзунгу ў адозьве, выпушчанай ЦК у верасьні 1905 году да рабочых і сялян. Адозва гэтая была выдана з прычыны апублікаваньня пала-

[1] Ленін У. І., т. IX, стар. 151.
[2] Ленін У. І., т. IX, стар. 223.
[3] Ленін У. І., т. VIII, выд. 2, стар. 188.

жэньня аб Булыгінскай думе. Зварочваючыся да сялянства, ЦК настойвае на організацыі рэволюцыйных сялянскіх камітэтаў для кіраўніцтва сялянскім рухам, для непасрэднай барацьбы з памешчыкамі і органамі самаўладзтва на мясцох. Для ўзгадненьня рэволюцыйных выбухаў сялянства са збройнай барацьбой рабочае клясы супроць царызму [1].

Новаабраны ЦК (об'единительным с'ездом) складаўся ў большасьці з меншавікоў, гэтым вызначалася яго позыцыя ў аграрным пытаньні і опортуністычная лінія яго тактыкі. Там жа, дзе было бальшавіцкае кіраўніцтва на мясцох, там і аграрнае пытаньне ставілася больш выразна, там і работа соцыял-дэмократыі на вёсцы вялася больш шырока.

Даныя, якія прыводзіць Марахавец, сьведчаць, што на Беларусі ўплыў соцыял-дэмократыі быў вялікі. Бальшавіцкая літаратура распаўсюджвалася даволі шырока і аказвала свой уплыў, што сьведчыць аб значнай рабоце беларускіх соцыял-дэмократычных організацый. Так корэспондэнт „Вольного экономического общества" піша, што агітацыя соцыял-дэмократыі мела вялікі ўплыў у Менскай губэрні. Так у Менскім павеце распаўсюджвалася соцыял-дэмократычная літаратура і проклямацыі, якія з цікавасьцю чыталіся сялянствам. У 1905 годзе было праведзена с.-д. рад стачак сельска-гаспадарчых рабочых. Напрыклад, у Столбцах, Заямы, Мікалаеўшчыны і інш. Мазырская група Палескага камітэту організавала ў чэрвені 1905 году стачку сельска-гаспадарчых рабочых у маёнтку Сідкова. Капыльская група, якая належала да заходняга камітэту, выпусьціла некалькі лістовак, і цікава, між іншым, адзначыць, што яна заклікала і да дэмократычнай рэспублікі і ў той-жа час імкнулася ўтрымаць сялянства ад зруйнаваньня маёнткаў. Ці ня ёсьць гэта вынік меншавіцкага ўплыву. У 1906 годзе ў Менску пры с.-д. камітэце існавала акруговая сялянская організацыя, якая мела шырокія сувязі з вёскай. У Магілеўскай губэрні вялі работу, праводзіла Копыская група Палескага камітэту. У канцы 1905 году ці пачатку 1906 у сяле Жгуні Гомельскага павету ўзьнік гурток соцыял-дэмократаў, які складаўся з рабочых добрускай фабрыкі, чыгуначных рабочых, ён таксама вёў работу на вёсцы. Пры Віцебскай групе яшчэ ў 1904 годзе была сялянская соцыял-дэмократычная організацыя. Поташ адзначае, што групы РСДРП паставілі сабе задачу— весьці работу сярод сялянства і ажыцьцявіць кіраўніцтва рэволюцыйным змаганьнем беларускага сялянства... І ў рэчаіснасьці, разам з ростам і ўзмацненьнем організацыі РСДРП у Беларусі, усе больш расьце і пашыраецца іх работа сярод сялянства і ўзмацняецца кіраўніцтва сялянскім рухам [2].

Бальшавіцкая організацыя на Беларусі вяла работу — агітацыю і пропаганду сярод сялянства. Пасьля разгрому рэволюцыі 1905 году, пасьля ўдушэньня ў моры крыві рабочага рэволюцыйнага руху і зьнішчэньня сялянскіх рухаў работа, зразумела, замерла, але ўжо ў 1908 годзе РСДРП дала дакладны партыйны адказ на ўсе самыя карэнныя пытаньні. Так, Ленін у проекце пляцформы IV зьезду с.-д. Латыскага краю піша:

„Гады, што прайшлі з часу прыняцьця гэтай рэзолюцыі, упаўне пацьвердзілі яе правільнасьць—яе паказаньні на зьмены прыроды самадзяржаўя, на контррэволюцыйнасьць лібэралізму і г. д. і яе вывад,

[1] Мороховец, там-жа, стар. 53.
[2] Поташ М.—Бальшавізм і дробна-буржуазныя партыі ў рэв. 1905 г. у Беларусі. Выд. БДВ. 1931 г., стар. 23.

што самадзяржаўе, хоць і паднавіўшае сябе, існуе, як і раней, што ўмовы, якія выклікалі рэволюцыю 1905 году, дзейнічаюць, як і раней, што перад с.-д. партыяй стаяць *старыя задачы,* якія патрабуюць рэволюцыйнага вырашэньня і рэволюцыйнай тактыкі" [1]. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.).

Рэзолюцыя летняе нарады 1913 году ЦК РСДРП з партыйнымі работнікамі ў разьдзеле аб задачах агітацыі ў сучасны момант па цікавячаму нас пытаньню падмацоўвала рэзолюцыі студзеньскай конфэрэнцыі 1912 году, дзе было адзначана, што галоўнымі лёзунгамі эпохі застаюцца: 1) дэмократычная рэспубліка, 2) конфіскацыя *памешчыцкіх* зямель, 3) васьмігадзінны рабочы дзень. Агульна-палітычнае становішча ў той-жа рэзолюцыі было вызначана так:

„Становішча ў краіне ўсё больш і больш абвастраецца. Панаваньне рэакцыйных памешчыкаў выклікае ўсё большае і большае нездаволеньне нават сярод самых памяркоўных пластоў насельніцтва. На шляху наколькі-небудзь сапраўднай палітычнай свабоды ў Расіі па-старому стаіць царская монархія, варожая да ўсякай сур'ёзнай рэформы, якая ахоўвае толькі ўладу і прыбыткі прыгоньнікаў і асабліва жорстка падаўляе ўсякую праяву рабочага руху" [2].

Але ўжо к 1910-1911 гг. рабочая кляса, а за ёю і сялянства, зноў пачала штурмаваць царызм. Ленскі расстрэл громам пакаціўся па ўсёй Расіі. Рэволюцыя зноў нарастала, бо яшчэ больш нясьцерпнымі сталі старыя супярэчнасьці, яшчэ больш абвастрыліся супярэчнасьці між сялянскай масай і памешчыкамі. Гэта ўсё, зразумела, адбілася ў пад'ёме рэволюцыйнага руху па гарадох, а таксама і ў нарастаньні аграрных хваляваньняў на вёсцы. Партыя вяла шырокую работу і шырокую організацыю падрыхтоўкі новай рэволюцыі, зьбіраліся сілы для штурму царызму.

І трэба падкрэсьліць, што толькі бальшавікі змагаліся за рэволюцыю і правільна ставілі пытаньне аб сялянстве, каб прыцягнуць яго да рэволюцыі, каб аб'яднанымі сіламі ўдарыць супроць монархіі; меншавікі-ж скатваліся да буржуазіі, як скатваліся да яе і ўсе іншыя дробна-буржуазныя і нацыяналістычныя партыі:

„Толькі гэтыя плыні, бальшавіцкая і меншавіцкая, адны толькі яны выявілі сябе ў палітыцы *мас* у 1904—1908, як і пясьля 1908—1914 гадоў. Чаму? Таму, што толькі гэтыя плыні мелі трывалыя клясавыя карэньні, першыя — пролетарскія, другія — лібэральна-буржуазныя" [4] [3].

І ў тым-жа артыкуле, крыху вышэй, Ленін падкрэслівае, што толькі:

„Бальшавікі сьвядома дапамагалі пролетарыяту ісьці па першай лініі, змагацца з беззаветнай адвагаю і весьці за сабой сялянства. Меншавікі пастаянна скочваліся... да лібэралаў" [4]. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.).

На Беларусі дзейнічала БСГ—дробна-буржуазная нацыяналістычная партыя, якая, па-першае, не орыентавалася на рэволюцыю, а на паступовыя рэформы, па-другое, яна была прасякнута ўся нацыяналізмам, па-трэцяе, БСГ ніякім чынам няздольна была давесьці бела-

[1] Ленін У. І., т. XVII, выд. 2, стар. 62.
[2] Ленін У. І., т. XVII, стар. 56.
[3] Ленін У. І., т. XVIII, стар. 316.
[4] Там-жа, стар. 315.

рускае сялянства да перамогі ў аграрнай рэволюцыі і, такім чынам, вырашыць аграрнае пытаньне.

Пасьля рэволюцыі 1905 году ўсе гэтыя партыі абанкрутаваліся. Аналіз іх ідэолёгіі і тактыкі, напрыклад эсэраў, меншавікоў, быў даны ў свой час Леніным бліскуча. Таксама і меншавізм, які скочваўся да лібэральнай буржуазіі, зразумела, ні ў якай меры ня мог вырашыць аграрнага пытаньня. Нам цікава падкрэсьліць, што і Троцкі сваёй „орыгінальнай тэорыяй“ 1905 г. аб сялянстве, як гэта было паказана Леніным, скочваўся да лібэралаў. Бліскучую характарыстыку гадоў між рэволюцыямі і аналіз ідэолёгіі розных партый даў Ленін у адпаведных артыкулах. Мы прывядзем толькі адну вытрымку, у якой Ленін характарызуе дзесяцігодзьдзе 1905—1915 гг.:

„Усё дзесяцігодзьдзе—вялікае дзесяцігодзьдзе 1905 - 1915 гг.—дало наяўнасьць дзьвюх і толькі дзьвюх клясавых ліній рускай рэволюцыі. Расплastаваньне сялянства ўзмацніла клясавую барацьбу ўнутры яго. Абудзіла вельмі многія палітычна сьпячыя элемэнты, наблізіла да гарадзкога пролетарыяту вясковы пролетарыят (на *асобнай* яго організацыі бальшавікі настойвалі з 1906 году і ўвялі гэтае патрабаваньне ў рэзолюцыю Стокгольмскага меншавіцкага зьезду). Але антагонізм „сялянства“ і Маркавых - Раманавых - Хвастовых узмацніўся і абвастрыўся. Гэта такая вачавідная ісьціна, што *нават* тысячы слоў Троцкага ў дзесятках парыскіх артыкулаў не абвяргаюць яе. Троцкі на справе дапамагае лібэральным рабочым палітыкам Расіі, якія пад адмаўленьнем ролі сялянства разумеюць *нежаданьне* ўзьнімаць сялян на рэволюцыю.

А ў гэтым зараз гвозд. Пролетарыят змагаецца і будзе самааддана змагацца за заваёву ўлады, за рэспубліку, за конфіскацыю зямлі, гэта значыць, за прыцягненьне сялянства, за *вычарпаньне* яго рэволюцыйных сіл. За ўдзел „непролетарскіх народных мас“ у вызваленьні *буржуазнай* Расіі ад *ваенна-фэўдальнага* „імпэрыялізму“ (-царызму). І гэта вызваленьне буржуазнай Расіі ад царызму, ад зямельнай улады памешчыкаў пролетарыят выкарыстае зараз-жа не для дапамогі заможным сялянам у іх барацьбе з вясковым рабочым, а для ўчыненьня соцыялістычнай рэволюцыі ў саюзе з пролетарамі Эўропы“[1]. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.).

З усяго вышэйпаданага ясна відаць, што толькі бальшавіцкая партыя сьвядома і ўпарта вяла работу сярод сялянства ўзьнімаючы яго на барацьбу, на дапамогу пролетарыяту для нізрынуцьця царскай монархіі ў Расіі. Што толькі бальшавіцкая партыя была адзінапасьлядоўнай рэволюцыйнай партыяй, якая здольна была павесьці масы ў бой супроць памешчыкаў і буржуазіі, супроць старога парадку і супроць дыктатуры буржуазіі. Мы ведаем, што ўсе прогнозы Леніна зьдзейсьніліся цалкам і поўнасьцю.

---

[1] Ленін У. І., т. XVIII, стар. 317-318.

# ПЕРШЫЯ ПРАЯВЫ АГРАРНАГА РУХУ ПАСЬЛЯ 1905 ГОДУ

Рэволюцыя 1905 году ўскалыхнула самыя мядзьвежыя куткі на Беларусі. Сялянства выступіла на барацьбу з сваім адвечным ворагам панам. Але гэты стыхійны і неорганізаваны рух быў у розных мясцох неаднвчасным і неаднолькавым па форме і мэтам. Трэба падкрэсьліць, што там, дзе былі ўплывы соцыял-дэмократычнай партыі, ці там, дзе ў руху прымалі ўдзел сяляне, якія пабывалі на шахтах і заводах, там было больш організаванасьці і сьвядомасьці.

Дзякуючы вялікай аграрнай перанаселенасьці беларускай вёскі, якая была створана разьвіўшымся капіталізмам, адыходніцтва на заводы і шахты поўдню было вельмі значным. Цікава падкрэсьліць, што магілеўскі ґубарнатар фон-Гагман піша ў сваёй справаздачы аб 1905 годзе наступнае:

„К началу 1906 года аграрное революционное движение широкою волною захватило почти все другие уезды (Гомельскі павет хваляваўся ўжо раней—К. К.). Движение это было создано оторвавшимися от земли рабочими крестьянами, исключительно молодежью, вернувшейся посьле забастовок с заводов южных губерний. Восприняв там социалистическо-революционное учение, они явились ярыми проповедниками идей известного крестьянского союза и, пользуясь темнотою народною, внушили крестьянам уверенность в необходимости и безнаказанности захватного права, грозя поджогами и убийствами тому, кто будет противиться их преступным целям“ [1].

Гэта бязумоўна правільна было заўважана чыноўнікамі і жандарамі, якія даносілі губарнатару аб рэволюцыйных падзеях губэрні. Трэба глыбока вывучыць рэволюцыйны рух 1905 году і асабліва дасьледваць, хто зьяўляўся непасрэдным узбуджальнікам аграрнага рэволюцыйнага руху на Беларусі. Мы пакуль што можам адзначыць, што застрэльшчыкамі рэволюцыйнага аграрнага руху на Беларусі, як гэта можна ўстанавіць для Магілеўскай губэрні, былі сяляне і сялянская моладзь, якая пабывала на заводах і асабліва шахтах поўдню і прынесла з сабой рэволюцыйныя ідэі. Такім чынам, вялізарны рэволюцыянізуючы ўплыў руху і барацьбы пролетарыяту на сялянскую масу на Беларусі можам устанавіць з пунктуальнасьцю. Прычын-жа і повадаў для аграрных хваляваньняў было шмат, літаральна ў кожнай вёсцы, і ў гэтым сэнсе глеба была вельмі багатая для агітацыі і пропаганды супроць дыктатуры прыгоншчыкаў і царызму.

Напалоханая моцным націскам пролетарыяту і пажарамі памешчыцкіх гнёздаў, царская ўлада з асаблівай азьвярэласьцю распраўлялася з рэволюцыяй у горадзе і на вёсцы. Ленін пісаў:

[1] ЛОЦИА Депар. общ. д. МВД д. № 46, 1907 г.

„Нястрыманае бешанства, з якім правыя нападаюць на рэволюцыю, на канец 1905 г., на паўстаньне, на абедзьве першыя Думы, паказваюць лепш усякіх іншых размоў, што вартаўнікі самаўладзтва бачаць перад сабой *жывога* ворага, што барацьбу з рэволюцыяй яны ня лічаць скончанай, што *адраджэньне рэволюцыі стаіць перад імі штомінутна як самая рэальная і непасрэдная пагроза. З мёртвым ворагам так не змагаюцца. Мёртвага так не ненавідзяць*“ (апошняе падкрэсьлена мной—К. К.)[1].

Але атрымаўшая перамогу рэакцыя ў моры крыві зьверскімі экзэкуцыямі імкнулася задушыць рэволюцыю і думала гэтым супакоіць сялянскія масы. Але гэтая дзікая расправа і перамога рэакцыйнага ўраду былі часовымі. Сялянскія масы глыбака затаілі мару аб зямлі, якую яны спадзяваліся атрымаць дарма. Барон Нолькен, Магілеўскі губарнатар, аб рэволюцыі 1905 году толькі ў 1908 годзе пісаў:

„Вслед за волною революционного движения на политической и аграрной почве течение местной жизни, войдя в мирное естественное русло, приняло, наконец, направление желаемое всею благоразумною (чытай памешчыкамі і буржуа—К. К.) подавляющею частью населения и в этом отношении счастлив отметить 1908 год, как прочное начало вступления губерний на путь созидательного труда“[2].

Такім чынам, толькі ў 1908 годзе губарнатар меў магчымасьць адзначыць, што рэволюцыйны рух спыніўся. Гэта была маленькая перадышка пасьля разгрому рэволюцыі, пасьля зьверскіх расправаў ураду. Але мы мусім сьцьвярджаць, што новыя сутычкі пачаліся ўжо з 1908 г., яны сьведчылі, што старыя супярэчнасьці ня былі зьнятымі, а наадварот, яшчэ больш абвастрыліся. Зразумела, сялянская маса не пакінула сваіх думак, як гэта здавалася барону Нолькену, які ў тойжа справаздачы на „высачайшае імя“—пісаў:

„Главное ядро населения—крестьянская масса разочаровалась в своих ожиданиях „Земли и Воли“, не возлагает больше надежд на Государственную Думу и, почти нисколько не интересуясь её деятельностью, всё более и более проникается убеждением в утопичности социалистических мечтаний о даровом отчуждении в пользу крестьян памещичьих земель... И идет на встречу деятельности учреждений, призванных осуществить землеустроительные акты“[3].

Што сялянская маса расчаравалася ў Дзяржаўнай Думе, гэта можа быць і так, але каб сялянства кінула надзею атрымаць панскую зямлю дарма, тут барон Нолькен глыбака памыляўся. Аб гэтым сьведчыць і ніжэйшы разгляд аграрнага руху і сама рэволюцыя. Думка аб атрыманьні дарма зямлі глыбака ўвайшла ў масы, і ў той час, калі кулак рабаваў вёску на падставе сталыпінскіх законаў, гэта думка яшчэ больш замацоўвалася сярод бядняцкіх мас сялянства. Аб гэтым сьведчаць усе выступленьні сялянства супроць паноў да часу імпэрыялістычнай вайны. Гэта служыла і моцным стымулем у распачатых клясавых бойках.

Сялянства вяло барацьбу з лятыфундыямі прыгоншчыкаў, якія душылі яго, за тып аграрнага капіталізму, які Ленін называў „амэрыканскім“. Але ў гэтай агульнай барацьбе ўсяго сялянства супроць памешчыкаў трэба падкрэсьліць насьпеўшыя супярэчнасьці ўнутры сялянства, якія выкліканы былі разьвіцьцём капіталізму. Сялянства

[1] Ленін У. І., т. XII, стар. 405.
[2] ЛОЦИА МВД деп. общ. дел., № 105, 1910 г.
[3] ЛОЦИА МВД общ. дел., № 105, 1910 г.

хутка дыфэрэнцуецца, выдзяляе з сябе вясковую буржуазію—кулацтва, з аднаго боку, і, з другога боку, масы сялянства выходзяць у рады пролетарыяту і вясковай беднаты. І калі ўсё сялянства вяло барацьбу супроць памешчыка, то ўнутры яго ўжо склаліся клясавыя групоўкі і бедната ўжо часта выступала супроць мясцовага кулака, які, выкарыстаўшы сталыпінскія законы, рабаваў вёску. Зразумела, што асобным струменям у гэтай барацьбе адпавядалі і вызначаныя клясавыя групоўкі на вёсцы. Ленін пісаў:

„У пытаньні аб сучаснай сялянскай барацьбе за зямлю мы павінны адрозьніваць *чатыры асноўныя групы* зямельных уладаньняў: 1) маса сялянскіх гаспадарак, прыдаўленых прыгоньніцкімі лятыфундыямі і непасрэдна зацікаўленымі ў іх экспропрыяцыі непасрэдна і ўсяго больш выйграваючыя ад такой экспропрыяцыі. 2) невялікая меншасьць сярэдняга сялянства, якое мае ўжо цяпер прыблізна сярэднюю, дазваляючую зноснае гаспадараньне, колькасьць зямлі, 3) невялікая колькасьць заможнага сялянства, якое абарачецца ў сялянскую буржуазію і радам паступовых пераходаў зьвязанае з капіталістычным гаспадарчым землеўладаньнем, 4) прыгоньніцкія лятыфундыі, далёка перавышаючыя сваім памерам капіталістычныя экономіі данай эпохі ў Расіі і ўсё больш атрымліваючыя прыбытак ад кабальнай і адпрацовачнай эксплёатацыі сялянства.

...Такавы асноўны фон таго поля, на якім разгортваецца сялянская барацьба за зямлю. На гэтым асноўным фоне нязьбежна паразіцельная адсталасьць тэхнікі, закінутае становішча земляробства, прыдаўленасьць і забітасьць сялянскай масы, бяз конца разнаітыя формы прыгоньніцкай паншчыннай эксплёатацыі. Гваздом барацьбы зьяўляюцца прыгоньніцкія лятыфундыі, як самае выдатнае ўвасабленьне і самая моцная апора рэштак прыгоньніцтва ў Расіі. Разьвіцьцё таварнае гаспадаркі і капіталізму з абсолютнай нязьбежнасьцю кладзе канец гэтым рэшткам. У гэтых адносінах перад Расіяй толькі адзін шлях буржуазнага разьвіцьця“ [1].

Вось бліскучы аналіз і зьмест разгорнутай барацьбы між сялянствам і памешчыкамі, і ясна, што ўсё вышэйсказанае Леніным зьяўляецца падагульненьнем тых фактычных даных, якія мы прывялі вышэй аб тых супярэчнасьцях, якія ляжалі між памешчыкамі і сялянствам, а таксама і ўнутры самога сялянства. З тых часоў, як былі напісаны гэтыя радкі Леніным, супярэчнасьці яшчэ больш абвастрыліся, капіталізм вырыў яшчэ большую яму для лятыфундый, яшчэ больш завастрыў барацьбу за зямлю.

Барацьба сялянства пасьля 1905 году на Беларусі прарываецца і выяўляецца па асобных мясцох, гэты рух мае як-бы адзіны зьмест, адзіны кірунак—гэта барацьба з лятыфундыямі абшарнікаў, з перажыткамі прыгоньніцтва за „амэрыканскі“ шлях разьвіцьця капіталізму. Але ў гэтай барацьбе трэба адрозьніваць некалькі струменяў, якія зьявіліся пад уплывам насьпелых супярэчнасьцяў унутры самога сялянства. Гэтыя супярэчнасьці былі выкліканы разьвіцьцём капіталізму і яго прасяканьнем у сялянскую гаспадарку. І калі супроць абшарніка выступала ўсё „сялянства“, дык у вёсцы мы наглядаем барацьбу беднаты і маламоцнага сялянства з кулацтвам, якое рабавала абшчыну і вёску на падставе сталыпінскіх законаў.

Бязумоўна, асобна трэба разглядаць барацьбу сельска-гаспадарчага пролетарыяту, гэтая барацьба ў сваіх мэтах зьлівалася з барацьб-

[1] Ленін У. І., т. IX, выд. 1, стар. 432-433.

бою рабочае клясы—супроць пана і супроць буржуазіі. Аб барацьбе сельска-гаспадарчага пролетарыяту ў данай працы мы гаварыць ня будзем, бо гэта асобная галіна дасьледваньня.

Барацьба за „амэрыканскі шлях“ разьвіцьця разгортвалася ў пэўных соцыяльна-экономічных абставінах, якія крыху былі ўжо апісаны вышэй. Часамі два зазначаныя струмені барацьбы пераплятаюцца ў надзвычайна складаным малюнку.

Прычыны аграрных хваляваньняў і пасьля рэволюцыі 1905 году застаюцца „старыя“. Успомнім, якія патрабаваньні высоўвала сялянства супроць памешчыка ў часе рэволюцыі 1905 году. Вось маленькі прыклад: сяляне вёскі Суловы 18 сьнежня 1905 году, зьявіўшыся ў маёнтак памешчыка Касьпера Будзіскага ў Пінскім павеце, прад'явілі наступныя запатрабаваньні:

1) дазволіць высечку лесу на дровы па ўсяму маёнтку,

2) з усяго маёнтку перадаць ва ўласнасьць сялян урочышчы Загуменьне і Загароды, якія знаходзяцца пры самай усадзьбе,

3) дазволіць бясплатны збор ягад і грыбоў па ўсіх лясох маёнтку,

4) заплаціць сялянам за ўсе тыя работы ў маёнтку Суловы, якія былі выкананы сялянамі бясплатна на працягу апошніх 16-ці год за права пасьбы жывёлы на землях маёнтку,

5) зьвярнуць сялянам грошы, якія былі ўнесены імі за той-жа тэрмін за права збору ягад і грыбоў у лесе,

6) зьвярнуць усе штрафы, якія былі ўзысканы памешчыкам паводле судовых пастаноў за самавольныя высечкі, пасьбу жывёлы і г. д.[1].

Тут адбіліся як у люстры ўсе перажыткі прыгоньніцтва, люты голад на зямлю, адсутнасьць выгану і эксплёатацыі памешчыкам усякага роду перажыткаў фэўдалізму.

Якія-ж былі прычыны аграрнага руху пасьля 1905 г., што выклікалі частыя і нярэдка крывавыя сутычкі як з адміністрацыяй маёнтку, так і з поліцыяй? Першай галоўнай прычынай быў люты зямельны голад сялянскай масы, недахват сенажаці, выгану і г. д. На Меншчыне, на якой мы галоўным чынам спынім сваю ўвагу, прычынай асабліва частых сутычак былі: сенажаць, выган, сэрвітуты, якія капіталізаваўшыся панскі ці арандатарскі маёнтак пры ўсякім выпадку захопліваў, адмаўленьне ў арэндзе,—усё гэта яшчэ больш абвастрала зямельны голад сялянства. Спрыяючая рыначная коньюнктура і ўзмоцнены процэс капіталізацыі маёнткаў давіў яшчэ больш на сялянства, якому часта пан адмаўляе ў арэндзе, і захопліваў спрэчныя вучасткі зямлі.

Патравы — гэта самы пашыраны спосаб барацьбы сялянства з маёнткам, на гэтай глебе адбылося многа сутычак. Пры гэтым разумеюцца патравы масавыя, калі цэлая вёска, ці яе пэўная частка травіла панскія сенажаці і гэтым рабіла наступ на панскі маёнтак. Такога-ж тыпу маем буйную сутычку ў маёнтку „Навасёлкі“ Ігуменскага павету, Менскай губэрні. Гэты маёнтак належаў князю Радзівілу і з 1910 году быў у арэндзе дваран Рымашэўскіх Антона і Сьцяпана. Абвінавальны акт Менскага акруговага суду малюе справу так:—Яшчэ з вясны 1911 году сяляне вёскі Навасёлкі пачалі выганяць коняй на панскі луг. Рымашэўскія нібы зварочваліся да грамады вёскі, але сяляне заявілі, што ў іх існуе звычай пасьвіць жывёлу на панскім лузе да 9 мая. Вясной 1912 году паўтарылася тая-ж самая зьява. Аднойчы Рымашэўскія, зьявіўшыся на луг з лясьнікамі, хацелі забраць

[1] МГА акр. суд., крым. ад., зьвязка 861, № 30068.

коняй, але пачуўся трэск—сяляне ламалі калы, і калі Рымашэўскія пад'ехалі бліжэй, дык хтосьці запытаў — „хто тут старшы?“, і калі Рымашэўскі абазваўся, дык нехта крыкнуў—„беце іх, больш езьдзіць ня будуць“. Арандатары прымушаны былі ўцячы. Непасрэднай прычынай сутычкі паслужыла наступнае. 5 мая старожа і 2 „чэркесы“-інгушы (якіх трымалі многія паны на Беларусі пасьля рэволюцыі 1905 г. для аховы) зьбілі сялянскіх хлопчыкаў нагайкамі і вельмі напалохалі іх стралянінай. На сьледзтве Рымашэўскія трымаліся далікатна, а звычайна з сялянамі яны размаўлялі нагайкамі, што ў сваіх паказаньнях падкрэсьлівалі сяляне, прыцягнутыя да судовай адказнасьці. 5-га мая коні былі забраны ў маёнтак. Гэтая акалічнасьць выклікала абурэньне ў вёсцы і вось 6-га мая натоўп чалавек у 100 накіраваўся ў маёнтак; кухарка Рымашэўскіх першая заўважыла натоўп і крыкнула, што сяляне ідуць іх забіваць. У маёнтку пачаўся перапалох, пабеглі шукаць „абаронцаў“ інгушаў. Натоўп, падышоўшы да ганку, запатрабаваў аддаць коняй. Насустрач выскачылі ігнушы—адзін з вінтоўкай, а другі з рэвольвэрам і загадалі, каб натоўп адышоў. На сьледзтве і судзе істцы ўсімі мерамі імкнуліся давесьці, што сяляне першыя пачалі зьбіваць ігнушаў. Але справа была іншая, як відно з паказаньня сялян, ігнуш, які стаяў на ганку, першы стрэліў, а пасьля стрэліў і другі. Пасьля гэтага натоўп накінуўся на іх і зьбіў каменьнямі і кольлямі і апабраў аружжа. З сялян паранена было 2 чалавекі—Сямён Кашлыч і Сьцяпан Батура. Цікава адзначыць, што калі Рымашэўскі вышаў, спачатку яго ня было, бо ён, бачыце, ня мог глядзець „на дзікую сцэну“, дык адзін з сялян сказаў: „Аддай, панок, коні, ато каб і табе гэтага ня было“. Гэта вельмі характарна, характарна і тое, што арандатараў сяляне не баяліся і сьмела выступалі супроць іх. Прычына гэтага была ў тым, што сяляне лічылі землі маёнтку сваімі і, ясна, у асобе арандатараў яны бачылі конкурэнтаў на панскую зямлю. Характарна яшчэ і тое, што сяляне не баяліся арандатараў. Так нібы на запытаньне Рымашэўскага, чаму пасьвяць жывёлу, сяляне адказалі—„Гэта ня ваша справа, будзем пасьвіць і вас не баімся“. Цікава адзначыць, што Рымашэўскі як на вінавайцаў паказвае на салдат, якія прыехалі з вайсковай службы і „падбухторваюць сялян на самавольную пасьбу“.

По гэтай справе акруговы суд судзіў дванаццаць чалавек, і цікава падкрэсьліць, што ўсе сяляне ў сваіх паказаньнях аднадушны. Так галоўны абвінавачаны Пётра Жук гаворыць—„сенакосу ў нас мала і хаця сяляне мелі права пасьбы па лесе, але ў князя Радзівіла шмат культурных пасадак у лесе... нам няма чым карміць жывёлу і коняй; чэркесы б'юць людзей нагайкамі“ [1].

Гэты інцыдэнт ясна даводзіць, з аднаго боку, наступ капіталізаванага маёнтку на сялян; культурныя пасадкі—гэта толькі падставы захапіць сэрвітут у лесе. Арандатары, відаць, ставілі гаспадарку так, каб выкарыстаць усе ўдоб'і і, значыць, яшчэ больш сьцясьніць сялян сенажацямі. На грунце гэтага спрэчкі між вёскай і маёнткам абвастраліся. Недахоп сенажаці і зямлі ў сялян—вось прычына наступу сялян на маёнтак. Сяляне заяўляюць права на панскую зямлю і рух супроць маёнтку адліваецца ў самыя рознастайныя формы. Рэволюцыя 1905 г. навучыла не баяцца аружжа і ўзброеных стражнікаў.

Яшчэ больш сутычак між сялянствам і маёнткам адбылося ў Піншчыне і ў Мазыршчыне. З прычыны патраў адбыўся ў 1913 г. вельмі востры інцыдэнт у маёнтку „Дварэц“ Пінскага павету, які нале-

[1] Мен. Гіст. Арх. Фонд МАС, справа № 38, 387.

жаў Казімеру Шчыту. Вінаватыя 5 чалавек былі прыцягнуты да судовай адказнасьці і пакараны зьняволеньнем па 8 месяцаў кожнаму. У тым-жа павеце адбылася больш цікавая справа. За патравы з сялян вёскі Альшанкі земскім начальнікам на карысьць памешчыцы Караліны Скірмунт было прысуджана 700 руб. Ясна, што сяляне гэтай сумы не заплацілі і прыстаў апісаў сялянскую жывёлу і прызначыў яе на продаж з публічных таргоў. Зразумела, у вызначаны тэрмін сяляне жывёлы ня прыгналі на таргі, і прыстаў нічога ня мог зрабіць. Тады ў вёску адправіўся сам спраўнік з 27 коннымі і некалькімі пешымі стражнікамі. Даведаўшыся аб гэтым, сяляне пачалі зьбягацца, хто з граблямі, хто з калом, каб ня пусьціць паліцыю праехаць праз гаць і гэтым выратаваць жывёлу. Іспраўнік Ансенс загадаў конным стражнікам кар'ерам прарвацца праз гаць,—яны праехалі праз натоўп. Таму-сяму перапала з паліцыі, раздаліся крыкі „бей полицию". Але сьледзтва нічога не гаворыць аб тым, колькі было растаптана сялян на гаці. Клясавы суд прыцягвае да адказнасьці сялян гэтай вёскі ў ліку 16 чалавек за „вооруженное сопротивление власти". 16 чалавек судзіў акруговы суд, прычым у ліку падсудных быў і семідзесяцігадовы дзед[1]. Бязумоўна, што такія выпадкі не маглі ня выклікаць страшэннага абурэньня, не маглі рэволюцыянізаваць масы на барацьбу з абшарнікамі. Усё гэта гаварыла аб тым, што набралася многа супярэчнасьцяў між экономіяй, абшарнікам і сялянствам вёскі. Яшчэ больш сур'ёзная справа з крывавымі вынікамі адбылася ў тым-жа павеце ў Кожан-Гарадзецкай воласьці ў маёнтку „Вулька" ў 1912 годзе. Тут прычынай выбуху былі сэрвітуты і зноў-жа пасьба жывёлы. Затрымаемся на гэтай буйной справе больш падрабязна.

Меншчына мела найбольш сэрвітутаў—гэтых жывых абломкаў фэўдалізму. Сэрвітут быў у маёнтку „Вулька". Ён паслужыў прычынаю крывавай сутычкі. Цікава адзначыць, што непаразуменьні асабліва абвастрыліся пры новым уласьніку маёнтку.

Дваране Казімер і Юзаф Шчыты прадалі маёнтак „Вульку" Давыдаву. У дагаворы было ўказана, што даны маёнтак „обременен сервитутами". Абвінавальны акт, зразумела, малюе справу так, што сяляне нібы карыстаючыся тым, што зьявіўся новы ўласьнік, хацелі завесьці новы парадак—пасьвіць жывёлу па ўсяму маёнтку, у той час, як сяляне мелі права толькі на лясы, якія акружалі іх надзелы. Але з справы відаць, што ўласьнік маёнтку, пры дапамозе земскага начальніка, адмежаваў сялянам сэрвітут у адным месцы, у той час, як паводле докумэнтаў сяляне мелі іх у некалькіх мясцох. Тут проста земскі начальнік узаконіў рабаваньне сэрвітутаў маёнткам. Ясна, што сялянскія скаргі на земскага начальніка засталіся без адказу і сяляне дабіваліся свайго права пасьвіць жывёлу па старых мясцох. Усё гэта паслужыла прычынаю, што старыя супярэчнасьці між маёнткам і сялянствам аджылі з новай сілай. Сяляне пачалі пасьвіць жывёлу па ўсяму маёнтку, адміністрацыя і лясьнікі забіралі сялянскую жывёлу,—гэта выклікала страшэннае азлабленьне. Сяляне пагражалі зруйнаваць маёнтак.

22 красавіка 1913 году кіраўнік маёнтку „Вулька" Лявон Кіслоў, даведаўшыся, што сяляне пасьвяць жывёлу ня там, дзе ім было паказана, захапіў канторшчыка і лясьнікоў і паехаў на месца. Яны хацелі забраць сялянскую жывёлу. Але як толькі выгналі жывёлу з балота на дарогу, дык з вёскі Вулька прыбеглі „ўзброеныя" каламі і палкамі

[1] Мен. Гіст. Арх. Фонд Менскага Акруг. Суду. Справа № 38893, 1914 г.

сяляне ў ліку да 100 чалавек і пачалі адбіваць жывёлу. Пазьней да іх на дапамогу падбеглі і сяляне з суседняй вёскі Бродніцы ў ліку 20 чалавек. Сяляне пачалі зьбіваць лясьнікоў і аднаго з іх, Сьцяпана Кучарэнку, паваліл і хацелі затаптаць у балота (аднак гэты факт у сваіх паказаньнях сяляне адмаўлялі). Жывёлу сяляне адбілі. Кіраўнік маёнтку Кіслоў па тэлефону зьвярнуўся за дапамогай да прыстава Благавешчынскага, бо ў той-жа дзень, як інкрымінуецца, сяляне вёскі Бродніцы разьнесьлі старожку лясьніка Багачэнкі. На справе ў старожцы лясьніка былі выбіты некалькі шыб і крыху пасечаны тапаром дзьверы.

Раніцою прыстаў з вураднікам і трыма стражнікамі зьявіўся ў маёнтак. Раніцой-жа лясьнік Багачэнка паведаміў па тэлефону, што каля яго старожкі сабраўся натоўп сялян, чалавек у 50, які быў узброены каламі; натоўп накіраваўся да маёнтку, у 2-3 вярстах ад маёнтку прыстаў з стражнікамі і кіраўнічым спынілі натоўп і прыстаў „у звычайным тоне“ павёў з сялянамі размову аб іх патравах і адносінах да маёнтку. Сяляне заявілі, што ад свайго права не адступяцца. Прыстаў распачаў бойку, даў аднаму селяніну ў зубы. Сяляне накінуліся на прыстава і пачалі яго зьбіваць. Ураднiку Васілю Акуліч, які падскочыў на дапамогу, нехта ўсадзіў нож у руку. Прыстаў выхапіў шашку і разам з вураднікам пачаў рубіць направа і налева. Выскачыўшы з натоўпу, прыстаў аддаў загад стражнікам—страляць. Залпам адзін з сялян быў забіты на месцы, адзін цяжка паранены ў чэрап і некалькі чалавек былі паранены шашкай прыстава і ўрадніка. Як выявіла сьледзтва—страляў з браўнінга і Кіслоў, хаця ў судзе ён даводзіў, што страляў уверх, стралялі і лясьнікі. Як толькі натоўп адступіў пасьля залпу, прыстаў выкарыстаў момант—ускочыў з ураднікам у брычку і пад градам палак ускакаў у маёнтак.

Як бачым, і тут супярэчнасьці між маёнткам і сялянствам былі надзвычайна вострыя. Даны маёнтак, бязумоўна, капіталізаваўся; так, тэлефонамі былі зьвязаны старожкі лясьнікоў з канторай—гэта сьведчыць аб капіталізацыі. Ясна, што перажыткі прыгоньніцтва, сэрвітуты, перашкаджалі правільнай арганізацыі гаспадаркі і маёнтак іх проста рабуе ў сялян. Бязумоўна, што гэта рабаваньне мусіла выклікаць адпор. Сялянста расчаравалася ў падачы скаргаў і перайшло да беспасрэднай барацьбы.

У выніку гэтай сутычкі было заарыштавана і перадана суду 11 чалавек. Цікава адзначыць, што ў гэтым руху ў маёнтку Вульцы прымалі ўдзел ўсе праплласткі сялянства. Але ясна, пад суд трапіла найбольш беднаты, якая мела ад $^1/_2$ надзелу да $^1/_{12}$. Клясавы дваранскі суд засудзіў усіх абвінавачаных, ня гледзячы на тое, што ніводзін з падсудных ня прызнаў сябе вінаватым. Мы мусім адзначыць, што гэты інцыдэнт меў значнае рэволюцыянізуючае значэньне: „нашы білі прыстава“—перадавалася з аднэй вёскі ў другую [1].

Думаецца, што ўжо гэтыя факты, якія мы прывялі, сьведчаць аб новым ажыўленьні аграрнага руху, аб тым, што апошні нанова пачаў актывізавацца, што рэволюцыя глыбака захавалася ў сялянскіх масах. Разьвіваючыйся капіталізм уласна патрабаваў зьнішчэньня перажыткаў прыгоньніцтва. Але дваране і ўлада, якая стаяла цалкам за іх інтарэсы

[1] Мен. Гіст. Арх. Фонд МАС, справа № 73903, 1912 г. Па прыгавору суду Мікалая і Грыгора Ванюкоў пазбавілі ўсіх праў і аддалі ў папраўчыя арыштанскія аддзяленьні тэрмінам на 1 год і 3 месяцы. Якава Пясоцкага, Андрэя Макейчыка, Луку Яраховіча, Язэпа Паўловіча пазбавілі праў і заключылі ў турму тэрмінам на 8 месяцаў кожнага.

імкнуліся зьнішчыць гэтыя перажыткі, правесьці „чыстку“ за кошт сялянства. Сяляне-ж, наадварот, імкнуліся „чыстку“ зрабіць за кошт дваранства. Абшарнікі пры дапамозе ўлады пускаюцца на ўсякія махінацыі, каб пакінуць за сабой сэрвітуты. Цана на зямлю ў той час была вельмі высокая, за яе можна было выручыць вялікія грошы, і таму сэрвітуты адбіраюцца ад сялян на ўсякіх падставах, з якіх галоўнай была пастаноўка правільнае ляснoе гаспадаркі. Цікавы ў гэтых адносінах прыклад маем у Данілавіцкім лясьніцтве князя Радзівіла, дзе ад сялян вёскі Малой Усы на вышэйпаказанай падставе былі адабраны сэрвітуты. Данілавіцкае лясьніцтва ўваходзіла ў склад вялізнай лятыфундыі князя Радзівіла. Сяляне вёскі Малой Усы карысталіся пасьбай жывёлы па лесе, за што адпрацоўвалі ля месяцу на карысьць князя. Вось перад намі жывыя перажыткі прыгоньніцтва. Калі адміністрацыя князя Радзівіла пажадала завесьці правільную лясную гаспадарку, сялянам забаранілі пасьвіць жывёлу ў лесе.

Аднак, сяляне глядзелі на гэтую пасьбу як на сваё неад‘емнае права і, ня гледзячы на забарону, усёроўна пасьвілі жывёлу па лесе. Адміністрацыя лясьніцтва надумала паставіць плот, для чаго 25 красавіка 1912 году аб‘езчык Хмялеўскі і 19 цесьляроў прыбылі ў лес і пачалі будаваць плот. Яны ўжо паставілі да 20 сажняў плоту, як к месцу іх працы зьявіўся вялікі натоўп. Натоўп заявіў, што ён не дазволіць ставіць плот і г. д. З крыкам кінуўся натоўп на плот і зьнішчыў яго на працягу 20 сажняў. У гэтым учынку прымала ўдзел і зьбяднелая шляхта, выкінутая разьвіцьцём капіталізму ў рады зусім зьбяднелых гаспадароў. У гэтым натоўпе больш за ўсіх крычаў дваранін Язэп Зэнглігер—„надо убивать всех этих гадов князей и прочих“ [1]. Значны ўдзел у гэтай справе прымалі і жанчыны. З 14 падсудных было 7 жанчын. Цікава адзначыць, што і тут выяўляецца тая-ж думка, якую масы сялянства глыбака затаілі і якая стымулявала іх барацьбу,— што зямля належыць ім. На глебе сэрвітуту адбываліся інцыдэнты і праявы аграрнага руху ў былым Ігуменскім павеце. Капіталізаваўшыся, маёнтак пашыраў сваю запашку і для гэтага імкнуўся захапіць сялянскія сэрвітуты, якія служылі для сялян выганамі.

Справа адбывалася ў маёнтку „Буды“ пана Гамаліцкага. 17 красавіка 1912 году ў урочышча Высокі Стан прыехаў аб‘езчык з 4 рабочымі і пачаў араць поле. У хуткім часе зьявілася чалавек 10 жанчын з вёскі Чорнагрудзьдзе, якія заявілі, што гэта зямля належыць ім і адведзена пад выган. Хутка натоўп павялічваўся і спыніў працу рабочых. Праўда, кіраўнік маёнтку Зарэмба выкарыстаў момант і ўвечары заараў гэтую зямлю і пасеяў авёс, але калі 20 красавіка рабочыя зьявіліся баранаваць, дык сустрэлі вялікі натоўп жанчын, якія, узброіўшыся кольлямі, не далі працаваць.

Па гэтай справе было прыцягнена да адказнасьці 16 жанчын і 1 мужчына. Усе былі засуджаны ад 5 да 8 месяцаў, ня гледзячы на тое, што сярод іх было 2 жанчыны па 60 гадоў і 2 па 80 [2]. Ня гледзячы на тое, што сяляне сапраўды мелі ў гэтым месцы сэрвітут, маёнтак адабраў яго ад вёскі, а клясавы суд пакараў сялян. Як бачым, перад намі нічым няпрыкрытае рабаваньне сэрвітутаў капіталізаваным юнкерам.

Больш сур‘ёзная сутычка адбылася у маёнтку „Заямнае“ абшарніцы Калодкінай. Апошняя адмовіла сялянам у пасьбе жывёлы па

[1] Мен. Гіст. Арх. Фонд МАС Справа № 38413, 1912 г.
[2] Мен. Гіст. Арх. Справа № 38494, 1912 г.

лясох, сенажацях і палёх і судом гэтая забарона была падмацавана. Аказалася, што да 1901 году сяляне за адпрацоўкі пасьвілі жывёлу амаль па ўсім маёнтку. Зразумела, што гэта забарона выклікала ў сялян страшэннае абурэньне—пачаліся патравы. Трэба сказаць, што гэтая забарона зноў-жа была выклікана капіталізацыяй маёнтку. Прыметы нарастаючага руху супроць маёнтку пачалі выяўляцца яшчэ ў ліпні 1911 году, калі зроблены былі вельмі значныя патравы ў маёнтку. Зьявіўся прыстаў і хацеў дапрасіць па гэтай справе сялян, але большасьць з сялян зусім не зьявілася. Калі праз некалькі дзён рабочыя з эканоміі з кіраўнічым Дабравольскім зьявіліся ў урочышча „Куляшоўку“, каб заараць зямлю, яны знайшлі там жанчын, якія заявілі, што араць не дазволяць. Натоўп чалавек у 40 перашкаджаў працаваць рабочым, сьцягвалі коняй з баразнаў, жанчыны клаліся з груднымі дзяцьмі ўпоперак баразны, каб гэтым спыніць рух коняй. Эканом Дабравольскі зьвярнуўся да прыстава Бекарэвіча, які прыехаў з 3 стражнікамі на месца работ. На пытаньне—чаго хочаце, сяляне ў адзін голас заявілі, што зямля іх, араць яе яны не дадуць. Прыстаў загадаў не рабіць перашкоды ў працы, бо ў праціўным выпадку сяляне будуць адказваць і загадаў рабочым распачаць працу. Але, як толькі коні крануліся—натоўп зноў спыніў іх. Тады прыстаў пачаў перапісваць сялян і запісаў 31 чалавека, але гэты факт толькі падліў масла ў агонь. Урэшце прыстаў загадаў стражнікам адціснуць натоўп і апошнія пачалі зьбіваць сялян. Васіль Шчурэвіч 80 год, відаць, вельмі заможны селянін, які меў між прысутнымі сваякоў, быў так зьбіты, што хутка памёр. У стражнікаў паляцелі каменьні і палкі, Васіль Герлоўскі з каменем кінуўся да прыстава і толькі наведзеныя рэвольвэры стражнікаў спынілі яго. Урэшце паліцыя кінулася наўцекі, пад градам каменьняў паўскакала на коняй і, як піша сам прыстаў, „преследуемые толпой бросавших камни уехали[1]. Па гэтай справе былі прыцягнены 18 чалавек і засуджаны ад 1 да 4 гадоў турмы.

У данай вёсцы, як і ва ўсёй Сьмілавіцкай валасьці, кіпела страшэннае абурэньне, а бясконцыя суды з абшарнікамі за зямлю і страты па іх яшчэ больш узбуджалі масы, сяляне згубілі ўжо ўсякую надзею дабіцца „праўды“ ў судзе, рэволюцыйны рух нарастаў, сялянства ішло на рэволюцыйныя выступы.

Прыстаў у сваіх паказаньнях адзначае, што насельніцтва Сьмілавіцкай валасьці „вообще нельзя назвать спокойным. Крестьяне повсюду возбуждены, потому нет такого селения, где-бы крестьяне не самоуправствовали подобно крестьянам деревни Калиты“. На пытаньне адкуль гэта бярэцца, між іншым, прыстаў паказаў, што сяляне Андрэй Шчурэвіч і Барыс Сушчынскі былі на службе ў Пухавіцкай валасьці ў вядомага соцыял-рэволюцыянэра Бонч-Асмалоўскага. Такім чынам, маем спасылку на работу эсэраў.

Але трэба падкрэсьліць, што толькі соцыял-дэмократычная партыя, як мы бачылі вышэй, вяла вялікую работу сярод сялянства, што толькі гэта работа давала свае вынікі, а ня эсэраўская, як гэта паказана ў Марахаўца. Эсэры к гэтаму часу цалкам выявілі свой твар—дробна-буржуазнай партыі; бліскучы клясавы аналіз іх програмы і тактыкі быў даны Леніным. Тое, што бальшавікі вялі работу сярод сялянства, падкрэсьлівае і Палескі камітэт РСДРП у сваім органе[2].

[1] Мен. Гіст. Арх. МАС № 37759, 1912 г.

[2] Поташ М.—Бальшавізм і дробна-бур. партыі на Беларусі ў эпоху рэв. 1905 г. Зьвязда № 3—1931 г.

Як бачым, прычын, якія выклікалі хваляваньне і аграрны рух, было шмат, усяго нават не пералічыш, што падагравала барацьбу сялян. Рабаваньне капіталізаваным маёнткам сялянскіх сэрвітутаў, якія сяляне лічылі сваімі, страшэнная зямельная цяснота маламоцнага сялянства рабіла становішча масы вельмі цяжкім. Усе прыведзеныя прыклады сьведчаць, што аграрны рух пасьля рэволюцыі 1905 году ўвесь час нарастаў.

Мы мусім адзначыць яшчэ раз, што прычын, якія выклікалі рух, было вельмі многа. Аднэй з іх вельмі важнай была адмова сялянам у арэндзе. Так яшчэ ў 1907 годзе маёнтак „Вялікія Арлы“ князя Радзівіла адмовіў сялянам у арэндзе. Гэта выклікала значны рух і шматлікія сутычкі з стражай[1]. У маёнтку Велепольскай Бабруйскага павету пры аднаўленьні межавых знакаў у 1911 годзе 7 кастрычніка паміж сялянамі вёскі Вязычына і каморнікам адбылася сутычна з-за кавалку зямлі, які названыя сяляне лічылі сваім. Натоўп ня даў ставіць слупоў, а ўжо пастаўленыя павыкідваў і пазакідаў вырытыя ямы. Па гэтай справе было прыцягнена да адказнасьці 14 чалавек, з якіх было 12 жанчын[2]. Маем цікавы прыклад сутычкі з заможнікамі, якія купілі зямлю, на якой калісьці быў сэрвітут. З маёнтку Піатровічы былога Ігуменскага павету паверaны пана Бэкмана Шут запрадаў $23^1/_4$ дзесяціны зямлі сялянам вёскі Шаметава, відаць, пяці братом Лучыкам у ўрочышчы „Вялікі Лес“. 21 кастрычніка 1911 году Нікіта Лучык прыступіў да распрацоўкі набытае зямлі. Але зьявіліся сяляне вёскі Дзяханы і запатрабавалі даць тлумачэньне, чаму распрацоўваецца іх зямля, пры гэтым заявілі, што яны знаць ня хочуць Бэкмана, што яны заўсёды пасьвілі сваю жывёлу тут і будуць і далей пасьвіць. Пагражаючы тапарамі, яны выпраглі коняй і прагналі Лучыка з работы. Аказалася, што сяляне некалі мелі тут сэрвітут, але паверaны пана Бэкмана Шут раздабыў ад Менскага лесаахоўчага камітэту дазвол на расчыстку 9.000 дзесяцін. Лес быў ім высечаны, а зямля распрадавалася. Пан Бэкман і яго даверaны Шут лічылі, што сэрвітут быў у сялян па лесе, а калі лес сьсечаны, дык, на іх думку, сэрвітут зьнішчыўся. Сяляне-ж думалі іначай і лічылі, што гэтая зямля належыць ім. Такім чынам, маёнтак, абрабаваўшы сялянскую масу, распрадаваў зямлю асобным кулаком. Тут мы спатыкаемся з цікавым пераплётам барацьбы сялян і супроць абшарніка і супроць кулака.

Усе прыведзеныя вышэй факты сьведчаць аб аджыўшым нанова аграрным руху, аб аднoўленай барацьбе сялянства з абшарнікамі. Рэволюцыя 1905 году ня зьнішчыла старых супярэчнасьцяў і перажыткаў прыгоньніцтва, не дала перамогі „амэрыканскаму“ шляху разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Атрымаўшая верх рэакцыя дзікім тэрорам сьпяшалася расправіцца з рэволюцыяй на сяле. Але рэволюцыя 1905 г. шмат чаму навучыла асноўную зруйнаваную частку сялянства. Сьвядомасьць расла, тым больш, што з далейшым разьвіцьцём капіталізму яшчэ больш нясьцерпнымі былі старыя супярэчнасьці, яшчэ больш цяжкім зрабіўся ўціск лятыфундый і перажыткаў прыгоньніцтва. Як бачым, прычыны сутычак з абшарнікамі засталіся старыя, але цяпер яны яшчэ бальней білі па бядняцка-серадняцкай частцы сяла. Масы нанова распачынаюць змаганьне з абшарнікамі, навучаныя практыкай мінулай барацьбы. Ува ўсёй гэтай барацьбе з абшарнікамі, дзе, бязумоўна, прымала ўдзел і заможная частка вёскі, *праглядвае адна*

[1] М. Г. А. Ф. МАС, справа № 37759.
[2] Мін. Гіст. Арх. Фонд МАС, справа № 36546.

*думка,—што ня толькі сэрвітут, але зямля наогул, уся панская зямля—наша.* У рэволюцыю 1905 году масы сялянства ішлі ў бойку з абшарнікамі об'ектыўна—гэта яны стаялі за амэрыканскі шлях: гэта азначала, што сялянства імкнулася вырашыць аграрнае пытаньне на сваю карысьць, а не за шлях разьвіцьця капіталізму „прускі", які бесканечна паступова, цягуча вёў да зацяжнага выміраньня шырокіх мас. І сапраўды, мы бачылі, як капіталізаваны юнкер паступова сьціскаў вёску адбіраючы выганы, арэнду, сэрвітуты. Рабілася гэта пры дапамозе ўлады, у першую чаргу земскіх начальнікаў, якія ўстанаўлялі межы сэрвітутаў, іначай кажучы, узаканялі рабаваньне вёскі маёнткам. Бясконцыя суды і цеганіна па іх, матар'яльныя страты, з адным вынікам—абшарнік заўсёды правы,—усё гэта прымусіла сялянства перайсьці на шлях адчыненай барацьбы, ад дробных сутычак з вартай, з паліцыяй—да масавага руху. 1914 год паказаў, што аграрная рэволюцыя ўжо не за гарамі.

---

# АГРАРНЫ РУХ У ЧАСЕ МОБІЛІЗАЦЫІ 1914 ГОДУ

Пачынаючы з 1910-11 гг. рабочы і рэволюцыйны рух зноў узмацняецца. Пасьля паражэньня рэволюцыі 1905 году і дзікага тэрору пролетарыят зноў пайшоў пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі на штурм царызму і буржуазіі. Гэтаму лепшым падмацаваньнем служыць тое, што ўжо ў 1914 годзе царскі ўрад чакаў новай рэволюцыі. Так, у абсолютна сакрэтным цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў ад 17 лістапада 1913 году на імя ўсіх губарнатараў б. Расіі пісалася:

„За последний год почти повсеместно значительно усилилось забастовочное движение среди фабричных, заводских и цеховых рабочих, а также среди служащих разного рода городских предприятий, причем особенно резкий характер движение это приняло в найболее крупных фабричных и промышленных районах империи. *Отличительными признаками всех этих забастовок является пред'явление рабочими однородных точно формулированных требований, единодушное и длительное упорство в отстаивании своих домогательств и стремление к осуществлению последних захватным правом*“ (падкрэсьлена мною—К. К.)[1].

Царызм і яго сатрапы зноў адчулі нарастаючую хвалю рэволюцыі ў горадзе і міністар унутраных спраў адзначаў, што ўсе забастоўкі рабочых адбываюцца з асаблівай упартасьцю і што рабочыя прад'яўляюць точна сформуляваныя патрабаваньні—у гэтым сказывалася кіраўніцтва бальшавіцкай партыі рабочым рухам, у гэтым адбівалася нарастаючая хваля новай рэволюцыі. У даным цыркуляры падкрэсьліваецца і менавіта што ўзрасла дзейнасьць рэволюцыйных партый і організацый: „Все эти прискорбные явления с очевидностью свидетельствуют об усилении планомерной деятельности разного рода преступных революционных партий и организаций, поставивших себе в настоящее время задачей возобновление массовой смуты и политических беспорядков“[2].

У гэтых словах адбіваецца ўзросшы ўплыў рэволюцыйнай партыі і разгортваньне яе дзейнасьці па падрыхтоўцы новай рэволюцыі, а мы ведаем, што адзіна пасьлядоўнай рэволюцыйнай партыяй была партыя бальшавікоў, што ўсе дробна-буржуазныя партыі і меншавікі ў тым ліку, збанкруталіся ў рэволюцыі 1905 г. і што менавіта толькі бальшавікі зьбіралі зноў сілы для штурму царызму і буржуазіі.

Усьлед за аднаўленьнем рабочага руху па індустрыяльным цэнтрам былой імпэрыі пачынае ўзрастаць і аграрны рух сялянства супроць

[1] Маг. Цэнтр. Арх. фонд 2, спр. № 443. Гл. дадатак, стар. 90-91.
[2] Маг. Арх. фонд 2, спр. № 443. Там-жа.

памешчыкаў, а гэтак сама разгараецца і клясавая барацьба з кулацтвам на вёсцы. Уплыў барацьбы пролетарыяту на сялянства сказываўся менавіта ўва ўзросьце аграрнага руху. Барацьба пролетарыяту аказвала вялікі рэволюцыянізаваны ўплыў на сялянства.

Усе факты, якія мы прывялі вышэй, далёка яшчэ няпоўныя і можа ня самыя яскаравыя, усё-ж сьведчаць аб нарастаньні новай аграрнай рэволюцыі. Як-бы ні былі рознастайны прычыны і формы змаганьня сялянства з абшарнікамі і барацьбы супроць капіталізаванага юнкера, супроць маруднага росту разьвіцьця сельскае гаспадаркі, — гэтая барацьба зьяўляецца змаганьнем за „амэрыканскі“ шлях. Прыведзеныя факты барацьбы бядняцка-серадняцкіх мас супроць кулацтва, супроць сталыпінскай рэформы трэба разглядаць іменна з пункту погляду барацьбы двух шляхоў разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Пераплёт гэтых двух кірункаў, двух шляхоў быў часамі надзвычайна складаным. Мы ўжо ня раз адзначалі, што клясавыя супярэчнасьці на Беларусі былі вельмі вострыя і што пасьля рэволюцыі 1905 году, якая ня зьнішчыла старых супярэчнасьцяў, якімі яна была выклікана, гэтыя супярэчнасьці мусілі яшчэ больш паглыбіцца і абвастрыцца ў абставінах апошняй стадыі капіталізму ў былой Расіі. Усе праявы барацьбы між клясамі на Беларусі набывалі яшчэ больш востры характар, што паказвала на паглыбленьне супярэчнасьцяў. Да барацьбы сельска-гаспадарчага пролетарыяту на Беларусі мы вернемся ў асобнай працы.

Усе факты клясавай барацьбы сьведчылі аб тым, што супярэчнасьці ўзрасталі ня толькі колькасна, але і якасна. Даволі было якоганебудзь моцнага штуршка, якім зьявілася, напрыклад, мобілізацыя 1914 году, каб выклікаць выбух (вядома мясцовы).

Аграрны рух на Беларусі, як бачым з усяго папярэдняга агляду, ня быў чыста выпадковым у якой-небудзь адной мясцовасьці. Ён быў даволі шырока распаўсюджаны па тэрыторыі Беларусі. Ужо на сёнешні дзень па далёка яшчэ не сабраным матар'ялам мы можам констатаваць гэта. Аграрны рух сялянства ў 1914 годзе пракаціўся шырокай хваляй амаль па ўсім губэрням Беларусі, па крайняй меры мы можам сьцьвярджаць гэта адносна Менскай і Магілеўскай губэрань. Так у першай губэрні мы наглядаем рух у Мазырскім, Пінскім, Бабруйскім, Навагрудзкім паветах, па прыватным весткам і ў Ігуменскім павеце—вёскі Дукоры, Сьмілавічы, Рудня (паводле слоў Д. І. Серко, Пісарчык). У Магілеўскай губэрні гэты рух адбываўся ў Сеньненскім і Чавускім паветах. Бязумоўна, ён праявіўся таксама амаль ва ўсіх паветах. На нашу думку, далейшы росшук матар'ялаў пацьвердзіць гэта.

Аб аграрным руху пры мобілізацыі ў Магілеўскай губэрні можна меркаваць пакуль што па „всеподобнейшему докладу“ губарнатара Пільца за 1914 г.[1].

Аб руху ў Магілеўскай губэрні губарнатар Пільц піша наступнае:

„Все мобилизации прошли в полном порядке (?!—К. К.) за исключением июльской... Запасные нижние чины произвели беспорядки, ограбили винные и бакалейные лавки и обстановку в домах некоторых имений. *Беспорядки эти приняли сер'езный оборот в Сенненском уезде,* куда тотчас я отправился с 20 конными стражниками из Могилева в течение 20 и 21 июля (старый стиль—К. К.) подавил их самыми энергичными решительными мерами, *причем, к сожалению, для устра-*

[1] Самыя-ж матар'ялы, надзвычайна цікавыя і каштоўныя, гінуць дзесьці ў хаосе Магілеўскага архіву.

*нения жителей мне пришлось высечь нагайками несколько участников, подстрекателей к грабежам"* [1]. (Падкрэсьлена мной—К. К.).

Магілеўскі губарнатар Пільц аб пачатку аграрных „непарадкаў" атрымаў цэлы шэраг тэлеграм ад памешчыкаў і паліцыі.

Аграрны рух сялянства і мобілізаваных запасных распачаўся 20 ліпня (ст. ст.) у Сеньненскім павеце і, здаецца, ўспыхнуў перш за ўсё ў м. Бобр. Сяляне зьявіліся ў маёнтак памешчыка, уварваліся ў самы дом, пагражалі спаліць і г. д. Пільц, як толькі атрымаў аб гэтым зьвесткі, зараз-жа сам асабіста з 20-цю коннымі стражнікамі і чыноўнікам асобных даручэньняў Дічкансам паскакаў у Бобр і там крута расправіўся з „зачыншчыкамі" беспарадкаў. Цікава адзначыць, што ўдзел у аграрным руху прымалі ня толькі мобілізаваныя запасныя, але і абкружаючае сялянства. Потым разгром маёнткаў пачаўся ў паўночнай частцы Сеньненскага павету. Партыі мобілізаваных, якія зьяўляліся да вайсковага начальніка ў Сянно, потым адтуль накіроўваліся цэлымі партыямі на чыгунку ў Віцебск,—вось гэтыя партыі мобілізаваных запасных зьмянялі свае маршруты і па дарозе пачалі разьбіваць і паліць маёнткі. Так, партыя запасных у 100 чал. разграміла, а потым падпаліла маёнтак памешчыка фон-Рэнтэльн, памешчыцы гр. Красінскай і г. д. [2].

Уся паліцыя была занята па мобілізацыі на вайну, і партыі запасных з Сянно адпраўляліся бяз усякае аховы. Губарнатар Пільц з атрадам паліцыі з аднаго месца, ахопленага рухам, скакаў у другое і ўсюды, як сам прызнаецца, распраўляўся самым бязьлітасным і зверскім чынам. Захопленых запасных і сялян ён сек шампаламі і нагайкамі і далей перадаваў іх у рукі сьледчай улады. Апрача гэтага ён усюды організоўваў аружную ахову маёнткаў з лясьнікоў, паліцыі і іншых асоб. Гэтая ахова і мусіла адбіваць напады з боку сялянства і запасных на маёнткі.

Мы можам толькі констатаваць, што „беспорядки" сапраўды прынялі пагражаючы характар і ахапілі значны раён, калі самому губарнатару патрабавалася два дні, каб іх спыніць. Можна ўявіць сабе тое зьверства, з якім яны былі падаўлены паліцыяй, калі сам Пільц прызнаецца, што сек нагайкамі „подстрекателей" і гэта за тры гады перад рэволюцыяй. Гэта нагадвае спосабы карных экспэдыцый 1905-1906 году, мэтоды якіх і ўжыў Пільц.

Так, паводле слоў студэнта Рабушка, які сам наглядаў падзеі ў Сеньненскім павеце Магілеўскай губ. і ў самым Сянно, відаць, што ўся паліцыя была сагнана з Магілева і другіх месц і што пры вялікім натоўпе два селяніна з зачыншчыкаў былі павешаны [3]. Тут-жа ў Сянно адбывалася публічная порка ўдзельнікаў „беспарадкаў" казакамі. Многа людзей было засечана чуць не на сьмерць. Аб тым, што два чалавекі былі павешаны, аб гэтым губарнатар Пільц не паведаміў у сваёй справаздачы. Гэта, бязумоўна, ён хацеў зьнізіць значэньне рэволюцыйных падзей, якія адбыліся ў Магілеўскай губэрні, і размах іх, як мы бачым, быў вялікі.

Гэта ўсё толькі падкрэсьлівае, што аграрны рух супроць абшарніцкіх маёнткаў на Магілеўшчыне прыняў вельмі значныя і пагражаючыя разьмеры. Сур'ёзнасьць гэтага руху не абвяргае і сам губарнатар. Гэта сьведчыць і яшчэ аб адным,—што пры мобілізацыі ў Магілеўскай губэрні ў паказаных мясцох разгромлены быў не адзін маёнтак.

[1] ЛОЦИА МВД. Деп. Общ. дело № 7, 1915 г.

[2] Маг. Арх. фонд 2, спр. № 443, гл. дадатак стар. 91—95.

[3] Хаця докумэнтальнага падмацаваньня гэтаму пакуль ня знойдзена.

Больш дакладныя весткі аб аграрным руху пры мобілізацыі мы маем па Менскай губэрні. У Менскай губэрні быў разгромлены маёнтак „Юзэфін“ князя Радзівіла ў Мазырскім павеце. Гэта быў выбух даўно назьбіраных супярэчнасьцяў і старых спрэчак між маёнткам і вёскай. Гэты маёнтак быў зруйнаваны запаснымі дзьвюх суседніх вёсак. Так, у адной з іх—у вёсцы Гліннае, яшчэ з вечара 19 ліпня (стары стыль) пачалі хадзіць чуткі, што надышоў момант расправіцца з экономіяй „Юзэфін“, аддзякаваць за ўсё зло як належыць. Старыя гаварылі запасным, „что настало их время и они могут сделать все, что захотят“ [1]. Высечкі, патравы, выканаўчыя лісты, штрафы—усё гэта былі тыя факты, якія абуралі сялян супроць маёнтку.

Акрамя вышэйпаказанага быў яшчэ зруйнаваны маёнтак „Вялікі Бокаў“, які належыў пані Ізабэле Бржэзінскай, а таксама „Буда Софіеўка“ пана Маркварда.

У Бабруйскім павеце, каля самага гораду Бабруйску быў зруйнаваны фальварак Балычына, які належыў „действительному статскому советнику Палферову Я. Я.“. Гэтыя факты падводзілі ітог усім супярэчнасьцям, усёй злобе, якая расла на працягу дзесяткаў год. Але, бязумоўна, ня толькі сяляне бліжэйшых вёсак руйнавалі маёнткі бліжэйшых паноў, тут наогул выявіўся клясавы антагонізм, клясавая нянавісьць да абшарнікаў. Так, фальварак Палферава быў зруйнаваны запаснымі, якіх ні пан, ні яны яго ня ведалі раней. З крыкам „давай сюды памешчыка“ кінуліся на фальварак Балычына запасныя і разьнесьлі яго. Гэтыя факты былі першымі ластаўкамі аграрнай рэволюцыі, новай нарастаўшай супроць паноў хвалі.

Тут яшчэ цікава адзначыць, з якім настроем ішло сялянства на імпэрыялістычную вайну. Трэба адразу падкрэсьліць, што гэты настрой быў далёка не „патрыотычны“. У гэтых адносінах цікава данясеньне ўрадніка ад 21 ліпня аб маёнтку „Юзэфін“, у якім урадніk, між іншым, піша:

„Между ними (запасными—К. К.) происходили странные брожения, высказывая, что некоторые из них были в русско-японской войне и *штыками кололи русских офицеров*, так что и теперь все можно делать, суда никакого не будет“ [2].

Гэтае цікавае месца падкрэсьлівае тую думку, што бядняцка-серадняцкая частка сялянства ішла на вайну страшэнна нездаволенай, і ў гэтых адносінах глеба для рэволюцыйнай агітацыі была вельмі ўдзячнай і павінна была даць багатыя вынікі.

Але і настрой сялянства, якое засталося па вёскам, быў далёка не патрыотычны. У Менскім архіве ёсьць многа спраў з данясеньнямі жандармэрыі і паліцыі аб тым, што такі-то „нехорошими словами обозвал его величество“. У Слуцкім павеце малады хлапец, прышоўшы на вячоркі да дзяўчат і ўбачыўшы на сьцяне каля „бога“ портрэт „августейшего семейства“, прабіў яго „вялікасьці“ жалезным кіем лоб, а „государыню абазваўшы б..., прабіў нагу вышэй калена“ [3].

Перад імпэрыялістычнай вайной увесь буржуазны друк адзначаў узрост „хуліганства“ на вёсцы. Ленін яшчэ ў 1913 годзе даў ацэнку гэтаму зьявішчу, як першапачатковай форме протэсту. Ён пісаў:

„Азлабленьне на вёсцы страшэннае. Тое, што называюць хуліганствам, ёсьць вынік, галоўным чынам, неймавернага азлабленьня сялян і *першапачатковых* формаў іх *протэсту*. Ніякія прасьледваньні,

[1] Мен. Гіст. Арх. фонд акр. суду, дело № 40, 1915 г.
[2] Менск. Гіст. Арх. фонд. акр. суду, № 40604, 1915 г.
[3] Мен. Гіст. Арх. канц. губ. № 9696, 1914 г.

ніякае ўзмацненьне пакараньняў ня зьнішчыць гэтага азлабленьня і гэтага протэсту мільёнаў галодных сялян, якіх руйнуюць цяпер „землЯўпарадкавацелі“ з нябачнай хуткасьцю, грубасьцю і жорсткасьцю“. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.)[1].

У 1914 годзе адбылося многа пажараў панскіх маёнткаў. Так, 20 кастрычніка ў маёнтку Лычыца Наваградзкага павету згарэла гумно пана А. А. Булгак. Пажар прынёс страты 17.940 руб.; у тым-жа павеце згарэла гумно з манежам у маёнтку Каросна ад невядомай прычыны, страт—5.750 руб.; у Слуцкім павеце ў маёнтку Масьцілавічы згарэла гумно з ураджаем і кармамі арандатара Браніслава Рымашэўскага. Страт усяго на 15.000 руб.; у Менскім павеце 10 лістапада згарэла гумно ў маёнтку Ліхачы з усім ураджаем гэтага году—страты 18.265 р.; у маёнтку Еўла згарэла гумно пана Ленскага М. А., страты 11.500 руб.[2]. І яшчэ ў буйным маёнтку „Мутвіцы“ Горадненскай губ., які належыў да Пазямельнага сялянскага банку, адбылася моцная сутычка з сялянствам. У выніку—гэты маёнтак быў спалены разам з усімі будынкамі і жывёлай. Страты вялізарныя. Па абвінавачаньню ў падпале было заарыштавана 4 селяніна[3].

У Менскім павеце ў ваколіцы в. Халяўшчына згарэла гумно з ураджаем і з сельска-гаспадарчымі машынамі—малацілкай, веялкай, фурамі і г. д. Гумно належала мясцоваму кулаку[4]. Паданы сьпіс можна было-б прадоўжыць і далей. Але і гэтыя факты даволі сьведчаць, што гэта ўсё было не выпадковасьць, а чыясьці рука пушчала чырвонага пеўня, каб выкурыць пана з яго маёнтку. Усе гэтыя прыведзеныя намі пажары адбыліся за два месяцы восені 1914 году. Мы мусім разглядаць іх як праявы аграрнага руху супроць абшарнікаў. Усе гэтыя ўчынкі лепш за ўсё сьведчылі, што пад зямлёй зноў забурлілі сілы, гатовыя ўзарваць стары парадак.

Цяпер пяройдзем да разгляду фактаў разгрому маёнткаў у 1914 г. Перш спынімся на больш дробным факце—зруйнаваньні фальварку Балычына, які належаў Палфераву Я.

19 ліпня (стары стыль) 1914 году ў Бабруйскім павеце была абвешчана мобілізацыя запасных на імпэрыялістычную вайну. Улада была мабыць упэўнена, што мобілізацыя ня пройдзе гладка і зараз-жа спыніла продаж гарэлкі. На наступны дзень пачаўся зьезд запасных у горад Бабруйск. Па дарозе, у вёсцы Гарбацэвічы, дзе была манаполька, зьявіліся мясцовыя запасныя яшчэ 19 ліпня, але ім адмовілі ў продажы гарэлкі. К вечару 20-га пачалі ехаць запасныя з іншых валасьцей, яны таксама патрабавалі гарэлкі і, прайшоўшы праз заднія дзьверы ў манапольку, кінулі некалькі рублёў на прылавак і набралі гарэлкі колькі хацелі. Новая партыя запасных зноў накінулася на манапольку і ўраднік, які было пачаў абараняць яе, быў адціснуты і яму пагражалі забойствам. Сядзелец Карэтка даў знаць аб гэтым у Бабруйск, адкуль і быў прысланы паручнік Сафронаў і 5 конных стражнікаў. 21 ліпня раніцою прыбыла новая партыя запасных да 300 чалавек. Паводле слоў поліцэйскага паручніка, многія з іх ужо былі ў нецьвярозым стане. Усе патрабавалі адчыніць манапольку і прадаць гарэлкі, але паручнік Сафронаў загадаў стражнікам біць нагайкамі сялянскіх коняй, каб яны хутчэй праяжджалі. Гэты манэўр ня ўдаўся,

[1] Ленін У. І., т. XVI, выд. 2, стар. 458.
[2] Мен. Гіст. Арх. канц. губ., спр. № 9696, 1914 г.
[3] ЛОЦИА МВД XI, дел. № 63. 1914 г.
[4] Мен. Гіст. Арх. канцыл. губ-ра, спр. № 9696, 1914.

усе запасныя спыніліся і кінуліся да манапалькі. Асабліва „буйстваваў“ Сабан Асташковіч, калі стражнік Лагун А. выцягнуў рэвольвэр і сказаў, што будзе страляць. Асташковіч ускочыў на ганак, разарваў на сабе кашулю і выставіўшы грудзі крыкнуў—„страляй“, потым, зьвярнуўшыся да натоўпу, крыкнуў „бей рабята, бяры водку“. Паручнік і стражнікі нічога не маглі зрабіць і на іх вачох былі выбіты дзьверы і гарэлка забрана. Мы тут мусім падкрэсьліць у гэтым інцыдэнце бясьсільле паліцыі перад натоўпам. Гэта сьведчыла аб тым, што паліцыю пераставалі баяцца.

Далей у 7 вярстах ад Бабруйску быў разьбіты фальварак Балычына. Цяжка сказаць, якія запасныя прымалі ў гэтым удзел. Абставіны гэтай справы наступныя.

З матар'ялаў сьледзтва высьвятляецца, што ўвесь дзень 20 ліпня запасныя ішлі амаль бесьперапынна; некаторыя з іх, паводле слоў самога Палферава, заходзілі у фольварак і заяўлялі, што яны ідуць праліваць кроў, патрабавалі грошай і частаваньня. У праціўным выпадку пагражалі спаліць сядзібу. Я. Палфераў, „чувствуя себя беззащитным“, даваў якуюсь дробязь і запасныя выходзілі. Але 21 ліпня а 9 гадзіне раніцы ўвайшло ў двор 5 чалавек запасных і запатрабавалі грошай і частаваньня. Палфераў, сустрэўшы іх, сказаў, што зараз вынясе, і пайшоў да дому. У гэты час надыйшла новая партыя запасных, яны кінуліся на сядзібу і пачалі ламаць плот, нішчыць цьвятнік, выбіваць шыбы з крыкам—„давай памещика“. Перапалоханы Палфераў з жонкай і сынам-студэнтам кінуліся ўцякаць праз сад у суседнюю вёску. Заўважыўшы гэта, некалькі чалавек запасных пагналіся за імі. Адзін з запасных ударыў жонку Палферава рукой па твары, і яна звалілася, другі ўдарыў колам сына. Атрымаў удар і сам „действительный статский советник“. Бачачы, што яго здаганяюць, Палфераў вынуў браўнінг і накіраваў яго на запасных, гэта спыніла нападаўшых і яны пабеглі назад у фальварак.

Запасныя, відаць, даволі доўга гаспадарылі ў фальварку Балычына. Імі былі выбіты ўсе шыбы і рамы, разьбіты ў трэскі шафы мэбля. Бялізны многа было парвана, а частка зьнесена, гатоўкай было забрана 350 руб., залатыя рэчы, усяго Палфераў налічыў страты на 2.000 рублёў.

Бабруйская паліцыя была паведамлена праз стражніка аб зруйнаваньні манапалькі ў вёсцы Гарбацэвічы, а крыху пасьля была паведамлена і аб зьнішчэньні фальварку Палферава. Значны атрад паліцыі, на чале з прыставам, чакаў на ўскраіне гораду запасных. Як толькі апошнія пачалі пад'яжджаць, па ўказцы стражніка паліцыя пачала заарыштоўваць запасных. Тут былі затрыманы: Сабан Асташковіч, Васіль Русаковіч, Сава Саланец, Ільля Шаранда, Рыгор Караленя, Дзямян Лабуцька, Каленік Каленіцеля, Пётра Валодзька, Сьцяпан Жартун, Рыгор Пятровіч. Пры вобыску шмат у каго была знойдзена пустая пасуда з-пад гарэлкі, у Васіля Русаковіча аказалася падушка і мяшок з тонкай бялізнай—мужчынскай і жаночай, у Валодзькі кальсоны, ручнік, верхняя жаночая юбка і панталоны. Караленя сазнаўся ў разгроме фалварку Палферава. Частка затрыманых, а менавіта Асташковіч, Караленя, Русаковіч, Саланец, Валодзька былі адпраўлены ў турму, а рэшта накіравана да вайсковага начальніка, які і адправіў іх у армію. Толькі пазьней судовае сьледзтва апамяталася і добра ўявіла небясьпеку пагрому і яго сутнасьць, але знайсьці адасланых у армію было ня так лёгка. Пачалася бясконцая перапіска

сьледчай улады, якая дабіралася да самых перадавых позыцый. Той-сёй з запасных прапаў на вайне бяз вестак. Большая частка з памянёных запасных была адшукана. Ім прад'яўлена было абвінавачаньне, але чым скончылася справа—невядома.

Тых запасных на чале з Асташковічам, якіх зараз-жа арыштавалі і адправілі ў турму, судзілі 14 сьнежня 1915 г. у акруговым судзе. Яны былі прысуджаны да 8 месяцаў турмы, а па грамадзянскаму іску за монапольку павінны былі заплаціць 149 руб. 37 кап. Калі ў гэтым процэсе ўлада празявала абвінавачаных і не магла некаторых з іх адшукаць, каб пакараць, дык у другім выпадку мы маем самую жорсткую расправу клясавага суду.

У Мазырскім павеце зруйнаваньне маёнтку адбылося ў значна большым маштабе і мела папярэднюю падрыхтоўку. Маёнтак „Юзэфін" князя Радзівіла быў зруйнаваны запаснымі дзьвюх бліжэйшых вёсак, прычым важна адзначыць, што ў гэтым прымалі ўдзел ня толькі мобілізаваныя на вайну сяляне, а і іншае сялянства з вёсак.

На нашу думку, гэты напад зьяўляецца найяскравейшым прыкладам нарастаньня новай аграрнай рэволюцыі, у выніку абвастрыўшыхся старых супярэчнасьцяў.

Непасрэднай прычынай зруйнаваньня маёнтку „Юзэфін" былі тыя супярэчнасьці, якія зьбіраліся на працягу доўгіх гадоў між экономіяй і суседнімі вёскамі, а таксама і тыя зьдзекі і матар'яльныя страты, якія цярпела сялянства ад экономіі. Як выяўляецца з сьледзтва, паводле слоў кіраўніка маёнтку і лясьнікоў—адносіны паміж сялянствам і экономіяй былі самыя варожыя. Лясьнічы Дашкевіч, які кіраваў маёнткам „Юзэфін", на сьледзтве паказаў, што:

„Отношение между имением и крестьянами деревень Глинное и Ближево—скверное. На почве черезполосицы и сервитутов у нас с крестьянами постоянные недоразумения; так, крестьяне пасут скот где хотят, запахивают и делают потравы. С крестьянами этих деревень было до 2 тыс дел, да на руках имеется исполнительных листов 3.000 штук, большинство которых лежит по нескольку лет" [1].

Такім чынам, зруйнаваньне маёнтку завяршыла барацьбу сялянства з абшарнікам, тую барацьбу, якая ішла на працягу доўгіх гадоў. Маёнтак сьціскаў сялянства з усіх бакоў і душыў перажыткі прыгоньніцтва, сялянства даўно жадала зьмесьці яго з твару зямлі.

Яшчэ з вечара 19 ліпня (стар. стылю) па вёсцы Глінна́е пачалі хадзіць чуткі аб тым, што прышла пара расправіцца з экономіяй „Юзэфін". Тут мы маем папярэднюю падрыхтоўку да нападу. Напад гэты, паводле матар'ялаў сьледзтва і абвінавальнага акту, адбыўся наступным чынам: 19 ліпня (ст. ст.) была абвешчана мобілізацыя ў раёне Бярозаўскай воласьці Мазырскага павету, і ўсім сялянам адпаведнага ўзросту патрэбна было па загаду зьявіцца ў воласьць у сяло Бярозава. Мобілізаваныя вёскі Гліннае 20-га ліпня чакалі суседнюю вёску Бліжава, каб разам накіравацца далей да воласьці. Як толькі апошнія пад'ехалі—усе разам накіраваліся далей. Нам думаецца, што між запаснымі сялянамі гэтых вёсак быў папярэдні згавор, каб разьбіць маёнтак. Дарога ішла якраз каля экономіі „Юзэфін"; калі запасныя параўняліся з маёнткам, селянін Цярэнці Скакавец пачаў крычаць: „ребята, ступайце все сюда, берите что хотите, разбивайте". Так паказваў лясьнік Сухадольскі. Другі лясьнік Сьлесарчук паказаў, што Каханевіч Мікалай першы схапіў кол і пабег да княскага дому і пачаў

[1] Мен. Гіст. Арх. фонд. Акруг. суда, № 40604, 1915 г.

біць вокны. Усе спыніліся, прымусілі возчыкаў выпрагчы коняй і пусьцілі іх у сад, у гарод і ў авёс. Сяляне перш за ўсё кінуліся ў кантору маёнтку. (Гэта мы падкрэсьліваем, бо гэта была першая мэта нападаўшых). Там разьбілі колам тэлефонны апарат і пачалі рваць кнігі, справы і асабліва выканаўчыя лісты. Другая група кінулася ў дом кіраўнічага маёнтку Дашкевіча, дзе таксама пачалі біць вокны, ламаць дзьверы, потым мэблю, рваць усякага роду адзежу і г. д. Пазьней толькі быў разьбіты пограб, дзе забраны розныя продукты, як масла, сала і г. д.

Страты ад гэтага нападу былі вельмі значныя. Так, паводле слоў кіраўнічага, яго ўласных грошай гатоўкай было забрана 1.835 рублёў і маемасьці зьнішчана на 3.179 руб. Апрача гэтага, у канторы было парвана выканаўчых лістоў на суму 3.375 руб. У княжацкім доме і ў доме кіраўнічага ўся мэбля была разьбіта на трэскі; агулам страты было больш як на 10.000 руб.

У протоколе агляду маёнтку „Юзэфін“ прыстаў піша:

„В доме Дашкевича найдено 7 наружных двойных окон и 2 одиночных, разбиты, сломаны в некоторых и переплеты, входные двери открыты, в некоторых сломаны замки. Вся обстановка сломана в щепы, все бумаги, документы, одежда разбросаны на полу, потоптаны ногами, на кухне и кладовой все разбито и разграблено. В доме князя Радзивилла разбито 15 наружных двойных окон, переплеты поломаны, вся обстановка разбросана и сломана, набросано в комнатах дикого камня... в заговоре участвовал сам староста“.

У часе нападу сялянства на маёнтак там былі толькі лясьнікі, якія ахоўвалі яго. Першы акт расправы быў накіраваны на іх. Знайшоўшы лясьнікоў у канторы, дзе яны пахаваліся за шафы, запасныя выцягнулі іх, парвалі на іх адзеньне і зьбілі іх. Цікава адзначыць, што пры гэтым нападзе прысутнічаў сам вясковы стараста і ня толькі ня прыняў ніякіх мер, каб спыніць расправу, але нават дапамагаў ім. Мы мусім адзначыць яшчэ адну цікавую рыску. Напаўшыя на маёнтак абсолютна нічога ня бралі з сабой з рэчаў, а ўсё зьнішчалі. Так, адзін з запасных вынес з пакою кіраўнічага дзьве стрэльбы, другі люстра, але ўсё гэта было разьбіта аб колы. Пасьля гэтага запасныя напалі яшчэ на старожку аднаго з лясьнікоў. Адабралі ў яго ружжо, грошы і гадзіньнік, а самога моцна зьбілі, бо, як вядома, злоба супроць лясьнікоў была вялікая, нарасла яна ў зьвязку з высечкамі панскага лесу. Па данай справе было прыцягнена да судовай адказнасьці 20 чалавек, галоўным чынам з тых, хто вёз запасных у с. Бярозава.

Запасныя адправіліся далей і ніхто не затрымліваў іх у маёнтку. Ня былі затрыманы запасныя і ў сяле Бярозаве і, як потым аказалася, некаторыя з запасных, зруйнаваўшых экономію „Юзэфін“, разьбілі таксама маёнтак пані Ізабэлы Бржэзінскай — „Вялікі Бокаў“ Мейлешковічаскай воласьці, таго-ж Мазырскага павету, а таксама і „Буда Сафіеўку“ памешчыка Маркварда. Памешчыцкі клясавы суд жорстка расправіўся з сялянамі. Як відаць з протоколу вайскова-акругавага суду ня тэатры ваенных падзей ад 18 лістапада 1914 г.[1], запасныя, а менавіта: Мікалай Каханевіч, Максім Каханевіч, Яраслаў Каханевіч, Патрыкей Скакавец, Яўхім Скакавец, Аляксандар Ахрамчук, Рыгор Ахрамчук, Дзьмітры Калодзіч, Цімафей Кулакевіч, Міхаіл Кулакевіч, Лаўрын Рункевіч, Хвёдар Кібукевіч, Іван Краўчэня, Іван Кулакевіч і Клім Петравец былі суджаны вайсковым акруговым судом толькі за зруйнаваньне маёнтку „Вялікі Бокаў“.

[1] Гл. дадатак стар. 95—102.

Відаць, вайсковы суд ня ведаў, што амаль усе гэтыя сяляне запасныя прымалі ўдзел у зруйнаваньні маёнтку „Юзэфін“, дзе справа прыняла вялікія разьмеры. Але і без таго памешчыцкі клясавы суд жорстка пакараў падсудных, бо зразумеў і адчуў у гэтым акце подых рэволюцыі, бо ўбачыу у гэтым акце небясьпеку для дваранскай „сьвяшчэннай уласнасьці“. 13 чалавек, за выключэньнем Рункевіча М., Каханевіча Кліма і Пятроўца, якія былі апраўданы, рэшту падсудных вайсковы суд прысудзіў да кары сьмерцю праз павешаньне. Гэты прыгавар вайсковага суду быў пасланы камандуючаму паўднёва-заходнім фронтам генэралу Іванову, які прыгавор зацьвердзіў адносна галоўных „зачыншыкаў“, трох чалавек — Мікалая Каханевіча, Патрыкея Скакаўца і Аляксандра Ахрамчука — пастанавіў павесіць. Прыгавор быў выкананы 18 сьнежня 1914 году. Іншым 10 чалавекам шыбеніцу замянілі бястэрміновай катаргай, пазбавіўшы іх усіх праў. Яўхіма Скакаўца і Рыгора Ахрамчука засудзілі на 20 год катаргі. Гэты апошні прыгавор быў зацьверджаны ў горадзе Халме 7 сьнежня 1914 г. Так клясава-памешчыцкі суд расправіўся з тымі, хто адважыўся ўзьняць руку на ўласнасьць дваранiна. Але гэта яшчэ ня ўсё. Па данай справе за зруйнаваньне экономіі „Юзэфін“ былі прыцягнены да адказнасьці падводчыкі, якія везьлі запасных. Ячы праседзелі ў турме амаль цэлы год да суду, апошні адбыўся толькі 26 мая 1915 году. І, ня гледзячы на тое, што сьледству абсолютна не ўдалося давесьці, што даныя асобы вінаваты, як відаць з рэзолюцыі суду, былі асуджаны наступныя сяляне вёскі Бліжава і Глінпай: Цярэнці Скакавец, Павал Рагульчык, Нічыпар Ляскавец, Сьцяпан Кулакевіч, Константын Кулакевіч. Усіх гэтых сялян аддалі ў „исправительные арестанские отделения“ тэрмінам на 2 гады кожнага і толькі Нічыпара Ляскоўца суд пастанавіў зьняволіць на 1 год у турму, а Васіля Каханевіча апраўдаў [1].

Мы мусім яшчэ раз падкрэсьліць, што віна даных асоб абсолютна нічым ня была даведзена, тым больш што пагалоўны вобыск у паказаных вёсках абсолютна ня даў ніякіх вынікаў. Сьледства грунтавалася на паказаньні аднаго з лясьнікоў, які як-быццам бачыў, што адна жанчына несла чырвоную коўдру, а другая набрала ў панскім гародзе гуркоў. Мы можам падкрэсьліць яшчэ адно, што сьледства не дакончылася, што адны і тыя-ж запасныя, што нішчылі і маёнтак „Юзэфін“, а то, бязумоўна-б, клясавы суд усіх разам адправіў-бы на шыбеніцу.

Трэба сказаць, што страты маёнтку „Вялікага Бокава“ выразіліся ў мізэрнай суме 150 руб., у той час як мы бачылі, што ў „Юзэфіне“ гэтыя страты былі большымі за 10.000 руб., што відно з сьпісу рэчаў, прадстаўленых кіраўнічым маёнтку „Юзэфін“ — Дашкевічам.

Што адбылося ў маёнтку „Буда-Сафіеўка“ абшарніка Маркварда, невядома; якія формы і разьмеры прыняў рух у гэтым маёнтку, застаецца няясным. Як відно з пастановы сьледчага па важнейшым справам ад 10 лістапада 1914 году, за зруйнаваньне паказанага маёнтку вінаватыя сядзелі ў мазырскай турме, прычым сьледчы падкрэсьлівае, што амаль усе яны былі выключна з Беразоўскай воласьці Мазырскага павету [2].

Гэтыя пагромы абшарніцкіх гнёздаў былі першымі выбухамі надыходзячай аграрнай рэволюцыі. Мы вышэй ужо адзначалі ў многіх мясцох сваёй працы, што супярэчнасьці між абшарніцкім маёнткам і вёскай былі настолькі вострыя і глыбокія, што ў самых разнастайных формах клясавая барацьба прарывалася вельмі часта. Разьвіцьцё

[1] Мен. Гіст. Арх. Фонд. Акр. Суда. Справа № 40604, 1915 г.
[2] Мен. Гіст. Арх. Фонд. Акр. Суда спр. № 40604, 1915 г.

капіталізму ў сельскай гаспадарцы пасьля рэволюцыі 1905 году яшчэ больш паглыбіла барацьбу між „амэрыканскім“ і „прускім“ шляхам разьвіцьця. Сялянства ўцэлым выступала супроць пана, але інтарэсы яго далёка ня былі аднолькавыя. Вясковая буржуазія на падставе сталыпінскіх законаў атрымала прывілеі, якімі ўрад хацеў купіць кулака і зрабіць яго саюзьнікам абшарніка на сяле. Затое бядняцка-серадняцкая частка вёскі пад уплывам тых-жа законаў хутка пролетарызавалася — яе рабаваў і кулак, які сам ужо зрабіўся панам, яе прыцясьняў усякага роду перажыткамі прыгоньніцтва і стары абшарнік. Гэтая маса распачала адчыненую барацьбу з сваімі ворагамі—кулаком, які рабаваў вясковую грамаду, і старымі эксплёататарамі.

Рэакцыйная сталыпіншчына паслужыла для сялянскіх мас добраю навукаю і трэба сказаць, што бядняцка-серадняцкія масы вельмі добра яе ўсвоілі. Супярэчнасьці, якія паказаны намі вышэй, і прывялі да зруйнаваньня маёнткаў у часе мобілізацыі 1914 году.

Якія-ж пласты прымалі ўдзел у гэтым руху супроць абшарнікаў? На нашу думку прымала ўдзел амаль уся вёска. Але, бязумоўна, самай дзейнай сілай зьяўлялася эксплёатаваная зруйнаваная найбольш прыгнечаная бядняцка-серадняцкая частка сяла. Высьветліць маемасны стан прымаўшых удзел у аграрным руху цяжка, бо ў протоколах сьледства паказана толькі надзельная зямля. Возьмем процэс 11 чалавек вёскі Вулькі і Бродніцы, якія білі прystава, і справа скончылася крывавай разьвязкай. Падсудныя мелі наступную колькасьць надзельнай зямлі:

| | | |
|---|---|---|
| 1/22 | надзелу | — 1 чалавек |
| 1/12 | „ | — 1 „ |
| 1/4 | „ | -- 4 „ |
| 1/3 | „ | — 3 „ |
| 1 | „ | — 1 „ |

А вось падсудныя з вёскі Каліты Ігуменскага павету.

| | | |
|---|---|---|
| 1/8 | дзес. | 1 чал. |
| 1 | „ | 2 „ |
| 1 1/2 | „ | 4 „ |
| 2 | „ | 2 „ |
| 4 | „ | 1 „ |
| 5 1/2 | „ | 1 „ |
| 6 | „ | 5 „ |
| 12 | „ | 1 „ |

Такім чынам, у аграрным руху супроць абшарнікаў прымаў удзел і той, хто меў толькі сядзібу — вясковы пастух, і бедната, і серадняк. Сустракаюцца і такія, якія маглі ўнесьці па 600 руб., каб выпусьцілі іх на парукі. У агульнай-жа масе — гэта ўсё бедната, якую асабліва прыгняталі лятыфундыі.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што клясавая барацьба на Беларусі між юнкерам і сялянствам абвастралася, што аграрная рэволюцыя хутка нарастала. Падзеі жніўня 1914 году ўскрылі, наколькі была накалена глеба, наколькі абвастрыліся супярэчнасьці між памешчыкамі і сялянствам.

# КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА ВАКОЛ СТАЛЫПІНСКІХ ХУТАРОЎ

Вышэй намі паказана, якая барацьба ішла між сялянствам і абшарнікамі, між „амэрыканскім і пруcкім шляхамі“ разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Былі ўскрыты мэтоды, пры дапамозе якіх абшарнікі рабавалі сялянства, і паказаны тыя формы адпору і барацьбы, якую разьвівала сялянства. Зусім зразумела, што і заможная частка сялянства выступала іншы раз актыўна, бо сама спадзявалася захапіць панскія землі, сама прэтэндавала на іх. Вясковая буржуазія вяла іншы раз барацьбу разам з усім сялянствам супроць памешчыка. Але яе інтарэсы, бязумоўна, трэба адрозьніваць ад інтарэсаў шырокіх сялянскіх мас. І калі абшарніцкі ўрад на падставе сталыпіншычы рабаваў сялянскія масы, дык ад гэтай „чысткі“ зямель пад капіталізм мусіла штосьці перапасьці і ў рукі кулацтва. Сталыпінская палітыка аддала вёску на рабаваньне кулакоў і апошні выкарыстаў сталыпінскія законы, каб захапіць самыя лепшыя, самыя тлустыя кавалкі. Бязумоўна, працэс насаджваньня хутароў праясьняў клясавыя адносіны на сяле, абвастраў клясавы антагонізм, з аднаго боку, беднатой, батракамі, і з другога боку—кулацтвам.

Аб тым, што сталыпіншчына рабіла нешта для „амэрыканскага“ шляху разьвіцьця сельскай гаспадаркі, ня можа быць ніякай гутаркі. Пытаньне стаіць якраз у другой роўніцы: што яно зрабіла для „прускага“ шляху і ці ўдалося дасягнуць адпаведных вынікаў. Думаць, што сталыпіншчына ў якойсьці меры вырашала аграрнае пытаньне, як гэта лічылі опортуністы-меншавікі, значыць забываць марксызм і нічога не разумець у клясавай барацьбе гэтай эпохі. З пункту гледжаньня буржуазных профэсароў — творцаў „тэорыі“ экстэнсыўнай гаспадаркі, сталыпіншына ўдалася і чуць ня была вырашэньнем аграрнага пытаньня. Мы ведаем, што сталыпіншчына распаліла клясавую барацьбу, яшчэ далей пасунула пролетарызацыю вёскі, зьбядненьне і зґаленьне шырокіх сялянскіх мас — вось вынікі сталыпіншчыны. Можна сказаць, што ўвесь пэрыод, пачынаючы з 1861 году, быў эпохай барацьбы між двума кірункамі аграрнага капіталізму ў сельскай гаспадарцы. І ў часе рэволюцыі 1905 году і ў гады рэакцыі да самай рэволюцыі 1917 году ішло ўпартае клясавае змаганьне за „амэрыканскі і прускі“ шлях разьвіцьця. Рэволюцыя 1905 году была спробай пролетарыяту і сялянства зьнішчыць усякія віды перажыткаў прыгоньніцтва і расправіцца з памешчыкамі і царызмам. Гады рэакцыі і сталыпіншчына былі спробай памешчыкаў і буржуазіі захаваць гэтыя перажыткі, зрабіць „чыстку“ зямель пад капіталізм за кошт шырокіх сялянскіх мас. Але ўсе спробы і патугі трэцячэрвеньскага рэжыму, бязумоўна, пацярпелі крах. Ленін у 1913 годзе пісаў:

„Не, дваранская і сталыпінская зямельная політыка — ня выхад, а толькі найбольш пакутны *падыход да новага вырашэньня* зямельнага пытаньня ў Расіі“ [1]. (Падкрэсьлена Леніным—К. К.).

Уся гэта політыка пацярпела крах, бо апраўіўшыся пасьля перамогі над ім, пролетарыят павёў за сабой шырокія масы сялянства ў апошнюю бойку супроць монархіі.

Утварэньне буржуазных адносін у сельскай гаспадарцы на Беларусі карэньні мае ў дарэформеннай экономіцы Беларусі.

У Магілеўскай губэрні першыя хутары пачалі ўзьнікаць зараз-жа пасьля рэформы 1861 году. Так, у Клімавіцкім павеце Забялышынскай воласьці ўзьнік хутар Карла Лемеша, выхадца, здаецца, з Ковенскай губэрні, — на арандаванай зямлі (25 дзесяцін); у 1880 годзе ўзьнік хутар у Чабатовіцкай воласьці Гомельскага павету („Ігнатаўка“) на купленай зямлі (15 дзесяцін). У Аршанскім павеце ўзьнікае цэлы рад хутароў, зноў-жа на кулацкай зямлі; напрыклад, хутар „Каралькі“ ў 30 дзесяцін і г. д. Па Магілеўскай губэрні да выданьня закону 9 лістапада існавала ўжо 161 хутар, але гэтая лічба далёка няпоўная. Мы ня ведаем, колькі было організавана буйных маёнткаў, набытых капіталістымі і тымі-ж заможнікамі сялянамі, якія ставілі гаспадарку на капіталістычныя рэйкі (вазьмеце, напрыклад, латыскія колёніі; праца Шкільтэра пралівае новае сьвятло). Ці возьмем па данаму пытаньню матар'ял, прыведзены Дудковым па Віцебскай губэрні. Першыя хутары ўзьнiклі тут яшчэ ў 80 гадох XIX ст. Насьпеўшым капіталістычным тэндэнцыям паказалі і далі форму латыскія пасяленцы. Першая вёска, якая правяла хутарское расьсяленьне ў 1880 г., была в. Загародня Веляшкоўскай воласьці Віцебскага павету. Кулаком зрабілася цесна на вёсцы, а ўсякія чуткі сярод сялянства аб перадзеле зямлі — вынік лютага малазямельля бядняцка-серадняцкіх мас — штурхалі кулакоў замацаваць зямлю. Бо толькі ў такім выпадку можна было паставіць капіталістычную гаспадарку. Вось маленькая табліца, якая прыведзена Дудковым.

Маклакаўская воласьць, якая пачала расьсяляцца з 1883 г., мела хутароў да сталыпінскай рэформы:

| Група хутароў | Колькасьць хутар. | % да агульнага ліку | Надзельнай зямлі | % да агульнай плош. | % купленай зямлі | % да агульнай плош. | Усяго зямлі хутарск. | % да ўсёй плошчы яе | У сярэднім на 1 хутар |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ад 5—8 дз. . . . | 3 | 4,3 | 18 | 2,2 | — | — | 18 | 2,2 | 6 |
| „ 10—15 „ . . . | 5 | 7,1 | 50 | 6,3 | — | — | 50 | 6,3 | 10 |
| „ 15—30 „ . . . . | 53 | 75,7 | 59,9 | 75,4 | 58,9 | 57,5 | 1,188 | 65,3 | 22,4 |
| „ 30 і вышэй. . . | 9 | 12,9 | 128 | 16,1 | 43,5 | 42,5 | 56,3 | 31 | 62,5 |
| Усяго . . . . | 700 | 100 | 795 | 100 | 1024 | 100 | 1819 | 100 | 26 |

Такім чынам, тут яскрава відаць, хто яшчэ задоўга да рэформы ішоў на хутары — гэта кулацтва... Група хутароў з 15 і больш дзесяцін складае 88,6 проц. усіх вышаўшых. Яны маюць шмат надзельнай, і 100 проц. купленай зямлі ў воласьці, 62 гаспадары—кулакі і заможнікі,

[1] Ленін У. І., т. XVI, стар. 458.

воласьці складаюць толькі 1 проц. усіх гаспадароў воласьці, але яны ўладаюць 20,5 проц. куплен. зямлі і 25 проц. надзельнай [1]. Малюнак абсолютна ясны, на хутар задоўга яшчэ да сталыпінскай рэформы цягнецца вырасшая вясковая буржуазія. Вывад Дудкова верны, што „У земляўпарадкаваньні 1880—1904 г. кулак—цэнтральная фігура, ён пераважае сярод вышаўшых на хутары [2]. Усё гэта сьведчыць, што буржуазныя адносіны даўно ўжо насьпелі на вёсцы і распачалі змаганьне з рэшткамі фэўдалізму—з буйным панскім земляўладаньнем і прадстаўнікамі яго—абшарнікамі. Сталыпінскае законадаўства палягчала выхад заможных элемэнтаў з грамады, але зноў-жа было-б вельмі наіўным думаць, што ўрад прыгоншчыкаў-рэакцыянэраў сапраўды думаў палепшыць становішча мас шляхам інтэнсыфікацыі гаспадаркі. Гэта быў *толькі манэўр,* каб якмага захаваць уладу рэакцыянэраў, пры дапамозе ўтварэньня кулацкіх гаспадарак і набыцьця для сябе саюзьніка на сяле. Гэта была спроба зрабіць бар'ер, які-б бараніў маёнтак старога прыгоншчыка, пачаўшага ператварацца ў юнкера, ад новай рэволюцыі.

Задача гэтага нарысу ў тым, каб паказаць, што сялянская маса сустрэла сталыпінскую рэформу „в штыки", бо добра зразумела сэнс рэформы. Вакол хутароў запалала моцная клясавая барацьба, якая, бязумоўна, сьведчыла, што манэўр ураду добра зразумела бядняцка-серадняцкая маса вёскі і павяла барацьбу супроць кулака, рабаваўшага вёску. Пасьля гэтага разгляду будзе абсолютна яснай і ідэолёгія нашаніўцаў, якія прапаведвалі і падтрымлівалі сталыпінскія хутары. Кулацкая сутнасьць, а мо' нават і больш, выступіць зусім ясна.

Нашаніўства вырасла на гэтай хвалі росту кулацтва і вясковай буржуазіі. Капіталістычнае разьвіцьцё раскладада сялянства, выдзяляла з яго невялікую групу кулакоў, на якіх імкнуўся абаперціся царызм і ў Беларусі, як колёніі царскай Расіі. Пануючая кляса імкнулася падкупіць кулацкую верхавіну вёскі, хацела перацягнуць яе на бок памешчыкаў у барацьбе з шырокай масай сялянства.

Першыя азнакі руху выявіліся зараз-жа пасьля абвяшчэньня закону 9 лістапада. Спрэчкі вакол гэтага закону абудзілі вёску, раскалолі яе на тых, хто жадаў выйсьці з грамады, галоўным чынам кулацкая і заможнкя частка, якая думала атрымаць самыя лепшыя землі, і тых, хто не жадаў гэтага, бо выдзяляць на хутар ня было чаго.

Урад зараз-жа пасьля абвяшчэньня закону распачаў рэпрэсіі супроць незадаволеных гэтым законам і за агітацыю супроць яго ў адміністрацыйным парадку высылаў за межы губэрні. Так, былі высланы 5 сялян з вёскі Вялікія Лукі Ястрабінскай воласьці Наваградзкага павету: Драздоў В. С., Маразавенка Д. Г., Пацейка Д. І., Пацейка Е. І., Сушчэня П. М. Яны былі „изобличены в агитации среди крестьян, имея воспрепятствовать выход их на хуторские участки, причем агитация сопровождалась угрозами поджечь имущество и лишить жизни лиц, сопротивлявшихся требованию агитаторов" [3]. Паводле 34 палажэньня „о государственной охране" ўсім гэтым сялянам было забаронена жыць у межах Менскай губэрні тэрмінам на 1 год. З Пінскага павету з вёскі Пнеўна выслалі валаснога пісара Стралкоўскага К. Р. і селяніна вёскі Сетыцк Неўдаха У. В. — на той-жа падставе, за агітацыю супроць закону. Яны былі высланы за межы Менскай губэрні тэрмінам на

[1] Дудкоў Д. Н. Стал. рэформа ў Віцебск. губ., стар. 40.
[2] Там-жа, стар. 47.
[3] ЛОЦИА МВД XI делопроизводство, дело № 1, 1909 г.

2 гады кожны[1]. За агітацыю сярод сялян, за пагрозы і гвалты над выходзіўшымі на хутары ў вёсцы Рэпнікі Беластокскага павету Гарадненскай губ. былі высланы 3 браты Лукашыкі — Адам, Павал, Іван — тэрмінам на 2 гады[2].

У Быхаўскую турму Магілеўскай губ. у 1910 годзе былі пасаджаны два браты Сьвідэрскія — Константын і Аляксандар Язэпавічы, „изобличенные в агитации среди крестьян против закона 9 ноября 1906 г.“[3]. Згодна з распараджэньнем міністра ўнутраных спраў ім было забаронена жыць у межах Магілеўскай губ. тэрмінам на 2 г. кожнаму. Магчыма, што гэтыя браты належалі да якойсьці партыі, але адшуканы матар'ял не дае на гэта адказу. З м. Хоцімску Клімавіцкага павету быў высланы селянін Магілявец на год за межы Магілеўскай г., з вёскі Якубава Аршанскага павету Высачанскай воласьці; з аднаго з цэнтраў хутарскога расьсяленьня на Беларусі высланы на год селянін Гаўранкаў А. С. і г. д. і г. д. Прыведзеныя матар'ялы далёка не ахопліваюць усіх высылак за агітацыю супроць закону 9 лістапада. Але ўсё-ж мы бачым, што высылка ішла „пачкамі“, і паліцыя шчыра дапамагала старанным земляўпарадчыкам. Высылкі, бязумоўна, набылі шырокі масавы характар, калі запатрабавалася ўмяшацельства самога міністра ўнутраных спраў. Паводле яго распараджэньня на імя Чарнігаўскага губарнатара і ўсіх іншых губарнатараў быў разасланы адносьнік ад 14 чэрвеня 1910 году, у якім пісалася:

„Господин министр Внутренних дел неоднократно изволил высказываться против применения исключительных законов к делам, возникавшим на почве закона 9 ноября“[4]. Хаця той-жа самы міністар добра ведаў аб усіх высылках з губэрні за агітацыю супроць закону 9 лістапада, бо пастановы аб высылках губэрнская ўлада пасылала на зацьверджаньне ў міністэрства ўнутраных спраў.

Пасьля гэтага „тлумачэньня“ губэрнская ўлада пачала расправляцца сваімі мерамі, якімі—убачым ніжэй. Цікава адзначыць, што ўсе справы па выдзяленьню на хутары амаль цалкам былі сконцэнтраваны ў міністэрстве ўнутраных спраў. Гэта цалкам зразумела, бо сама рэформа была задумана ў строга клясавых мэтах рэакцыянэраў, дбаўшых аб тым, каб гарантаваць сябе ад паўтарэньня 1905 г.

Ясна, што ўсе шматлікія высылкі ня толькі ня спынілі агітацыі, але яшчэ ўзмоцнілі яе. Клясавая барацьба на сяле ўсё абвастралася ў меру таго, як паглыблялася дыфэрэнцыяцыя на сяле, як усьведамляліся клясавыя інтарэсы дзьвюх проціглеглых груповак заможнай буржуазіі—кулацтва і бядняцка-серадняцкіх мас. Вясковы кулак-заможнік цалкам выявіў свой твар, як рабаўніка грамады вёскі. Сталыпінская рэформа дапамагала гэтаму.

Барацьба галоўным чынам накіроўвалася супроць кулакоў-заможнікаў, якія захапілі лепшыя землі і рабавалі вёску. У літаратуры ўжо даведзена, хто выдзяляўся ў былой Расіі на хутары (з прац Леніна, Дуброўскага па Беларусі, Дудкова і іншых)—гэта былі тыя, з аднаго боку, хто хацеў расквітацца з вёскай, хто ня меў на чым гаспадарыць. *У большасьці-ж* выдзяляліся тыя, каму было цесна ў грамадзе, хто сконцэнтраваў у сваіх руках многа надзельнай ці купленай зямлі, хто пераводзіў гаспадарку на капіталістычныя рэйкі. Мы прывядзем

[1] Там-жа.
[2] Там-жа.
[3] Там-жа.
[4] Там-жа.

толькі два прыклады, трапіўшыя пад руку па Магілеўскай губэрні па асобным вёсках. Адна з вёсак Магілеўскай губэрні, якая часткай хацела выйсьці на хутары, мела зямлі купленай:

| Група | Двароў | Дзесяцін | Дзесяцін на 1 двор[1]. |
|---|---|---|---|
| Да 5 | 8 | $14^1/_3$ | 1,8 |
| Да 20 | 10 | $127^1/_2$ | 12,7 |
| Больш 31 | 6 | 281 | 46,8 |

Ясна, што кулакі хацелі выдзеліцца, каб захапіць лепшыя землі, каб на іх абсталяваць гаспадарку па-капіталістычнаму, пазбавіўшыся ад дробных уціскаў з боку грамады.

Возьмем другі прыклад, вёска Замачульле Магілеўскага павету падала заяву, каб расьсяліцца на хутары. Гэтая вёска мела 636 дзесяцін зямлі надзельнай і 409 дзесяцін купленай. Разумеецца, купленую зямлю мелі толькі паасобныя кулакі. Пры разьбіўцы на хутары атрымалі зямлі наступную колькасьць:

| Групы | Двары | Дзесяціны | | Дзесяцін на 1 двор | % двароў | % дзесяцін зямлі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Да 5 дзес. . . | 5 | 22 дзес. | 211 с | 4,5 | 7,2 | 2,1 |
| Ад 6 да 10 . . | 14 | 120 „ | 1590 „ | 8,5 | 20,3 | 11,5 |
| „ 11 „ 15 . . | 23 | 320 „ | 822 „ | 13,9 | 33,3 | 30,7 |
| „ 16 і больш . | 27 | 581 „ | 968 „ | 21,5 | 39,2 | 53,7 |
| | 69 | 1045 | 691 | 15,1 | 100 | 100 |

Мы прывялі даны прыклад, каб паказаць, што на вёсцы зьявілася вельмі значная група вясковай буржуазіі, якая концэнтравала ў даным прыкладзе па 30—40 дзесяцін у адных руках і вядзе агітацыю за хутары, а дзе-ні-дзе ім удавалася ашукаць бядняцка-серадняцкую частку вёскі.

Што на хутары ішлі пасьля закону 9 лістапада ў першую чаргу заможнікі і кулацтва, гэта абсолютна ясна. І ў гэтых адносінах вельмі часта падавалі прыклад на Беларусі заможнікі літоўцы і латышы. Так, выхадцы з Ковенскай губэрні Росіянскага павету пры садзейнічаньні сялянскага пазямельнага банку купілі ў 1888 годзе маёнтак Пясчанку ад земляўласьніка Шкультыцкага[2] ў Магілеўскай губэрні. Гэтыя выхадцы купілі зямлю цэльным таварыствам у ліку 990 дзес. 8 чэрвеня 1909 году. Пясчанскае таварыства, якое налічвала ўжо 37 чалавек, пажадала разьбіць сваю зямлю на хутары. Сярод таварыства 4 чалавекі былі ня згодны падзяляцца на хутары, рэшта-ж, галоўным чынам заможнікі, дабіліся свайго. Вось даныя аб маемасным стане гэтага таварыства, праўда, даныя за крыху пазьнейшы час:

[1] ЛОЦИА ГУЗЗ Юрыд. Отд. Дело № 9, ч. 3, 1913 г.
[2] Маг. Гіст. Арх. Спр. Зем. Ком. № 14, 1914 г.

| Група | Лік гас. | Зямлі | | Душ сям'і | Коняй | Кар. | Цялят | Кошт буд. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Дес. | Саж. | | | | | |
| Да 5 дес. . . . . . | 1 | 2 | 110 | 5 | — | 1 | — | 40 |
| з 5—10 . . . . . | 1 | 9 | 1.735 | 8 | — | 1 | — | 200 |
| з 10—15 . . . . . | 8 | 99 | 883 | 28 | 7 | 10 | 12 | 3.300 |
| 15—20 . . . . . | 5 | 86 | 2.039 | 23 | 8 | 12 | 8 | 2.300 |
| 20 і больш . . , . | 20 | 642 | 631 | 162 | 49 | 82 | 33 | 1.6400 |
| Усяго . . . | 35 | 840 | 598 | 226 | 64 | 108 | 53 | 22.240 |

Як бачым, у даным таварыстве пераважаюць заможнікі і вясковая буржуазія; калі ў сярэднім на апошнюю групу прыпадае па 40 дзес., дык у гэтай групе асобныя кулакі маюць ад 53 да 93 дзес. зямлі на двор.

Калі мы разьмяркуем даныя гаспадаркі паводле колькасьці рабочай жывёлы, дык атрымаем наступны малюнак:

| Група | Лік двароў | %% | Лік коняй | %% | Група | Лік двароў | %% | Лік кароў | %% |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бяз коняй . . | 3 | 8,6 | — | — | Без кароў . . | 1 | 2,8 | — | — |
| З 1 канём . . | 13 | 31,1 | 13 | 20,3 | З 1 каровай . | 8 | 22,8 | 8 | 6,9 |
| З 2 „ . . | 16 | 37,1 | 26 | 40,6 | З 2 „ . | 7 | 20 | 14 | 12,1 |
| З 3 і больш . | 6 | 17,2 | 25 | 39,1 | З 3 „ . | 8 | 22,8 | 24 | 20,7 |
| | | | | | З 4 і больш . | 11 | 21,4 | 70 | 70,3 |
| Усяго | 35 | 100 | 64 | 100 | Усяго | 35 | 100 | 116 | 100 |

Такім чынам, мы бачым сярод сяброў таварыства даволі рэзкую дыфэрэнцыяцыю. 4-ая група з 3 коньмі больш, бязумоўна, кулацкая гаспадарка, такіх гаспадарак мы маем у таварыстве 17 проц., а коняй на іх прыпадае 39,1 проц. Але і ў групе 3-яй—з двума коньмі, мы маем, бязумоўна, заможныя гаспадаркі, якія перарастаюць у кулацкія; як апошнія, гэтак і трэція групы, бязумоўна, эксплёатавалі батракоў. Яшчэ больш рэзка можна выявіць дыфэрэнцыяцыю сярод гэтага таварыства, калі глянем на разьмеркаваньне па гаспадарках кароў. Пятая група нашай таблічкі налічвае адзінаццаць гаспадарак, што ў адносінах да ўсяго таварыства складае 31,4 проц., і гэтая група мае 60,3 проц. усіх кароў, інакш з 116 штук 70 штук належыць да гэтай групы. Гэта і ёсьць капіталістычныя гаспадаркі літоўцаў і беларусаў, якія мелі вучасткі зямлі больш за 20 дзес. і ставілі малочную гаспадарку. Зусім зразумела, што ў абшчыне ім зрабілася цесна. Яны імкнуліся расьсяліцца і організаваць фэрмы, дзе гаспадарку вядуць пры дапамозе батракоў, вельмі эксплёатуючы сваіх-жа сапляменьнікаў. Гэтыя гаспадаркі ўжываюць складаныя сельска-гаспадарчыя машыны, што дае магчымасьць і пры двух конях разгортваць капіталістычную таварную гас-

падарку. Гэтая буржуазія як беларуская, так і ўсякага роду выхадцы заводзяць малочную гаспадарку і займаюцца пастаўкай на рынак масла. Але, як відаць з табліцы, некалькі гаспадарак відавочна зруйнаваныя вышла ў рады беднаты. Зразумела, гэтыя гаспададаркі займаліся ўжо продажам рабочай сілы ў кулацкія і памешчыцкія гаспадаркі.

Мы можам зрабіць вывад, што так званыя таварыствы складаліся ў сваёй пераважнай частцы з вясковай буржуазіі і заможных элемэнтаў вёскі. Для вясковай буржуазіі пераход на хутары быў выгодны. Паданыя прыклады даюць куды больш чым афіцыяльная статыстыка, якая заўсёды выводзіць сярэднюю лічбу і гэтым злоўжывае, замазваючы дыфэрэнцыяцыю вёскі і ўжо аформленыя капіталістычныя вяршкі. Такім чынам, на хутары выдзяляюцца пераважна заможныя элемэнты; застаецца, зразумела, маламоцнае сялянства, і між гэтымі клясавымі групамі разгараецца лютае клясавае змаганьне. Кулакі захапляюць лепшыя кавалкі зямлі (мы маем безьліч прыкладаў). Сялянская грамада адмаўляе ў выдзеле кулаку, але апошні пры дапамозе земскага начальніка ўсё-ж ткі выдзяляецца і атрымлівае зямлю там, дзе хоча. Так, у вёсцы Маркаўцы, Магілеўскай губэрні, кулак Іван Пятушкоў захацеў выйсьці на хутар; грамада яму адмовіла, але ўсё-ж такі яго жаданьне было задаволена. Корэспондэнт чорнасоценнай газэты „Русское Знамя“, апісваючы гэта, падае досыць цікавы факт (як вядома, чорнасоценнае „Русское Знамя“ заняла варожую позыцыю адносна сталыпінскай рэформы і адбівала погляды самай махровай чорнай сотні). Ён піша:

„В нашей местности (Магілеўская губ.—К. К.) выход одного крестьянина на отруба или хутор влечет за собой разгром целого общества. Так как выделенный кусок да еще хорошей земли включает в себе полосы земли многих крестьян, а потому крестьянам приходится или всем выходить на хутора, или делить. В нашем захолустье не только делается непорядок, но и мужиков вынуждают творить беспорядок. Выходит и говорит (землеустроитель—К. К.): „На хуторах и отрубах вам будет лучше“, а мужики отвечают: „Не пойдем и не хотим“. „Ну, не хотите, так вас и так разгоним“—и разгоняют. А чтобы разгон сделать, *то первому пожелавшему выйти на отруб или хутор вырезывается та земля, какую он где пожелает, т. е. будет удобней ему, этому самодуру, идущему против всего общества жить да еще держать в кулаке все общество*“. (Падкрэсьлена мной—К. К. (У).

Корэспондэнт саюзу Архангела назіраў факт, але тлумачэньне яго мы мусім адкінуць: не „самодур“, а вясковы кулак, вызнаўшы свае інтарэсы, рабуе грамаду вёскі пры дапамозе сталыпінскіх законаў, карыстаючыся момантам, каб захапіць лепшыя землі і ў сваіх руках трымаць усю вясковую грамаду. Трэба сказаць, што „ретивые“ земляўпарадкавальнікі ня толькі разьвівалі вялікую агітацыю, але літаральна разганялі грамаду вёскі, бо апошняя пасьля рэволюцыі 1905 г. зрабілася ў вачох улады рэволюцыйным гняздом, якое трэба было зьнішчыць. Ясна, што пры такой рэформе дапушчалася шмат злачынстваў як з боку земляўпарадкавальнікаў, так і з боку ўлады, і гэта не магло не падаграваць аграрнага руху. Так, здаецца, у чорнасоценнай газэце „Гроза“ быў надрукаваны фэльетон „Ретивый землеустроитель“, дзе апісвалася, як земскі начальнік 5 уч. Віленскага павету Сакалоўскі прымусіў сялян вёскі Магуны расьсяліцца; на просьбы сялян не рабіць гэтага ён адказаў „бунт“, выклікаў прыстава, стражнікаў, быў засечаны селянін Тамашэвіч, у адміністрацыйным парадку многія былі загнаны

ў турмы. Кулаку Макевічу замест 31 дзесяціны дана было 44 дзесяціны лепшай зямлі. На скаргі сялян у міністэрства ўнутраных спраў Сакалоўскі ня быў пакараны, „ибо он хорошо реформу проводит и один из „лучших“ земских начальников губернии“ [1].

Земляўпарадкавальнікі сілком бяз згоды грамады выдзялялі кулакоў і вельмі часта пры дапамозе паліцыі разганялі вёску і нішчылі грамаду. Мы маем шмат заяў на „высочайшее имя“, дзе сяляне моляць, каб іх пакінулі ў спакоі. Напомнім тут прыклад, які падае ў сваёй кнізе Карпаў, дзе нават памешчыца заступаецца за сялян перад міністрам ад „ретивых“ земляўпарадкавальнікаў [2]. Падамо яшчэ прыклад. Так, з самага цэнтру расьсяленьня на хутары ў Магілеўскай губ. Аршанскага павету сяляне вёскі Корунна падалі прашэньне на імя „главноуправляющего“, дзе, між іншым, пішуць:

„*Оршанская уездная землеустроительная комиссия насильственно заставляет нас делить свою землю на футора, на что мы не имеем желания, что земли у нас совершенно мало и постройки наши уже очень ветхие*, мы должны лишиться как движимого имущества, так как каждый домохозяин имеет всего лишь *по 2 десятины* земли; такое малое количество земли если разверстать на единицы, постройки перенести, *как нас* заставляет *насильственно* землемер и Оршанская землеустроительная комиссия, тогда мы, старики и малые дети, должны умереть с голоду. *Мы обращались в губернскую землеустроительную комиссию и Оршанскую уездную комиссию, чтобы она не производила нам насильственно выдел на футора нашей земли, просьбы наши оставлены без последствий*“ [3]. (Падкрэсьлена мной—К. К.).

Вось яркі прыклад таго, як сялянства з бядняцкай часткі адносілася да рэформы і якімі спосабамі ўрад садзіў на хутары бядняцкасераднядкую частку вёскі. Дзе-ні-дзе паддаўшыся агітацыі земляўпарадкавальніка і ўлады, сяляне падавалі заявы аб выдзеле на хутары, але потым хутка бралі іх назад і прасілі, каб іх не чапалі.

Але дарэмна, справа была ўжо заведзена і „рэформаторы“ пачыналі дзейнічаць. Так, вёска Тоўпечыцы Магілеўскага павету ў сваім прашэньні пісала наступнае:

„Некоторые из нас по недоразумению, а некаторые по внушению своих друзей, приятелей и родственников мы все с общего согласия подали заявления в землеустроительную комиссию о размежевании нашей земли под хуторские участки. *Замысел этот наш совершенно не обдуман и не нашлось нам благодетеля, который внушил-бы нам, что замысел наш явится для нас весьма затруднительным и совершенно разорительным. Мы все бедного состояния и положительно никаких не имеем средств на перевозку и на нашей земле не найдется столько удобных мест... Вышеизложенное обстоятельство явно предвещает не житье, а муку. Пока на хуторской участок переберемся жить, ранее нажитое приходится решить и впоследствии настрадавшись придется от земли отрешиться*“ [4]. (Падкрэсьлена мной—К. К.).

Гэтыя сяляне ў павятовай камісіі нічога не дабіліся. Земляўпарадкавальнікі моцна трымаліся за першую іх заяву, пагроза-ж расьсяленьня, відаць, стала вельмі рэальнай, і сяляне вышэй цытаваную

[1] ЛОЦИА МВД XI д-во дел. № 20, 1912 г.
[2] Карпов. Аграр. полит. Сталыпина.
[3] ЛОЦИА ГУЗЗ Юрид. отд., д. № 9, ч. 3, 1913 г.
[4] Маг. Гіст. Арх. МУЗК, справа № 21, 1909 г.

заяву падалі на імя губарнатара. Але і гэта заява, здаецца, засталася бяз выніку.

Гэтыя вось матар'ялы сьведчаць аб тым настроі, які панаваў у бядняцка-серадняцкай часткі сялянства. Яны досыць добра выкрываюць сапраўдную сутнасьць палітыкі Сталыпіна—разагнаць вёску, выдзеліць кулакоў на хутары, аддаць вёску ім на рабунак. І, бязумоўна, гэта не магло ня выклікаць адпору ў маламоцнага сялянства, якое ўпарта бароніць грамаду ад палітыкі ўраду.

Вакол хутароў разгарнуліся моцныя клясавыя бойкі. Бядняцка-серадняцкая частка вёскі змагаецца з кулацтвам і заможнікамі, а, значыць, і з сталыпіншчынай, якая была толькі манэўрам царызму, шукаўшым на сяле апоры для сваіх клясавых рэакцыйных мэт. Ад „чысткі" зямель па-сталыпінску тлустыя кавалкі мусілі перапасьці на долю вясковай буржуазіі, і гэтым памешчыцкі ўрад хацеў купіць сабе саюзьніка на сяле. Усе гэтыя Пятушковы, Галдзенкавы і К$^{0}$, меўшыя 25—40 і больш дзесяцін зямлі, хацелі ня толькі выдзеліцца з грамады, але зрабіць гэта якраз так, каб атрымаць лепшыя кавалкі і каб трымаць усю вёску ў сваіх руках. Зразумела, што на грунце выдзяленьня адбыліся шматлікія бойкі як з кулакамі, так і з паліцыяй, якая заўсёды зьяўляецца неабходным памагатым пры земляўпарадкаваньні. Так, у вёсцы Стражэвічах Магілеўскай губэрні адбылося ўпартае змаганьне з кулакамі і заможнікамі. З 77 гаспадароў яшчэ ў 1908 годзе 56 чалавек падалі заявы аб жаданьні выйсьці на хутары, але пасьля нязгодных на гэта аказалася 33 чалавекі. Земляўпарадкавальнікі так склалі проект, што сядзібы нязгодных трапілі ў агульную разьвёрстку. Атрымалася такое становішча, што тыя, хто застаўся ў грамадзе, мусілі зьнесьці свае будынкі і выселіцца на новыя месцы на абруб, адведзены ім у другім месцы. Тыя гаспадары, што засталіся, скардзіліся ва ўсе інстанцыі губэрні, але дарэмна: ім далі трохгадовы тэрмін на высяленьне і знос будынкаў; увесь гэты час прайшоў у цеганіне, па судох, і ўсюды, бязумоўна, тыя гаспадары, што не пажадалі выдзяляцца і засталіся, атрымалі адмоўны адказ. У 1911 годзе кулакі падпалілі вёску і ўсе хаты тых, якія засталіся, былі спалены чырвоным пеўнем,—думалі выжыць тых гаспадароў, што засталіся ў вёсцы. Але апошнія моцна трымаюцца і не аддаюць сваіх сядзіб. Сам губарнатар так даносіў аб іх у міністэрства ўнутраных спраў:

„Несмотря на все усилия и старания прибывших в деревню Стражевичи 29 июня сего года местных *предводителя дворянства, земского начальника и исправника* путем убеждений и уговоров заставить жалобщиков спокойно подчиниться судебному решению, посьледние *категорически* заявили, *что они отказываются исполнить решение добровольно*. При этом местный уездный исправник донес мне, что жалобщики по характеру крайне дерзки и строптивы и принимали участие во всех аграрных беспорядках 1905—1907 гг., за что многие из них неоднократно *подвергались каре в административном порядке*... Изложенное выше заставляет по окончании полевых работ принять к концу сего августа или же началу сентября *решительные меры полицейского воздействия*"[1]. (Падкрэсьлена мною—К. К.).

Вось як выглядала „рэформа" па-сталыпінску: рабаваньне грамады кулакамі, адданьне яе на „паток" кулацтву. Апошнія паляць вёску, каб выкурыць беднату і захапіць іх сялібы — самую лепшую і багатую зямлю і каб канчаткова яе зруйнаваць. Спраўнік успамінае

[1] ЛОЦИА МВД Зем. отд., дело № 100, 1910 г.

1905 год у доказ таго што, з імі няма чаго цацкцца,—гэта апошні поліцэйскі аргумэнт, калі трэ' было „націснуць“ на міністра. Але паглядзім, якое становішча было тых, хто застаўся ў грамадзе: гэта лепш за ўсё відаць з іх-жа прашэньня на імя „главноуправляющего“. З гэтага прашэньня відаць, у якім становішчы апынуліся непажадаўшыя выйсьці на хутары—бясконцыя суды, пажар—усё гэта канчаткова зруйнавала іх гаспадаркі, іх прашэньне варта таго, каб яго прывесьці. Між іншым, яны пішуць: „все наши жалобы, просьбы, мольбы остались без уважения, а на некоторые ответа совсем не получили, наконец *последовало выселение нас из усадебных мест мерами полиции, которая в продолжение двух лет приступала к ломке строений*, производя нам значительные убытки, отразившиеся на нашем жалком благосостоянии, кроме того, многих из нас, домохозяев, подвергали истязаниям за неповиновение властям, судили, по суду многие сами и некоторые члены семей отбывали наказание от одного до трех месяцев... Ломка нашего быта, которая произошла з умыслом бывшего земского начальника господина Волковича, приложившего старания к принудительной разбивке на хутора нашу деревню Стражевичи, может быть одну из богатейших во всем его участке не только населением, но когда то в материальном отношении, для того чтобы заслужить внимание высшего начальства, как делового человека по устройству хуторей, между тем благодаря заслуге и поощрениям со стороны начальства, мы помимо того, что разорены и понесли убытки в значительной суме, более 20.000 руб., *не считаясь с пожаром, происшедшим из-за хутарей*, коим уничтожены почти все жилые постройки в селении, нам, 33 домохозяевам, было воспрещено возводить на усадьбах отошедшие под хутора для других жилые помещения, вследствие чего мы несколько суровых зим с малыми детьми ютились в токах и овинах, терпя холод, который повлек в могилу несколько десятков жизней стариков и детей“ [1]. (Падкрэсьлена мною—К. К.).

У гэтым прыкладзе асабліва выразна ва ўсім сваім „бляску“ выступае сталыпіншчына і асабліва выразна выступаюць адносіны масы сялянства да яе. Нічым няпрыкрытае рабаваньне на карысьць кулакоў і заможнікаў вясковай грамады—пажар, якім імкнуліся выкурыць беднату з самай лепшай зямлі ў вёсцы,—усё гэта, бясспрэчна, было вельмі добрым прадметным урокам, які даваў рэакцыйны ўрад шырокім сялянскім масам. І трэба сказаць, што гэтыя ўрокі сялянская маса добра адзнала, лепшай зарукай таму і доказам гэтага зьяўляецца вялікая Кастрычнікавая рэволюцыя, калі шырокія сялянскія масы расправіліся са сваім спрадвечным ворагам, калі былі зьменены ўсе перажыткі фэўдалізму і сялянскія масы ўрэшце атрымалі тую зямлю, за якую яны змагаліся.

Але сялянства, яго асноўная бядняцка-серадняцкая маса ў часы сталыпінскай рэформы не заставалася пасыўнай. Яна правяла рашучае змаганьне супроць сталыпінскай політыкі хутарызацыі. Да разгляду гэтага змаганьня мы і пярэйдзем.

Перш за ўсё адзначым, што супроць сталыпіншчыны выступілі рабочыя Бежацкіх заводаў у мястэчку Хоцімску Магілеўскай губэрні. У гэтым мястэчку агітаваў Магілавец, які лічыў нявыгодным адрубнае землякарыстаньне і выказваўся наогул супроць інстытуту прыватнай уласнасьці і супроць закону 9 лістапада. Урад выслаў Магілеўца за

[1] ЛОЦИА ГУЗЗ Юрид. отд. № 49, 1912 г.

межы губэрні, але агітацыя ня спынілася, а „брожение“ распачалося „среди крестьян и не занимающихся земледелием, мастеровых и рабочих Бежецких заводов“. Гэтак даносіў неадменны член земляўпарадачнай камісіі. Прычым гэтае нежаданьне да пераходу на хутары ён тлумачыў тым, што гэтым групам насельніцтва мястэчка нявыгодна, каб сяляне разьбіліся на хутары, бо яны будуць сьціснуты ў выганах. Нам здаецца, што тут дзеяла агітацыя мясцовай партыйнай арганізацыі. Зусім не дарэмна неадменны член Пржыбышэўскі ківае ў бок рабочых, піша, што:

„Местечко Хотимск с его еврейским, мастеровым и рабочим Бежецких заводов населением все время является этапом антиправительственного движения и рассадником агитации, что особенно сказалось в 1905 году“ [1].

Факт адмоўных адносін рабочых сьведчыць аб тым, што рабочыя правільна зразумелі сталыпіншчыну. У Хоцімскай справе шмат увагі адводзіцца „памылкам“ каморніка Саўчанкі, які так пабіў зямлю, што некаторыя кулакі атрымалі куды больш зямлі і лепшай па якасьці, чым гэта трэ‘ было. Ясна—на шкоду шырокім сялянскім маламоцным масам. Гэта ўсё і выклікала той адпор і глухое хваляваньне, якое адбылося ў мястэчку Хоцімску.

Але ў другіх мясцох на грунце выдзяленьня кулакоў на хутары змаганьне набыло больш рэзкія формы.

У вёсцы Лыкава той-жа губэрні чатыры кулакі патрабавалі выдзелу надзельнай зямлі к граніцы імі купленай і падалі аб гэтым заяву ў губэрскую камісію. Грамада вёскі Лыкава катэгорычна адмовіла ў іх хадайніцтве. Улада пастанавіла выдзеліць гэтых кулакоў у абавязковым парадку, і павятовы зьезд прызнаў выдзел магчымым.

Раніцой 22 чэрвеня 1910 году неадменны член Прус-Жукоўскі і каморнік Жлоба прыехалі ў вёску Лыкава, каб скласьці плян у натуры. Сяляне ў гэты час касілі на лузе памешчыцы графіні Мензынскай, у вёсцы былі толькі бабы і дзеці. Калі сяляне заўважылі каморніка, які спыніўся ў кулака Лісея Чудакова, які выдзеліўся з грамады, то натоўп чалавек у сорак, „узброеных каламі“, падыйшлі да хаты і пачалі біць па сьценах. Каморнік Жлоба выйшаў з хаты і пачаў іх угаварваць. Але натоўп заявіў, што калі каморнік з вёскі ня выедзе, то яго і тых, хто згоджаецца на выдзел, заб‘юць. Каморнік выехаў насустрач Прус-Жукоўскаму, які крыху затрымаўся, і, сустрэўшыся з апошнім за вёскай, параіўся і накіраваўся за ім у вёску. Але ў вёсцы іх сустрэў ужо натоўп у 180 чалавек, у якім былі ўжо і мужчыны. Прус-Жукоўскі ў сваю чаргу пачаў угаварваць натоўп па-добраму выдзеліць кулакоў. Потым яны накіраваліся на месца выдзелу, але на шашы іх спыніў натоўп мужчын, якія кінулі касіць і пачалі зьбягацца. Прус-Жукоўскі і каморнік вышлі з экіпажу, каб пачаць перамаўленьні, але натоўп накінуўся на іх і на кулака Чудакова. Адна жанчына выцяла калом „непременного члена по спине“, а нехта каморніка па руцэ. Каморнік і Прус-Жукоўскі пасьпяшаліся да экіпажу і, як толькі ён крануўся з месца, увесь натоўп кінуўся на кулака Чудакова. Апошні, ратуючыся ад натоўпу, павіс на адным з супражных коняй, але ўдар кала зьбіў яго на зямлю і частка натоўпу кінуліся на яго і пачала зьбіваць, другая частка кінулася за экіпажам і на працягу дзьвюх вёрст гналася за „непременным членом“ і каморнікам, кідаючы ў экіпаж каменьнямі.

[1] ЛОЦИА ГУЗЗ орг. д-во № 2, ч. III 1911 г. ліст 302.

Калі зьбіты Чудакоў прыйшоў да памяці і папрасіў піць, то „одна с деревенских девиц совершила над им дикое отвратительное издевательство“.

Назаўтра прэдвадзіцель дваранства, „непременный член“ і каморнік разам з павятовым спраўнікам і 20 коннымі стажнікамі прыехалі ў вёску Лыкава. На словы прэдвадзіцеля і тлумачэньне закону 9 лістапада натоўп крычаў, што ня дасьць зямлі і калі ўсё-ж такі ўлада, ня гледзячы на протэст сялян,—накіравалася на месца выдзелу, то адна з жанчын кінула ў прэдвадзіцеля каменем. Па гэтай справе было арыштавана 26 чалавек і ўсе яны былі засуджаны акруговым судом за злачынства ў турму па 269 артыкулу ад 9 да 2 тыдняў [1]).

Такім чынам, ня гледзячы на протэст і нежаданьне грамады выдзеліць кулакоў, усё-ж такі апошнія атрымалі лепшыя землі і абрабавалі вёску. Усе чатыры кулакі мелі купленую зямлю, да якой прасілі выдзеліць іх надзельную, апошняй у іх было: у аднаго 12 дзесяцін 927 саж., у другога 16 дзес. 1.235 саж., у трэцяга 8 дзесяцін 617 саж. і ў чацьвертага 8 дзесяцін 618 саж. надзельнай зямлі. Чатыры кулакі, як гаварылася, атрымалі самую лепшую зямлю, гэтаму мы маем докумэнтальныя сьведчаньні. Сяляне в. Лыкава ў сваёй заяве на імя міністра ўнутраных спраў, між іншым, пісалі, што:

„В пользу 4 лиц отняты из нашей самой удобнай дорогой центральной земли, а нарезано совершенно негодной, доставшейся более 75 человекам, *отняли землю нахальным путем*“ [2]. (Падкрэсьлена мною—К. К.)

Такое „проведение“ рэформы, а яно і не магло быць інакшым, не магло не праясьняць клясавых адносін на вёсцы, тым больш, што рэформай закраналіся самыя кроўныя матар'яльныя інтарэсы асноўных мас. Мы маем далей цэлы рад спраў з выступленьнямі сялянства, дзе яны супраціўляюцца і землюўпарадчай уладзе і каморніку. Характэрна адбылася бойка ў вёсцы Маркаўцы, Клімавіцкага павету Магілеўскай губэрні ў 1913 годзе. Селянін (кулак, меўшы 24 дзес. зямлі) Іван Пятушкоў выявіў жаданьне выдзеліцца на хутар, але гэтага мала, ён захацеў, каб зямля была выдзелена на беразе ракі Беседзі, дзе заўсёды ўся сялянская жывёла хадзіць на вадапой. Грамада захвалявалася, катэгорычна адмовілася ад гэтага выдзелу. Але зьявіліся зямельныя чыны і паліцыя—пристаў і 4 старжнікі. Бачачы ўзьняты настрой сялян, пристаў загадаў закласьці патроны і страляць... Сяляне, па словам корэспондэнта „Рус. Зн.“, паднялі рукі ўгару і адказалі—„страляйце“. Так пад рулямі вінтовак адбываецца выдзел. Але Пятушкову гэта дарма ня прайшло: ён быў зьбіты ў гэты самы дзень. А праз колькі дзён, ня гледзячы на ўсё гэта, зьявіўся каморнік і пад аховай 6 конных стражнікаў хутар быў выбіты, а „заваднікі“ ў ліку 11 асоб на розныя тэрміны былі пасаджаны ў турму [3].

Як ужо зазначалася, шмат сутычак было між клясавымі групамі на вёсцы і з паліцыяй, і з зямельнымі чынамі. Былі яны ня толькі ў Магілеўшчыне. Яшчэ ў 1909 годзе некаторыя з заможнікаў і кулакоў вёскі Магуны Віленскага павету падалі заяву аб пераходзе на хутары. Але калі прыехаў неадменны член і каморнік, то за пераход на хутары выказалася менш $^2/_3$ гаспадароў. Ня гледзячы на гэта, каморнік застаўся ў вёсцы і пачаў быў рыхтавацца да некаторых землеўпа-

[1] ЛОЦИА МВД Зем. отд. II, д-во № 14, 1910 г.
[2] ЛОЦИА, МВД, Зем. отд. 2, д-во д. № 14, 1910 г.
[3] ЛОЦИА МВД Земск. Отд. № 30, 1913 г.

радчых работ. Натоўп перашкодзіў каморніку абмяраць сялянскія палеткі, але зьявілася паліцыя і прыстаў. Апошні быў зьняважаны дзеяньнем. За гэтае супраціўленьне да судовай адказнасьці было прыцягнена 18 чалавек сялян[1].

Больш вострую форму набыло змаганьне ў Менскай губэрні. У сяле Астравы Навагрудзкага павету адбыліся сур'ёзныя хваляваньні сялян з прычыны разьвярстаньня зямель на хутары на зямлі, купленай з дапамогай Сялянскага пазямельнага банку. Устанавіць, якая соцыяльная праслойка асабліва была актыўнай, нельга. Але на грунце разьдзелу на хутары ў 1912 годзе незадаволеныя выклікалі земскага начальнікі барона фон-Бэрга. Усіх сялян склікалі на сход, звонячы на трывогу. І калі земскі прыбыў, яго абступілі і пабілі. Потым кінуліся ў хату, дзе асталяваўся каморнік Сялянскага банку, зруйнавалі ўсю мэблю, зьнішчылі пляны, а докумэнты спалілі[2].

У Бабруйскім павеце на грунце выдзяленьня ў вёсцы Сапейках адбыліся „непарадкі“. Два кулакі захацелі выдзеліцца, але нязгодная з гэтым грамада захвалявалася, у выніку чаго многія былі моцна пабіты стражнікамі, а 27 чалавек заарыштавана[3].

У гэтым павеце, як відаць з данясеньня спраўніка, сяляне вёскі Заеліцы ў 1912 годзе выдзеленым на хутары кулаком не давалі працаваць—араць поле пад ярыну, і толькі ўмяшальніцтва самога спраўніка і „из'ятие главарей“, як тэлеграфам спраўнік даносіў губарнатару, спыніла рух. Па гэтай справе было заарыштавана 7 чалавек і галоўнага завадніка Якава Смычкіна пасадзілі на 2 месяцы ў турму. Такім чынам, толькі ўмяшальніцтва паліцыі дапамагло хутаранам-кулаком распачаць работу[4].

Здаецца, што і паданых прыкладаў досыць, бо яны з няўхільнасьцю сведчаць аб абвастрэньні клясавага змаганьня між вясковым кулацтвам і бядняцка-серадняцкімі масамі. Гэта быў протэст супроць „прускага“ шляху разьвіцьця сельскае гаспадаркі, супроць політыкі ўраду, выяўляўшай клясавыя інтарэсы юнкера, які капіталізаваўся, гэта было змаганьне супроць „чысткі“ земляўладаньня па-памешчыцку.

Гэты рух пачаў найбольш выяўляцца пасьля 1910 г. і набіраў напружнае энэргіі ў 1914 г. Старыя супярэчнасьці ящчэ больш абвастрыліся, калі раздаліся сапраўдныя грымоты надыходзячай аграрнай рэволюцыі. Ніжэй мы спынімся на самым яркім прыкладзе змаганьня сялянскай масы супроць кулацтва. У Рэчыцкім павеце рух набыў самыя вострыя формы, прывёўшы да разгрому хутароў. На гэтым прыкладзе асабліва рэльефна выступае змаганьне за „амэрыканскі“ шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Акалічнасьці справы такія: памешчык Горват прадаў урочышча „Сьвірэнь“ нейкаму Глебаву, жыхару г. Кіева. Апошні ў 1911 годзе прадаў гэту зямлю 34 сялянам вёскі Баранаўкі Кіеўскай губ... Купіўшыя мелі па 14—20 і больш дзесяцін на хутар. Некаторыя з хутаран завялі ўжо гаспадарку і засеялі поле. Між навасёламі-кулакамі і сялянамі вёскі Грушаўкі пачаліся непаразуменьні літаральна на другі-ж дзень. Між іншым, у 1911 г. грушаўцам было прапанавана ўладай перайсьці на хутары, але яны адмовіліся, і вось пачынаецца ўпартае змаганьне: грушаўцы выганяюць жывёлу на палі хутаран, прычым гаварылі: „нашы дзяды тут пасьвілі і мы будзем

[1] ЛОЦИА МВД Зем. Отд., дело № 82, 1909 г.
[2] ЛОЦИА МВД Зем. Отд., д. № 60, 1913 г.
[3] ЛОЦИА МВД Земск. Отд. № 30, 1913 г.
[4] Мен. Гіст. Арх. Канц. губ., справа № 8828, 1912 г.

пасьвіць". Аказваецца, некалі вурочышча Сьвірэнь было ці пад сэрвітутам, ці ў арэндзе сялян грушаўцаў. Гэта і паслужыла асновай непасрэднага змаганьня.

15 красавіка 1913 году ўсе жыхары вёскі Грушаўкі выгналі сваю рагатую жывёлу ў ліку 300 галоў на засеянае поле хутаран. Адзін з хутаран Курганенка хацеў прагнаць жывёлу, але адзін з пастухоў выцяў яго ў сьпіну, а другі выстраліў з стрэльбы, на крык Курганенкі зьбегліся хутаране і адабралі ад пастухоў стрэльбу. Але апошнія зараз-жа пабеглі ў вёску і вярнуліся ўжо з натоўпам чалавек у 40— хто з калом, а хто і са стрэльбай. Прычым у абвінаваўчым акце гаворыцца, што старыя „подстрекали" аднавяскоўцаў разьбіць хутары і гэтым прымусіць пакінуць іх зямлю. Хутка натоўп павялічыўся, і ўсе кінуліся на першы хутар. Разьбілі вокны і шыбы, зьбілі замок, уварваліся ў хату, зламалі ўсю мэблю і скрыні. Хутараніну Мікіце Курганенку пераламалі правую руку, а жонку яго цяжка паранілі. Жонку хутараніна Федоценка, якая знаходзілася тут на двары, хацелі ўтапіць у студні, але, кінуўшы яе туды, зьлітаваліся і выцягнулі назад. На хутары Федаценка таксама разьбілі вокны, дзьверы, а гаспадароў моцна пабілі. Адзін з Грушаўцаў так моцна штурхануў хутаранку Маланьню Касьцючэнка, стаяўшую з грудным дзіцем на руках, што апошняя павалілася і задушыла насьмерць сваё дзіцё.

Паводле даных (губарнатара) натоўп пасьля гэтага разышоўся, а ўвечары зноў напаў на хутары. У хату Паўла Хаменкава праз акно было зроблена два стрэлы, прычым шрот застраў ля самых галоў, дзе спала ўся сям'я. Па даных газэты „Утро России" разгром хутароў ва ўрочышчы „Сьвірэнь" цягнуўся цэлы дзень і толькі прыбыўшая паліцыя спыніла яго.

Як высьвятляецца з справы, гэтыя хутаране былі заможнікамі і кулакамі. Ня гледзячы на нядаўнюю куплю зямлі, у Мікалая Курганенкі ў часе пагрому было забрана 949 р., у Андрэя Кучарэнкі 441 р., Федаценкі 155 р. 75 кап.

Па справе аб разгроме хутароў з вёскі Грушаўкі было заарыштавана 52 чалавекі, з якіх 19 чалавек былі засуджаны на 8 месяцаў турмы з пазбаўленьнем усіх праў па састаяньні, восем чалавек — да 6 месяцаў без пазбаўленьня праў і 25 чалавек апраўданы. Само сабой зразумела, што засуджаныя вышэй адзначаную суму нібы ўкрадзеных у часе разгрому хутароў грошай мусілі вярнуць хутаранам-кулакам[1].

У гэтай праяве клясавага змаганьня асабліва рэльефна выступае змаганьне шырокіх сялянскіх мас супроць хутароў, а разам з гэтым і наогул супроць сталыпінскай палітыкі. Тут асабліва ярка выстаўляецца змаганьне за „амэрыканскі" шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі і ў данай форме сьплятаецца змаганьне сялянства супроць кулацтва, захапіўшага на думку сялян іх землі, са змаганьнем супроць памешчыкаў наогул. Такім чынам, грушаўцы змагаліся за свае старажытныя землі супроць новых памешчыкаў, якія зьявіліся замест старога пана Горвата, бо яны лічылі, што зямля пасьля „іх пана" павінна дастацца іменна ім.

Усе паданыя вышэй факты змаганьня бядняцка-серадняцкай часткі вёскі супроць вясковага кулацтва з бясспрэчнасьцю сьведчаць аб нарастаньні новай аграрнай рэвалюцыі на Беларусі.

Гэта нарастаньне асабліва хутка ішло пасьля ўздыму рабочага рэвалюцыйнага руху, і змаганьне сялянскай масы робіцца больш напруж-

[1] ЛОЦИА МВД Зем. Отд., дело № 60, 1913 г.

ным па меры набліжэньня да 1914 году, калі пры мобілізацыі быў разгромлены цэлы рад маёнткаў на Беларусі. Гэта ўсё сьведчыць аб тым, што ўрокі сталыпіншчыны дарма не загінулі. Яшчэ раз трэба падкрэсьліць, што сталыпіншчына праясьняла клясавыя адносіны на вёсцы, раскрывала шмат каму вочы на палітыку ўраду і яго клясавую сутнасьць, а ўся гэта палітыка, як ужо зазначалася, была ў тым, каб акапаць маёнтак старога прыгоньніка рэдутам кулацкіх гаспадарак. Гэта змаганьне прыводзіць і яшчэ да таго вываду, што Сталыпін са ўсёй сваёй палітыкай пацярпеў крах, яго аграрнай палітыкай была толькі крыху выпушчана пара, але накапленьне рэволюцыйных сіл і ў горадзе і на вёсцы ішло моцным тэмпам у меру набліжэньня да 1914 году.

Аграрная рэволюцыя зноў нарастала вельмі хутка, у клясавыя бойкі ўцягваліся ўсё большыя гушчы сялянскай масы, і першыя ластаўкі аграрнай рэволюцыі сьведчылі, што яна сама ўжо не за гарамі.

Пасьля ўсяго вышэйсказанага са ўсёй відавочнасьцю выступаюць нацдэмаўскія ўстаноўкі адносна цэльнасьці і адзінства „беларускага народу". Як-жа інакш можна ацаніць погляды нацдэмаў, як не на праяву кулацкай ідэолёгіі. Яны прыкрыліся тэрмінам „беларускі народ" і, спэкулюючы гэтым, маскавалі свой сапраўдны твар рэстаўратараў капіталізму. Сапраўды, у той час, калі на беларускай вёсцы адбываўся ўзмоцнены процэс дыфэрэнцыяцыі сялянства, калі вёска раскалолася на два полюсы, калі ў ёй кіпела бязьлітаснае клясавае змаганьне з панам, душыўшым усякімі перажыткамі фэўдалізму, і зрабаваўшы вёску на падставе сталыпінскіх законаў кулаком,—па Лёсіку і Доўнар-Запольскаму ўсё было ціха і спакойна, ніякага расслаеньня сялянства ня было. Так, Лёсік у артыкуле аб культурным стане Беларусі перад Лютаўскай рэволюцыяй піша:

„Пазнаць культуру Беларусі—гэта значыць пазнаць уклад жыцьця беларускага сяла, беларускай вёскі, мястэчка, засьценку — карацей сказаць, беларускага земляроба" [1].

Так, Лёсіка і К° больш цікавяць, бязумоўна, шляхецкія засьценкі, дзе, на яго думку, „гнязьдзіцца" беларуская культура, а пад „земляробам" тут, бязумоўна, маскуецца кулак, заможнік, вясковая буржуазія. Нацдэмы, як бачым, і шляхту залічалі да беларускіх „земляробаў" і зусім адмаўлялі расслаеньне на вёсцы як і клясавае змаганьне ў ёй. Так, той-жа аўтар ясна і выразна гаворыць:

„Сталася так, што беларусы к моманту Лютаўскай рэволюцыі станавілі народнасьць чыста сялянскую і па свайму нацыянальнаму твару". А вышэй некалькімі радкамі Лёсік зазначае, што Беларусь сялянскай зрабілася па свайму і эканомічнаму і грамадзянскаму ладу [2].

Тут і вядомая „самабытнасьць" і ўсе іншыя нацдэмаўскія ідэолёгічныя атрыбуты. Напярэдадні імпэрыялістычнай вайны і Лютаўскай рэволюцыі, як мы паказалі, расслаеньне беларускай вёскі зайшло вельмі далёка; яна раскалолася на два процілеглыя полюсы, на адным былі абрабаваная кулакамі і ім-жа эксплёатаваная разам з памешчыкамі сялянская бедната і маламоцныя групы і серадпякі, на другім — лятыфундыі памешчыкаў, душыўшых сялянскую масу, і вырасшая вясковая буржуазія і кулацтва, скрыва паглядаўшая на пана, бо само яно карыстае з працы батрака і прэтэндуе на землі памешчыка і на эксплёатацыю пролетарызаванага сялянства. У той-жа час кулацтва

[1] Зборнік твораў „Беларусь". Менск, 1924, стар. 101.
[2] Там-жа.

цягнецца за пануючай сілай, да сіл рэакцыі, ад якой яна ўжо атрымала крошкі ў выглядзе сталыпінскіх законаў — права на рабаваньне грамады і вёскі. Думаецца, мы паказалі тое бязьлітаснае клясавае змаганьне, якое кіпела між нацдэмаўскім „земляробам“ і сялянскай эксплёатаванай масай. Дарэчы сказаць, што ў годы контррэволюцыі газэта „Наша Ніва“ і яе кіраўнікі расьпіналіся за хутары, пропагандуючы іх амаль у кожным нумары газэты. Яны віталі па сутнасьці шыбельніка Сталыпіна з яго політыкай на вёсцы і гэтым самым выкрывалі свой клясавы твар — ідэолёгаў вясковай буржуазіі.

Тав. Поташ даў правільную характарыстыку „Нашай Ніве“: „Нашаніўцы, замыкаючыся *ў межах сваёй званіцы, праяўляючы вузкі провінцыялізм і нацыяналістычнае* адасабленьне, пад выглядам асобных умоў Беларусі (якія, бязумоўна, пры аналізе аграрнага ладу Беларусі і ў прыватнасьці сталыпіншчыны на Беларусі павінны быць прыняты пад увагу) *адыходзяць ад галоўнага і рашаючага—рэволюцыйнага вырашэньня супярэчнасьцяў* у краіне, якое адно толькі можа прывесьці да найбольш передавога яго разьвіцьця і найбольш спрыючага з пункту гледжаньня пролетарыяту і сялянства вырашэньня насьпеўшых соцыяльна-экономічных супярэчнасьцяў. У канчатковым выніку яны самі становяцца *прыхільнікамі сталыпіншчыны і абаронцамі яго аграрнага законадаўства*“ [1]. (Курсыў Поташа).

Слова „земляроб“ для нацдэмаў — гэта толькі прыкрыцьцё вырасшага і ставіўшага свае патрабаваньні вясковага кулака, а „Наша Ніва“ ашуквала масы. Адказ шырокіх эксплёатаваных мас быў абсолютна ясны—ён хаваўся ў тых клясавых бойках, якія мы апісалі вышэй. Нарастала ўжо новая рэволюцыя, першыя грымоты аграрнай рэволюцыі ўжо раздаваліся і толькі ідэолёгі кулацтва не хацелі заўважаць гэтага. Яны ня бачаць тых боек, якія кіпелі ў кожным беларускім сяле, у кожнай беларускай вёсцы; апалёгеты і ідэолёгі вясковай буржуазіі бачылі і асабліва падкрэсьлівалі прагнасьць сялянства да зямлі і гэты бок яны адзначалі, а гэта і ёсьць у першую чаргу жаданьні вясковай буржуазіі і кулацтва супроць памешчыкаў. Змаганьня-ж экслёатаванай сялянскай масы не заўважаюць, бо ім нявыгодна бачыць і выкрываць змаганьне вясковай беднаты і асабліва беларускага батрацтва з буржуазіяй і нават забуржуазіўшымся памешчыкам. „Тэорыяй самабытнасьці“ нацдэмы імкнуліся адхіліць марксысцкі аналіз, зьняважыць яго. Гэтай „тэорыяй“ імкнуліся застрахаваць сябе ад законаў клясавага змаганьня, аб іх непрыстасавальнасьці да беларускай дарэволюцыйнай, дый пасьлярэволюцыйнай рачаіснасьці.

Як можна назваць усе гэтыя ўстаноўкі, „тэорыі“, што разьвіваліся нацдэмамі ў часе дыктатуры пролетарыяту ў пэрыод соцыялістычнага будаўніцтва, як не політычным шарлатанствам, як не простытуяваньнем навукі. У апошні час усе гэтыя тэорыі ўжо досыць выкрыты, раскрытыкаваны, і сапраўдны твар нацдэмаў, як рэстаўратараў капіталізму, паказаны. Увесь паданы ў літаратуры матар'ял з яскравасьцю сьведчыць, што нацдэмы ўсімі мерамі імкнуліся падкрэсьліць, нібы законы руху грамадзтва, адкрытыя Марксам-Леніным, непрыстасавальны да беларускае грамады, што апошняе разьвівалася паводле нацдэмаўскіх, высасаных з пальца „тэорый“. Гэта ўсё належным чынам абвергнута і яшчэ раз паказана, што якраз толькі на падставе матар'ялістычнай дыялектыкі можна выявіць асаблівасьці і „зігзагі“ беларускага гістарычнага процэсу ў конкрэтнай формацыі, як і кожнага

[1] Поташ М. Бальшавізм і дроб. бурж. партыі, стар. 59.

іншага грамадзтва. Ясна, што рэстаўратары капіталізму, яго ідэолёгі і апалёгеты польскага фашызму скажалі гістарычную рэчаіснасьць у сваіх палітычных мэтах. Яны закрывалі вочы на расслаеньне сялянства, на рост пралетарыяту, на тое, што капіталізм размываў сялянства, выдзяляў з яго вясковую буржуазію, а галоўную масу скідаў у рады беднаты, што вырас сельска-гаспадарчы пралетарыят. Ясна, што нацдэмы самі зьбіраліся карміцца потам і крывёю працоўных мас, а адсюль усе іх устаноўкі і „канцэпцыі“.

Яшчэ раз трэба падкрэсьліць, што асноўныя супярэчнасьці ў эканоміцы Беларусі ў разгляданыя часы ішлі і выліваліся ў сельскай гаспадарцы ў форме змаганьня двох шляхоў аграрнага капіталізму. Трэба было зьнішчыць памешчыка-фэўдала, каб разьвязаць далейшае грамадзкае разьвіцьцё, каб разьвязаць клясавую барацьбу на вёсцы. І адным з галоўных пытаньняў, як гэта ня раз падкрэсьліваў Ленін, было не нацыянальнае, але аграрнае пытаньне, якое зрабілася „нацыянальным“ пытаньнем усяго разьвіцьця былой Расіі. Якраз у аграрным пытаньні былі заключаны вялізныя супярэчнасьці грамадзкага разьвіцьця ў годы контррэволюцыі. І калі ў годы соцыялістычнага будаўніцтва нацдэмы зноў высунулі на першы плян нацыянальнае пытаньне, а ня пытаньне клясавага змаганьня, то гэтым самым яны паказалі свой сапраўдны твар ворагаў рэволюцыі. Паданыя факты клясавага змаганьня сьведчаць, што пасьля ленскіх расстрэлаў, якія рэхам пракаціліся па ўсёй былой Расіі, зноў пачала складацца непасрэдная рэволюцыйная сытуацыя, і імпэрыялістычная вайна вельмі і вельмі наблізіла рэволюцыю.

Аграрны рух сялянства да рэволюцыі 1917 году, як і разьвіцьцё сельскай гаспадаркі і прамысловасьці на Беларусі, а таксама і ў былой Расіі, немагчыма зразумець бяз ленінскага вучэньня аб двох шляхох разьвіцьця аграрнага капіталізму і аб клясавай барацьбе на гэтай аснове. Гэта адна з цэнтральных проблем усяго „нацыянальнага“ разьвіцьця былой Расіі, у гэтым пункце як у фокусе пераламляюцца ўсе ніткі грамадзкага процэсу і барацьбы кляс. Мы можам сказаць, што ня толькі XX стагодзьдзе, адрэзак часу да Кастрычнікавай рэволюцыі, але і ўся эпоха з 1861 па 1917 год ёсьць эпоха, калі адзначаныя дзьве тэндэнцыі расьлі, крэпнулі і выяўлялі сябе ў масавым руху ў клясавай барацьбе розных кляс на працягу паказанага пэрыоду і гэта асабліва выявілася ў рэволюцыю 1905 году. На Беларусі гэтая проблема двох шляхоў ускладняецца яшчэ нацыянальным уціскам і колёніяльным становішчам Беларусі, што скідваць з гістарычнай вагі абсолютна нельга. Трэба падкрэсьліць, што проблема двох шляхоў — гэта проблема клясавае барацьбы, і толькі пад гэтым кутом погляду магчыма зразумець увесь гістарычны процэс вызначанай эпохі. Думаць, як гэта рабілі буржуазныя вучоныя яшчэ старой Расіі ці як уяўлялі сабе нацыянал-дэмократы, што ўся справа палепшаньня сялянскага становішча заключалася ў дадатковай нарэзцы сялянству зямлі ці ў лепшай пабудове іх быту, глыбака няправільна, гэта выкрывае іх апалёгіку растучай буржуазіі. Гэта вельмі добра падкрэсьлена Леніным:

„Нашы лібэралы заўсёды разглядаюць „сялянскае пытаньне“ з пункту погляду „малазямельля“ сялян ці канечнай патрэбы „Дзяржаўнага ўпарадкаваньня“ іх быту... Такі пункт погляду ў корані няправільны. Справа ідзе аб клясавай барацьбе на грунце прыгоньніцкіх адносін гаспадаркі, толькі ўсяго. Пры захаваньні цяперашняга земляўладаньня памешчыкаў *няўхільна* захаваньне кабалы, прыгоньніцтва

і, паводле „Русской Мысли“, нявольніцтва. Ніякія „рэформы“ і ніякія палітычныя зьмены тут не дапамогуць. Тут гутарка ідзе аб земляўладаньні клясы, якая ператварае кожны „прогрэс“ у чарапашы, якая ператварае масу сялян у прыдушаных і прывязаных да „пана жабракоў“ [1]. (Падкрэсьлена Леніным).

Такім чынам, тут Ленін падкрэсьлівае ўсё тую-ж думку, што адным з асноўных пытаньняў грамадзкага разьвіцьця гэтых гадоў было ў Расіі аграрнае пытаньне, ці, як ён піша ў другім месцы, „сялянскае“. І справа тут была не ў нарэзцы, а ў барацьбе кляс за гэтае разьвіцьцё. Рэволюцыя 1905 году была спробай пролетарыяту, які быў гегемонам рэволюцыі, і сялянскіх мас вырашыць гэтае пытаньне ў адкрытай барацьбе з памешчыкамі, зрабіць „чыстку“ земляўладаньня на карысьць сялянства і за кошт памешчыцкае клясы. Але рэволюцыя аказалася часова пераможанай, і пэрыод 1905—14 гг. ёсьць эпоха, калі памешчыкі разам з буржуазіяй імкнуліся накіраваць аграрнае разьвіцьцё на ўсталяваньне „прускага шляху“. Трэба адзначыць, што буржуазія, напалоханая рэволюцыяй 1905 году, блёкавалася з царызмам і ўсімі мерамі імкнулася па сутнасьці падтрымаць сталыпінскае аграрнае законадаўства. І ўрад тых-жа чорнасоценьнікаў думаў захаваць памешчыка, вырашыць пытаньне на карысьць Пурышкевічаў і К⁰. Царызм імкнуўся знайсьці сабе саюзьніка на вёсцы, які падтрымаў-бы яго ў яго змаганьні з рэволюцыяй, і такога знайшоў у вырасшай сельска-гаспадарчай буржуазіі і кулацтве. Ленін падкрэсьлівае:

„Дзе-ж мог шукаць сабе саюзьнікаў савет аб'яднанага дваранства? Толькі сярод маленькай меншасьці заможнага сялянства, „кулакоў і міраедаў“. На вёсцы іншых саюзьнікаў яму знайсьці было немагчыма. І вось для прыцягненьня на свой бок „новых памешчыкаў“ рэакцыянэры ня спыніліся перад тым, каб *усю вёску* аддаць ім літаральна на паток і рабаваньне“ [2]. (Падкрэсьлена Леніным).

Чорнасоценныя памешчыкі і царызм усюды шукалі гэтай апоры, бо экономічны процэс сам выкідаў памешчыкаў з сельскай гаспадаркі, выбіваў экономічную аснову іх палітычнай улады. Расія ўвайшла ў стадыю імпэрыялізму, і гэты імпэрыялізм, паводле характарыстыкі Леніна—ваенна-фэўдальны—выціскаў сокі з сотні народаў, насяляўшых Расію. Беларусь, як колёнія рускага імпэрыялізму, у гэты час перажывае, яшчэ мо' больш узмоцнена, гэты самы процэс, і тут кулацтва было больш актыўна, бо клясавыя супярэчнасьці на Беларусі вельмі і вельмі абвастрыліся. Кулацтва, бязумоўна, цягнецца за пануючай палітычнай сілай, яно, як клясавая групоўка, імкнецца ўключыцца ў агульнаімпэрыялістычны фронт, недарма-ж кулацтву былі кінуты крошкі з стала пануючых кляс. Але гэта, бязумоўна, ня значыць, што мы мелі перараджэньне царызму. Калі царызм траціў сваю глебу, рэшткі фэўдалізму, на якіх ён трымаўся, то годы контррэволюцыі былі спробай дапасавацца да абставін, якія зьмяніліся, і задача была перавесьці разьвіцьцё аграрнага капіталізму на „нямецкія рэйкі“. Гэта, бязумоўна, рабілася за кошт шырокіх сялянскіх мас, якія былі адданы на простае разграбленьне групцы кулакоў:

„Контррэволюцыя 1905—1911 гг. спарадзіла новы этап гісторыі Расіі, старое самаўладзтва пасунулася яшчэ на адзін крок у кірунку да буржуазнай монархіі. Узьнікла Дума памешчыкаў і буйнай буржуазіі. Царызм не пазбыўся яшчэ прыгоньніцкага характару і ён пра-

[1] Ленін У. І., т. XVII, стар. 338.
[2] Ленін У. І., т. XVI, стар. 11.

водзіў буржуазную аграрную політыку, мэтай якой было насадзіць якмага хутчэй прыватную зямельную ўласнасьць нячуваным разорам і зьнішчэньнем мільёнаў сялян“ [1].

Сталыпіншчына была спробай царызму накіраваць разьвіцьцё капіталізму ў сельскай гаспадарцы на вельмі паступовы, павольны шлях, каб гэтым захаваць у сваіх руках уладу і вырашыць аграрнае пытаньне на карысьць памешчыкаў. Але годы контррэволюцыі былі гадамі канчатковага распаду і гніеньня царызму. Так, Ленін, характарызуючы гэту эпоху, пісаў:

